Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны
музей-запаведнік

# матэрыялы
## навукова-практычнай канферэнцыі

(па выніках навукова-даследчай работы ў 2004 г.)



полацк 2005

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПОЛАЦКІ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК

# матэрыялы

## навукова-практычнай канферэнцыі

(па выніках навукова-даследчай работы ў 2004 г.)

**Полацк 2005**

ББК 63.3(4Беи)
М35

**Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнай рады НПГКМЗ**

**Адказны за выпуск:** ***М.М. Ільніцкі***
дырэктар НПГКМЗ

**Складальнік:** ***Т.А. Джумантаева***
намеснік дырэктара па навуковай рабоце

М35 **Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі** (па выніках навукова-даследчай работы ў 2004г.).–Полацк: НПГКМЗ, 2004. — 164 с.: іл.

**ББК 63.3(4Беи)+79.1(4Беи)**

Набор і макет выкананы на выдавецкім комплексе
Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка
**Камп'ютарнае макетаванне:** ***В.У. Гаўрылаў***

© Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, 2005

# Ад складальніка

Дванаццаты па ліку зборнік, выдадзены запаведнікам, утрымлівае частку матэрыялаў, падрыхтаваных навуковымі супрацоўнікамі да справаздачнай навукова-практычнай канферэнцыі, якая прайшла ў лютым 2005 г.

Друкуюцца даклады, якія падчас справаздачы мелі сваё лагічнае завяршэнне:

- Планіровачная структура Полацка XIX-XX стст. Фарміраванне планіровачнай сеткі. (Т. Арлова)
- Археалагічныя даследаванні помнікаў архітэктуры Полацка. Дом № 15 па вул. Талстога (па выніках археалагічнага нагляду). (А. Салаўёў)
- Полацк у к. XIX – п.XX гг. Станаўленне сістэмы адкрытай жаночай адукацыі:ад пансіёнаў да гімназіі. (В. Краско)
- Установы культуры Полацка на пачатку 1920-х гг. (Н. Сяргеенка)
- Развіццё фізіятрычнай дапамогі на Полаччыне ў 1920-х гг. (А. Козел)
- Жаночы касцюм Паазер'я канца XIX – пачатку XX стст. Канструктыўна-тэхналагічныя асаблівасці жаночага адзення Расонска-Верхнядзвінскага крою. (Н. Філатава)
- Жаночае адзенне ў звычаях і абрадах беларусаў Паазер'я. (В. Дамаскіна)
- Лён і вырабы з лёну ў знахарскіх практыках беларусаў Падзвіння. (У. Лобач)
- Асаблівасці ўспрымання экспазіцыі Дзіцячага музея дзецьмі рознага ўзросту і ўзроўню інтэлектуальнага развіцця. (Т. Смірнова)
- Палачане – удзельнікі Берлінскай аперацыі. (С. Палякоў)
- Навуковая канцэпцыя раздзела экспазіцыі Мастацкай галерэі «Гісторыя Полацкага езуіцкага калегіума». (Т. Явіч)
- Кірылічныя выданні друкарняў старавераў XVIII – пачатку XIX стст. (А. Шумовіч)

- Польскамоўныя часопісы «Край», «Вэндровец», «Земя» ў фондах запаведніка. (Г. Зуева)
- Калекцыя газет 1918-1940 гг. у фондах НПГКМЗ. (І. Воднева)

У зборнік па прычыне практычнай накіраванасці матэрыялаў не былі ўключаны наступныя даклады, з якімі выступілі навукоўцы:

- Дыдактычныя гульні як сродак развіцця пазнавальна-практычнай дзейнасці дзяцей (на экспазіцыі Дзіцячага музея) (Т. Касатая)
- Распрацоўка тэзаўрусаў па музеялогіі (калекцыя скульптуры) ў рамках праграмы «Культура». (Л. Ластачкіна)

Былі выдадзены два каталогі:

- Каталог натуральна-гістарычных крыніц. Млекакормячыя. (Н. Бяспрозванная)
- Каталог меднага ліцця. (В. Даўгун)

Асобна будуць надрукаваны навуковыя каталогі калекцый, праца над якімі працягваецца:

- Каталог калекцыі Алеся Матусевіча ў фондах запаведніка. (І. Песіна)
- Каталог калекцыі манет Рэчы Паспалітай у фондах запаведніка. (А. Галюк)
- Каталог паддужных званоў у фондах запаведніка. (А. Ушакова)
- Каталог калекцыі керамічных цацак з археалагічнага збору запаведніка. (Н. Лугіна)
- Выданні Віленскай акадэмічнай друкарні ў фондах запаведніка. (І. Шупенька)
- Беларускія выданні 1918-1941 гг. у фондах запаведніка (В. Ашуева)
- Беларускія часопісы 1956-1959 гг. (В. Шульчанка)

Акрамя таго, навуковыя супрацоўнікі запаведніка прымалі ўдзел у рабоце канферэнцый, дзе выступілі з наступнымі дакладамі:

- IX Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні ў Мінску (І.А. Шупенька «Кніга ў сістэме музейна-педагагічных заняткаў»)
- Міжнародная навуковая канферэнцыя «Да вытокаў», прысвечаная юбілею Кіева-Магілянскай акадэміі (А.У. Шумовіч «Адлюстраванне жыцця і дзейнасці Сімяона Полацкага ў экспазіцыі Музея-бібліятэкі»)
- Міжнародная навуковая канферэнцыя «Человек, культура и общество в контексте глобализации» у Маскве (Т.А. Джумантаева «Музейные традиции Полоцка и перспективы развития заповедника»)

У дадзеным зборніку ў якасці дадатка, які стаў ужо традыцыйным, змешчаны гіпатэтычны, але вельмі цікавы і, безумоўна, эксклюзіўны матэрыял вядомага архітэктара і рэстаўратара Вадзіма Глінніка аб, магчыма, першай фрэскавай выяве Сафійскага сабора і полацкіх падзей 1563 г. на сценах Бернардынскага касцёла Св. Св. Францішка і Бернардына ў Вільні.

# Народнае адзенне ў звычаях і абрадах беларусаў
## (сямейная абрадавасць)

***В.Ф. Дамаскіна***

Адзенне чалавека – гэта своеасаблівы «пашпарт», што паказвае на палавую, класавую, сацыяльную прыналежнасць. Нідзе, як у адзенні, так трывала і так наглядна не зліліся ў адно цэлае два чалавечыя пачаткі: духоўны і матэрыяльны. Адзенне ў народзе да цяперашняга часу называюць «абалонкай». Аднак адносіны да адзення былі заўсёды нейкія зняважлівыя, яго называлі «рыззё», «лахманы». Але гэта маскіравала, было знешняй абалонкай сур'ёзнай і вечнай турботы аб тым, у што апрануцца, як абараніць сябе ад холаду і дажджу, не вылучацца фарсістасцю ці ўбоствам, што аднолькава лічылася агідным.

Сямейныя звычаі і абрады ўмацоўвалі і аб'ядноўвалі сям'ю, служылі механізмам для перадачы этнічных традыцый, маральна-этнічных норм ад старэйшых да малодшых.

Выкананне пэўных абрадаў фарміравала пэўную грамадскую думку аб сям'і, станоўча ўплывала на лёс дзіцяці ці маладой сямейнай пары, забяспечвала дабрабыт, багацце сям'і, здароўе ўсім яе насельнікам.

Радзінныя звычаі падзяляліся на некалькі этапаў: дародавы, родавы, і пасляродавы. Цяжарнай жанчыне забаранялася расказваць пра час родаў: лічалася, чым менш людзей будзе ведаць аб ім, тым менш жанчына будзе пакутаваць. На працягу цяжарнасці жанчына павінна была насіць чырвоны пояс, каб пазбегнуць сурокаў.

Абрады падчас родаў ў асноўным былі накіраваны на палягчэнне стану жанчыны. Развязванне вузлоў ў адзенні – адно з распаўсюджанных сродкаў паскорыць роды. Жанчыне распускалі валасы, расшпільвалі каўнер кашулі.У выпадку цяжкіх родаў бабка-павітуха развязвала на сабе фартух і вешала яго на плечы парадзіхе. Вялікае значэнне надавалася поясу. Імкнуліся дастаць пояс святара, якім ён апаясваўся падчас богаслужэння, ім апаясвалі парадзіху, альбо клалі ёй на жывот.

Гэтыя дзеянні быццам садзейнічалі знішчэнню перашкод да выхаду дзіцяці.

Дзіця павітуха ніколі не прымала голымі рукамі, а замотвала іх якім-небудзь старым адзеннем, каб пасля дзіця жыло ў багацці. На Віцебшчыне, калі нараджалася дзяўчына павітуха загортвала яе ў мужчынскія споднія нагавіцы і абавязкова бацькоўскія, каб яе ў будучым любілі хлопцы, а хлопчыка – у кашулю маці, каб яго любілі дзяўчаты.

Пасля першага купання дзіця загортвалі ў што – небудзь старое, звычайна ў бацькоўскую кашулю, бо ў беларусаў не прынята было загадзя рыхтаваць адзенне для дзіцяці – інакш яно хутка памрэ.

Такім чынам, адзенне мужа і бацькі мела вялікае значэнне пры родах і для нованароджаннага, аказваючы дабрачыннае уздзеянне, мела ахоўную сімволіку.

Звычайна немаўля не апранялі ў кашулю да хрышчэння, а трымалі ў пялёнках, для якіх выкарыстоўвалі старое адзенне дарослых, каб дзіця ў спадчыну атрымала станоўчыя якасці сваіх родных.

«Адзеннем» немаўляці былі пялёнка і спавівач – паясок, якім спавівалі да аднаго года. Першая кашуля дзіцяці была простага крою – кавалак палатна або каленкору, перагнуты папалам з прарэзанай пасярэдзіне дзіркай для галавы. Да хрышчэння дзіцяткі падрыхтоўвалі новую кашулю, пялёнку, спавівач, хустку і крыжык. Згодна з павер’ем, дзяўчынку перад адпраўленнем у царкву ці касцёл, загортвалі ў мужчынскую сарочку (калі ў сям’і былі толькі дзяўчаткі, а бацькі хацелі, каб наступны нарадзіўся хлопчык.

У Віцебскай губерні пасля хрышчэння кума надзявала на дзіця кашульку, спавівала ў пялёнкі і абвязвала поясам.

Да 6-8 гадоў і хлопцы, і дзяўчаты насілі адны кашулі з поясам. Хлопчыкі завязвалі пояс толькі высока пад грудзямі, а дзяўчаты – на таліі. Пасля хлопцу апраналі штаны, а дзяўчыне – спадніцу. У Віцебскай губерні гэта рабілі на старых бацькоўскіх штанах, альбо мацярынскай спадніцы. І чым больш дзеці праяўляюць упартасць, не жадаючы апранацца, тым, як лічылася, яны даўжэй будуць жыць на свеце. Зношаныя першыя штаны і спадніцы не аддавалі на анучы, а спальвалі ў печы.

Вяселле – гэта цыкл абрадаў, што паслядоўна ішлі адзін за другім. Іх колькасць залежала ад дабрабыту сем'яў, якія ігралі вяселле, і ад захаванасці абрадаў. Матэрыяльную аснову вяселля складаў пасаг нявесты і розныя падарункі маладым і сваякам.

Пасаг нявесты складаўся з бялізны, сукенак, посцілак, абрусаў, ручнікоў, дываноў, розных прадметаў адзення, як мужчынскага так і жаночага. Усё гэта дзяўчыны пачыналі рыхтаваць з самага маленства. Ад памеру пасагу залежала становішча маладой у новай сям'і. Колькасць і вартасць адзення залежала ад дабрабыту сям'і, але вялікую ролю іграла працаздольнасць і майстэрства нявесты і яе маці. Пасаг быў абавязковай умовай вяселля, але не ва ўсе часы і не ва ўсіх рэгіёнах. Напрыклад, у Віцебскім павеце нявеста, акрамя сукенкі, ніякага пасагу не прыносіла. Яна павінна была быць перш за ўсё добрай працаўніцай і здаровай.

Пасаг нявесты ў дом жаніха адводзілі па спецыяльнаму абраду: на першым возе ехаў малады з музыкам, на другім сваты, а на трэцім сядзела маладая на куфры, пакрытым кажухом. Увесь гэты картэж суправаджаўся музыкай .Калым за нявесту таксама складаўся з адзення, грошай і абутку. Аднак на Беларусі ўжо на пачатку XIX стагоддзя гэты звычай выйшаў з ужытку.

Падарункі нявеста пачынала дарыць з самага пачатку сватаўства. Маладога нявеста адорвала кашуляй, штанамі, поясам ці кушаком, якія яна рабіла сама. У глыбокай старажытнасці пояс часта служыў знакам, які ўвасабляў тое або іншае ўяўленне аб навакольным свеце, узаемаадносінах з ім чалавека. Павязванне пояса ў пераносным сэнсе азначала гатоўнасць да дзеяння і здольнасць гэта дзеянне ажыццявіць. Нашэнне пояса звязвалася з маральным абліччам чалавека. Адсутнасць пояса ў касцюме заўсёды ўказвала на тое, або іншае парушэнне агульнапрынятых норм паводзін. Знакавасць пояса дасягае найвышэйшай напружанасці ў абрадах, звычаях, рытуалах, дзе пояс набывае новыя, пераважна сімвалічныя функцыі. Яны – вынік парушэння гармоніі, звычайных сувязей пояса, які адрываецца ад касцюма з тым, каб ператварыцца ў самастойную знакава-рэлігійную адзінку.

Падчас сватаўства, на падлозе, перад нявестай клалі пояс у выглядзе кола, калі дзяўчына была згодна – яна заскоквала ў гэтае кола. Сваты прыяджалі тройчы, і кожны раз прывозілі пляшку з гарэлкай, а маці нявесты вяртала яе пустой і перавязанай поясам. У падарунак сваты таксама атрымлівалі паясы.

Жаночая кашуля была асноўным падарункам для свякрыві. Хросным бацькам будучага мужа нявеста таксама дарыла кашулі ці адрэз тканіны. Нявеста назапашвала вялікую колькасць ручнікоў, паясоў, хустак, якімі «разлічвалася» з дружкамі, музыкамі, каравайшчыцамі і свякроўю. З 12 гадоў нявеста рыхтавла льняныя ці ваўняныя паясы, якія раздавала на вяселлі да сотні і больш.

З боку нявесты пояс быў абавязковым падарункам на розных этапах вяселля. Поясам «адкупаліся», калі вясельны поезд сустракаў на сваім шляху перашкоды. Калі вясельны поезд ехаў праз млын і млынар спыняў ваду, нявеста кідала яму паясок, каб той зноў пусціў ваду.

Перад тым, як ехаць да вянца ў царкву, нявеста развешвала паясы ў тых месцах, альбо над тымі прадметамі, ад якіх чакала дабрабыту. Уваходзячы пасля вянчання ў хату жаніха, нявеста кідала паясок на печ. Жадаючы дастатку хлеба – вешала пояс ў гумне, скаціны – ў хляве, маёмасці – над куфрам. Нявеста старалася задобрыць духаў новага месца жыхарства: кідала поясок у вядро з вадой (калі ўпершыню ішла да крыніцы).

Дарэнне паясоў мела абрадава-магічнае значэнне, сімвалізавала багацце, было сімвалам зблíжэння з Родам маладога.

На аснове пояса ўзніклі такія сімвалы, як вяночак і пярсцёнак – сімвалы ахоўнай магіі з яе выразным салярным знакам-кругам.

Такім чынам, падарункі нявесты мелі не толькі матэрыяльную, практычную і паказальную вартасць, але адыгрывалі і сімвалічную ролю.

Падарункі жаніха складаліся з верхняй вопраткі, абутку і ўпрыгожванняў. Асаблівым падарункам у Віцебскім павеце была шуба. Калі жаніх ішоў у сваты, ён нёс нявесце чаравікі, якія передаваў ёй праз стол. Гэтыя чаравікі яна абувала, калі

ехала да вянца. Лічылася, калі нявеста спачатку абувае правы чаравік, то яна будзе «хінуцца» да чужых людзей, а не да мужа.

Абутак як падарунак меў не толькі практычнае значэнне, але і з'яўляўся сімвалам прыхільнасці будучай жонкі да дому.

Адзенне нявесты рэзка адрознівалася ў давясельны і паслявясельны перыяд. Гэта звязвалася з дзяленнем вяселля на першую – сумную частку і другую – вясёлую, святочную. Нягледзячы на вялікую колькасць публікацый па вясельнаму абраду, гэтыя асаблівасці адзення нявесты не акрэсліваюцца, што можа навесці на думкі аб іх адсутнасці. Аднак сцвярджаць гэта пакуль цяжка, таму што некаторыя сведчанні гэтага ёсць. Напрыклад, у Віцебскім павеце нявеста да вянца апранала сукенку «какое угодно, но не лучшее». Ахоўныя дзеянні, звязаныя з адзеннем жаніха і нявесты, былі важным элементам іх апранання. Да іх адносяцца:

**1.** Частае пераапрананне маладых на працягу вяселля.

**2.** Апрананне адзення на вонкавы бок, каб зберагчыся ад сурокаў.

**3.** Адзяванне некалькіх элементаў адзення.

**4.** Адзяванне верхняга футранога адзення незалежна ад стану надвор'я.

**5.** Выкарыстоўванне на вяселлі захаваўшагася традыцыйнага касцюма.

Вялікая ўвага надавалася і амулетам, якія таксама выконвалі засцерагальную функцыю. Аднак, разам з тым, зафіксаваны і такія звычаі, паводле якіх маладая падчас вянчання распускала завязкі спадніцы, фартуха, панчох.

Калі пачыналі дзяліць каравай і адорваць маладых, то першай падыходзіла маці і дарыла чырвоны андарак. А маці мужа павязвала нявестцы фартух, аснову кампазіцыі якога складае рытмізаваная, паслядоўная чаргаванне пяці чырвоных і белых палосак. Гэтая пяціўзроўневая структура фартушка, далёка не выпадковая. Яна адлюстроўвала самы актуальны, мінімальна дапушчальны ланцужок жывой радаводнай сувязі – радавод да пятага калена. Фартушок сімвалізаваў радаводную эстафету; прычым верхняя частка і пояс, на якім трымаўся

атрыбут жаночай долі, былі чырвонымі, гэта значыць жывот жанчыны – улонне новага жыцця – быў закрыты жыццёвым – жыццепрадуцыравальным – фрагментам ручніка. Яго сілу узмацняў яшчэ адзін выключна моцны абярог – чырвоны пояс. На другі дзень вяселля нявеста пераапраналася ў іншае адзенне, у якім асноўную знакавую функцыю выконваў сімволікаарнаментальны «тэкст» чырвонага колеру.

Абрады, якія праводзіліся ў гэты перыяд, уводзілі маладую ў абавязкі замужняй жанчыны.

Галаўны убор як частка касцюма найбольш яскрава адлюстроўваў узроставыя і сацыяльныя змены ў жыцці дзяўчыны.

З дзесяці гадоў дзяўчыны насілі «вянок», але сапраўдны «вянок», як пісаў Нікіфароўскі, адзяваўся дзяўчынкай па дасягненні ёю шлюбнага ўзросту.

Дзявоцкі вянок адрозніваўся ад жаночага тым, што не поўнасцю закрываў валасы і ўпрыгожваўся папаровымі кветкамі і доўгімі стужкамі.

Існавала некалькі разнавіднасцяў галаўнога шлюбнага ўбору. У паўднёвых раёнах вянок рыхтавала сваціца. У абручык вянка яна зашывала заручальны пярсцёнак нявесты, потым зверху і знізу абшывала яго кветкамі. Абавязковай дэталлю вяночка была ружа – сімвал дзявоцкай цнатлівасці і чалавечай годнасці. На Віцебшчыне вянок рабіла баярка з дапамогай сяброўак. Спачатку з папяровых кветак сплятылі венчык, да якога мацавалі дзве часткі фаты, зробленай з лёгкай рэдзенькай тканіны белага колеру. Адна частка фаты прыкрывала доўгую касу, другая – вочы, а яшчэ адна збіралася пелярынкай і, як рушачкі клалася праз лоб на абедзве скроні. Паверх пелярынкі надзявалі прыгожы высокі вяночак у выглядзе дзвюх вінаградных гронак, якія шчыльна аблягалі галаву ад скроняў да падбародка. Па форме і расквечанасці вяночка можна было меркаваць аб статусе нявесты. Калі, напрыклад, яна была сіратой, то ў яго ўплялі зялёны лісточак.

Адным з кульмінацыйных момантаў вяселля было павязванне нявестцы свякроўю наміткі. Збіранне валасоў пад галаўны ўбор – асноўнае адрозненне замужняй жанчыны ад дзяўчыны. Лічылася, што адкрытыя валасы жанчыны быццам

прыносяць няшчасце. Гэтыя дзеянні сімвалізавалі ператварэнне дзяўчыны ў жанчыну і яе падпарадкаванне мужу.

Абрады з абуткам падзяляліся на дзве групы: абрады з новым абуткам і старым. Да першай групы адносяцца падарункі жаніха. З даўніх часоў і ва ўсіх усходніх славян захаваўся звычай здымаць боты з мужа маладой. Спачатку маладая здымала правы бот, дзе знаходзіла грошы і забірала сабе, а здымаючы левы – знаходзіла бізун. Гэты абрад сімвалізаваў пераход маладой ва ўладу мужа. Абрад, звязаны са старым абуткам, меў іншы сэнс: пажаданне добрай дарогі і дабрабыту.

Адзенне будучых удзельнікаў вяселля з першых этапаў рытуала мела некаторыя асаблівасці. Сваха, ідучы першы раз да нявесты, святочна апраналася, падпаясвалася чырвоным кушаком. Сват апаясваўся саламяным паяском. Калі сватаўство ўдавалася, сват вяртаўся да жаніха, апаясваў яго тым жа саламяным паяском, а калі не – разрываў яго і кідаў.

Пасля сватаўства адзенне ўдзельнікаў вяселля адлюстроўвала новае становішча. Сваты адрозніваліся ад астатніх тым, што праз плячо ў іх быў перакінуты ручнік ці кавалак белай тканіны, адзін канец прымацоўваўся да пояса, а другі засоўваўся ў кішэню.

Акрамя таго, дружкі ўпрыгожвалі шапкі кветкамі, а дзяўчаты ўпрыгожваліся вянкамі з руты.

Такім чынам, адзенне падчас вясельнага абраду мела не толькі практычнае, але сімвалічнае, ахоўнае значэнне.

Пахавальны абрад падзяляўся на тры этапы: падрыхтоўка нябожчыка да пахавання, пахаванне і памінкі. Гэтыя абрады адлюстроўвалі погляды сялян на замагільны свет, у якім язычніцкія ўяўленні не былі поўнасцю выцеснены хрысціянствам, а зліліся з ім.

Лічылася, што памерлыя мелі вялікую ўладу над жывымі і маглі быць добрай ці злой сілай для сям'і. Таму і пахавальныя абрады былі скіраваныя на тое, каб задобрыць памерлых, і разам з тым адмежаваць сябе ад смяротнай сілы.

Адзенне мела пэўную функцыянальную накіраванасць у пахавальных і памінальных абрадах і адрознівалася характарам крою, матэрыялам, колерам, спосабам вырабу.

Адной з асаблівасцяў быў звычай хаваць у адзенні, у якім чалавек вянчаўся. Пахавальнае адзенне шылася і спецыяльна «на смерць». Звычайна ў такім адзенні заставаліся не дашытымі некаторыя дэталі, якія потым дашываліся ўжо пасля смерці. Хавалі чалавека і ў той кашулі, у якой ён памёр, альбо клалі яе ў труну, а апраналі новую.

Асаблівым быў і спосаб крою: не выкарыстоўвалі нажніцы, а рвалі палатно і шылі на руках. Нярэдка жанчыны ткалі сабе саван, уплятаючы ў тканіну ўласныя валасы. Гэта было звязана з ўяўленнем пра тое, што з дапамогай валасоў можна было навесці не толькі чары, але яны былі і абярогам для чалавека.

Абавязковым у адзенні памерлых быў пояс. Ім завязывалі рукі нябожчыку пасля смерці і развязвалі перад апусканнем у магілу. Апаясвалі самога нябожчыка, а нярэдка і труну. Нават дзіця хавалі ў падпаясанай кашулі. Гэта рабілася для таго, каб пры ўваскрашэнні нябожчык быў падпаясаны. Да поясу прывешавалі торбачку, у якую клалі грабенчык і хустку, ўсе што магло, спатрэбіцца нябожчыку ў «далёкай дарозе», і за што ён будзе ўдзячны сваім родным.

Каб лягчэй чалавек мог адысці ў іншы свет, яму на вопратцы расшпільвалі ўсе гузікі, развязвалі ўсе вузлы – што павінна было аблегчыць і скараціць пакуты.

Калі паміраў муж і пакідаў жонку, ці жонка – мужа, то ў нябожчыка расшпільвалі каўнер кашулі, каб таму, хто застаўся, вальней было выходзіць замуж ці жаніцца.

Дзяўчат – нябожчыц звычайна апраналі ў шлюбную сукенку і вэлюм. Лічылася што, яна на тым свеце можа выйсці замуж. Калі развіталіся з дзяўчынай, то раздорвалі колькі паясоў, нібыта здзясняючы яе вяселле.

У пахавальным адзенні пераважаў белы колер. Гэта белая кашуля, спадніца ці сарафан, белай намітка або хустка. Памерлага падпаясвалі сінім поясам. Ужыванне чорнага колеру ў адзенні нябожчыкаў і жалобным адзенні абумовілася ўплывам горада на сялянскае жыццё, што прывяло да паступовага выцяснення белага колеру чорным.

Не выключаўся поўнасцю чырвоны колер у пахавальным адзенні: на дзяўчынках і маладых дзяўчатах былі асобныя часткі адзення і ўпрыгожванняў гэтага колеру.

Такім чынам, абрадавае адзенне – гэта адзенне, якое спецыяльна рыхтавалася да пэўнага абраду (вяселля, пахавання, і г.д.) з выкарыстоўваннем адмысловых спосабаў пашыву.

Адзенне і галаўныя ўборы жанчын адлюстроўвалі ўзроставую дыферэнцыяцыю і сямейнае становішча (дзяўчына, нявеста, жанчана, старая).

Адзенне было звязана з магічная сімволікай. Гэта і ахова, і знахарства, і варажба.

# Развитие фтизиатрической помощи на Полотчине в 1920-е годы

*О.В. Козел*

Термин фтизиатрия произошёл от греческого *phthisis* – чахотка и *iatreia* – лечение, а понятие фтизиатрическая помощь – это лечение и профилактика туберкулёза. В 1920-е годы это заболевание было одним из самых распространённых.

В этой связи с первых дней создания Народного Комиссариата Охраны здоровья РСФСР им были предприняты серьёзные меры в борьбе с туберкулёзом. Начала создаваться сеть противотуберкулёзных учреждений. В г. Полоцке необходимо было также открыть диспансер, как наиболее прогрессивную медицинскую организацию, которая совмещала бы амбулаторно-поликлиническую, стационарную и профилактическую помощь для больных туберкулёзом, но не хватало квалифицированных врачей, которые бы могли возглавить его. Все попытки местного отдела здравоохранения пригласить специалистов из городов РСФСР ни к чему не привели[1]. Только в январе 1921 г. в Полоцке появились первые противотуберкулёзные организации – секции по борьбе с туберкулёзом Национального Комитета здравоохранения. Персонал, который обслуживал больных, состоял из сестёр милосердия, закончивших трёхмесячные курсы усовершенствования и прошедших практику в лечебно-профилактических учреждениях Беларуси[2]. Из изученных архивных источников следует, что ещё до открытия противотуберкулёзного диспансера (далее тубдиспансер), при Народной больнице в 1923 г. работал рентгеновский кабинет[3]. Хорошее оборудование в том же году было вывезено в Витебск, поэтому приходилось пользоваться старым. Аппарат работал с перебоями из-за высоких расценок – 13 рублей за 2 часа дневной энергии[4]. Лишь в 1925 г. закупи-

---

[1] Зональный государственный архив в г. Полоцке (далее ЗГАП), ф. 113, оп. 1, д. 94, л. 2.

[2] Там же, ф. 55, оп. 2, д. 40, л. 45.

[3] Там же, ф. 55, оп. 2, д. 83, л. 52.

[4] Там же, ф. 55, оп. 1, д. 25, л. 37, 52.

ли новое оборудование за рубежом. Тем не менее, ощущалась необходимость в диспансере, который смог бы охватить все направления оказания помощи пациентам[5].

В мае 1926 г. отдел здравоохранения г. Полоцка приступил к организации противотуберкулёзного диспансера, который открылся 1 июля. В 10 часов утра начинался приём застрахованных больных[6]. С 10 – до 12 часов утра ежедневно принимали детей, взрослых – с 12 до 8 часов вечера, кроме вторника, а по субботам, воскресеньям и понедельникам рабочих и служащих; в среду, четверг, пятницу – прочих граждан[7].

Заведующим диспансером назначили врача Г.Л. Зеликина. На его взгляд, тубдиспансер отличался от других лечебных учреждений, так как его задача состояла не только в лечении туберкулёза, но и проведении профилактических мер для общего оздоровления изолированных больных, учётно-статистической работе, контроля условий быта и жизни населения. В том же году планировалось открыть оборудованную лабораторию, а на практике использовать по возможности новые методы, чтобы деятельность тубдиспансера развивалась в соответствии с научными достижениями[8].

В 1927 г. при тубдиспансере начал функционировать диагностический отдел. Работал он без полной нагрузки. Сёстры отказывались его обслуживать, работали плохо, не измеряли даже температуру больным. Скорей всего это было связано с халатным отношением к работе, безразличием и низким профессиональным уровнем[9].

Тем не менее, работа налаживалась. Только за первый год работы лечебно-профилактическое учреждение посетило 750 человек из сельской местности, у 50 % которых выявили запущенные формы туберкулёза[10]. С мая 1929 г. были введены правила гигиены для больных туберкулёзом. Каждому предоставлялась плевательница со специальным раствором,

[5] ЗГАП, ф. 55, оп. 1, д. 173, л. 214.
[6] Там же, ф. 55, оп. 1, д. 132, л. 57.
[7] Там же, ф. 460, оп. 1, д. 55, л. 136.
[8] Там же, ф. 113, оп. 1, д. 58, л. 421.
[9] Там же, ф. 113, оп. 1, д. 101, л. 39-40.
[10] Там же, ф. 113, оп. 1, д. 113, л. 922.

индивидуальная посуда, регулярное проветривание помещений и влажная уборка[11].

Больные имели возможность получить направления на курорты и в санатории Ессентуков, Минеральных вод, Сочи, Саки, Южного берега Крыма, Старой Руссы и другие. Например, в 1925 г. Полоцкий Окружной здравотдел получил 24 места на курорты и в санатории[12]. В городе работал курортный комитет, отправляя на лечение застрахованных, оплачивал 5 % от стоимости путёвки[13].

Как во всяком лечебном учреждении, в тубдиспансере выписывались пациентам лекарства. В среднем диспансер платил за рецепт 70 копеек. Из отчёта 1927 г. известно, что на 824 пациента, выписали 240 рецептов, а аптеки предъявили счёт на 211. Понятно, что это количество меньше действительного, так как рецепты на лекарство – «per se» (для себя) аптекой не учитывались. Оплатить такое количество медикаментов не хватало средств, что дискредитировало диспансер, как профилактическое учреждении[14].

С целью проведения общественной профилактики, в 1927 г. при диспансере был организован совет социальной помощи по оздоровлению труда и быта, который рассматривал жилищные условия населения. Сёстры обходили все квартиры, заполняли анкеты о материальном и культурно-бытовом уровне, обследовали предприятия, школы. Затем на совещании, где заслушивались доклады о результатах обследования, планировалась дальнейшая работа[15]. Постоянные осмотры жилья свидетельствовали об антисанитарных условиях, которые пагубно влияли на здоровье, способствуя распространению туберкулёза. В результате одного из осмотров выяснилось, что А. Горянин с семьёй из 5 человек жили в одной комнате – площадью 12,5 кв. м. Можно привести и другие примеры, когда люди с детьми ютились в сырых подвальных помещениях, которые были очагами распространения туберкулёза. Совет социальной

[11] ЗГАП, ф. 113, оп. 1, д. 160, л. 204.
[12] Там же, ф. 113, оп. 1, д. 25, л. 81.
[13] Там же, ф. 113, оп. 1, д. 150, л. 76.
[14] Там же, ф. 113, оп. 1, д. 153, л. 358.
[15] Там же, ф. 113, оп. 1, д. 132, л. 57.

помощи занимался и детьми, больными туберкулёзом. Для маленьких пациентов летом того же года открылась детская солнечная площадка, иными словами (солярий)[16].Позже, на совещании заведующих лечебными учреждениями постановили передать помещение тубдиспансера под родильный дом, что привело бы к его закрытию[17]. Городской Народный Комитет охраны здоровья выступил против решения. Возможно, благодаря этому заявлению, профилактическое учреждение продолжило свою работу, о чём свидетельствует план работы на 1929-1930 гг., о расширении солярия до 40 мест[18].

Деятельность диспансера развивалась довольно интенсивно, но квалифицированных кадров по-прежнему не хватало. Поэтому в сентябре 1926 г. при Народном Комиссариате здравоохранения РСФСР проводились четырёхмесячные курсы по повышению квалификации врачей, занимающихся проблемами туберкулёза, которые не имели специальной подготовки и стажа. Из Полоцких врачей на курсы направили Б.А. Боравского[19]. В 1928 г. заведующего Полоцким тубдиспансером Зеликина Г.Л. командировали в Тифлис на съезд, посвящённый проблемам профилактики и лечения туберкулёза[20].

Практически ежегодно проводились санитарно-просветительные акции - противотуберкулёзные трёхдневники, на которых принималась программа дальнейшей работы, разрабатывались мероприятия, изготавливались лозунги, плакаты[21]. На 1928/29 гг. планировалось открыть туберкулёзное отделение при Полоцкой Окружной больнице им. Ленина на 10 мест, ночной санаторий, диагностическое отделение на 15 мест и 1 туберкулёзный пункт на районе. По плану на 1929/30 гг. должен был открыться ещё один пункт в сельской местности и отделение для больных костным туберкулёзом на 5 мест при больнице[22]. Остаётся неизвестным, было ли осуществлено

[16] ЗГАП, ф. 113, оп. 1, д. 113, л. 946.
[17] Там же, ф. 113, оп. 1, д. 139, л. 153, 158.
[18] Там же, ф. 113, оп. 1, д. 173, л. 276.
[19] Там же, ф. 113, оп. 1, д. 124, л. 468, 470.
[20] Там же, ф. 113, оп. 1, д. 132, л. 468, 470.
[21] Там же, ф. 113, оп. 1, д. 137, л. 181.
[22] Там же, ф. 113, оп. 1, д. 173, л. 276.

запланированное. В архивных источниках подтверждений не найдено.

В 20-е годы XX века на Полотчине проходил процесс становления фтизиатрической помощи населению города по следующим направлениям: санитарное просвещение населения – проведение различных массовых мероприятий и т.д.; лечение больных туберкулёзом было стационарное, амбулаторное и санаторно-курортное; профилактика, которой занимался совет социальной помощи при диспансере, уделяя внимание культурно-бытовым сторонам жизни населения. Несмотря на правильно выбранное направление развития фтизиатрической помощи, не хватало квалифицированных врачебных кадров. Сказывался и низкий уровень среднего медицинского персонала. Тем не менее, уделялось внимание детской фтизиатрии. Однако, тормозила развитие слабая материальная база, нехватка средств и инвентаря. В целом состояние фтизиатрической помощи населению г. Полоцка было характерным для городов на территории Беларуси в 20-е годы XX века.

# Станаўленне і развіццё адкрытай свецкай жаночай адукацыі ў Полацку
(ад пансіёнаў да гімназіі)

***В.Д. Краско***

Асноўная мэта майго даследавання – вывучэнне працэсў станаўлення і развіцця свецкай жаночай адукацыі ў XIX ст. Пры вывучэнні тэмы ў названы перыяд часу адразу ўзнікае некалькі спрэчных пытанняў. Звязана гэта з тым, што станаўленне сярэдняй жаночай адукацыі на працягу ўсяго XIX ст. суправаждалася вострай палемікай наконт яго зместу, арганізацыі, мэтаў і сродкаў выхавання. Першае пытанне – гэта праблемы, звязаныя з вызначэннем статуса навучальных установаў, на якія часта даследчыкі проста не звяртаюць увагу. Так, камнем спатыкнення з'яўляюцца пансіёны, якія некаторыя даследчыкі лічаць сярэднімі навучальнымі ўстановамі. Але такія ўстановы выконвалі дзве важнейшыя і вузкапрактычныя задачы – па-першае, падрыхтаваць са сваіх выхаванак хатніх гаспадынь і будучых захавальніц хатняга ачага, а па-другое, даць для гэтага неабходную адукацыю. У сувязі з такімі задачамі і выстройваўся сам працэс навучання, дзе значнае месца ўдзялялася дамаводству, рукадзеллю, розным майстэрствам, а дапаўняўся курс веданнем замежных моў (нямецкай і французскай), што было неабходна ў сувязі з прыналежнасцю да высакароднага саслоўя. Таму пансіёны нельга лічыць установамі, якія давалі сярэднюю адукацыю.

Другая праблема, у многіх адносінах звязаная з першай, гэта пытанне аб тым, калі ж у Расіі зарадждаецца сетка сярэдніх жаночых навучальных устаноў. І тут, хутчэй за ўсё, размова можа ісці толькі ў сувязі са стварэннем сеткі жаночых гімназій на рубяжы 1850-1860 гг. Тады ж пачалі ўзнікаць і навучальныя ўстановы, якія давалі няпоўную сярэднюю адукацыю – прагімназіі Міністэрства народнай асветы, марыінскія вучылішчы, жаночыя гарадскія і прыватныя вучылішчы. Развіццё капіталізму пасля падзення прыгоннага права выклікала патрэбу ў больш шырокім развіцці асветы. У сярэдзіне XIX ст. жаночая адукацыя прыйшла ў поўную супя-

рэчнасць з патрабаваннямі жыцця. Вядомыя педагогі-асветнікі таго часу рэзка крытыкавалі сістэму закрытай прывілеяванай жаночай адукацыі, яе коснасць, вузкасаслоўны характар, адрыў ад рэальнага жыцця. Яны патрабавалі агульнаадукацыйнага адкрытага характару выхавання жанчыны, безсаслоўнасць і даступнасць. Пад націскам грамадскага руху ў 1860-70-я г. царскі ўрад правёў рэформы ў галіне народнай адукацыі. Навучальныя ўстановы розных ведамстваў у пераважнай большасці перайшлі ў падпарадкаванне Міністэрства Народнай асветы. Паводле Палажэння аб жаночых вучылішчах 1860 года ўстанаўлівалася сістэма адкрытай жаночай адукацыі. Замест жаночых пансіёнаў былі арганізаваны дзяржаўныя і прыватныя жаночыя двухкласныя ўзорныя вучылішчы (з пяцігадовым тэрмінам навучання), 4 класныя жаночыя вучылішчы, (жаночыя вучылішчы 2-га разраду), гімназіі і прагімназіі (1 разраду).

У дадзеным паведамленні на падставе гістарычных крыніц, якія захоўваюцца ў НГАРБ, зроблена спроба ўзнаўлення гісторыі аднаго з жаночых вучылішч, якое існавала ў Полоцку ў XIX ст. На жаль, прамога фонду архіўных дакументаў гэтага вучылішча амаль не існуе, толькі дзве невялікія справы. Таму падчас працы былі выкарыстаны дакументы гарадской думы, інспектара народных вучылішч і іншыя справы.

У 1848 годзе Полацкі прыватны ўзорны пансіён быў пераўтвораны ў казённы. Паводле Палажэння 1860 г. гэты пансіён атрымлівае новую назву – прыватнае жаночае двухкласнае вучылішча. Гаспадыняй гэтага вучылішча была Чарнова Эмілія Давыдаўна.[1] Міністэрства народнай асветы даволі доўга не выдзяляла сродкаў на гэта вучылішча, і на першым часе яно існавала на прыватныя сродкі. 8 ліпеня 1868 года выходзіць Палажэнне, згодна якому ў Паўночна-Усходнім краі засноўваліся прыватныя жаночыя вучылішчы з субсідыяй ад урада. І цяпер гэтыя ўстановы павінны былі называцца не іменем гаспадыні ўстановы, а па імені горада – Полацкае жаночае двухкласнае прыватнае вучылішча. Асноўная мэта гэтай установы амаль не адрозніваецца ад мэты пансіёна – «Со-

[1] Нацыянальны гістарычны архіу РБ (далей НГАРБ), ф. 2737, воп.1, спр. 1, а. 6-8.

общить ученицам то образование, которое должно требовать от каждой женщины, в особенности же от будущей супруги и матери семейства».[2] У асноўным тут навучаліся дзеці дваран і чыноўнікаў. На жаль, пакуль не удалося знайсці звестак аб гэтым вучылішчы з 1868 па 1879 гг. Вядома толькі, што гэта ўстанова з'яўлялася школай повышанага тыпу з пяцігадовым тэрмінам навучання. Першыя тры гады лічыліся першым класам, і цалкам адпавядалі курсу пачатковай школы. Чацвёрты і пяты гады састаўлялі курс другога класа. Размяшчалася вучылішча ў двухпавярховым «каменным доме Свішчэўскага на вуліцэ Віцебской».[3] Далейшыя дакументы датычацца канца 70-90-х гг., і даюць добрае ўяленне не толькі пра існаванне вучылішча, але і пра яго трансфармацыю ў гімназію.

У красавіку 1879 г. домаўладальнікі і жыхары горада Полацка звярнуліся ў праўленне Віленскай акругі з хадайніцтвам аб адкрыцці ў Полацку пяцікласнага жаночага пансіёна. І папячыцель вучэбнай акругі Міністэрства народнай адукацыі 27 красавіка дасылае ліст паліцмайстру з дазваленнем. Але там указана, што размова аб пераўтварэнні двухкласнага вучылішча ў пяцікласнае можа ісці толькі тады, калі жыхары горада і ў далейшым будуць аказваць субсідыю. Чарнова піша хадайніцтва ў гарадскую Думу (гарадскі галава Літвінаў) аб пераўтварэнні вучылішча і водпуску ад горада грашовай дапамогі (на першы год – 500 руб, а ў наступныя – 700 руб.). Гэта хадайніцтва было прадстаўлена агульнаму сходу Думы 8 чэрвеня. Трэба адзначыць, што Дума ўсхваліла гэта пачынанне, але ўведаміла аб тым, што «нягледзячы на агульнае жаданне аказаць дапамогу ў добрай справе ў цяперашні час, калі адначасова сабралася так многа расходаў па розным немалаважным прадметам гарадской гаспадаркі, як, напрыклад, рамантаванне дарогі да вакзала і пажарнага обозу і іншых горад не мае магчымасці выдзеліць сродкі на пераўтварэнне вучылішча. З адкрыццём жа больш дастатковых сродкаў горад з радасцю прыме ўдзел ў гэтай справе і не адмовіць ў азначанай дапамозе».[4] Але просьба Чарновай была вызвана не толькі яе

[2] НГАРБ, ф. 2737, воп. 1, спр. 1, а. 7.
[3] Там жа, ф. 2737, воп. 1, спр. 6, а. 8-10.
[4] Там жа, ф. 2737, воп. 1, спр. 2, а. 6.

асабістым жаданнем, неабходнасць пераўтварэння вучылішча ўсведамлялі жыхары горада, якія імкнуліся даваць сваім дачкам адукацыю ў аб'еме курса жаночых прагімназій Міністэрства народнай асветы. 10 жніўня сабраўся Папячыцельны савет, які прыняў пастанову адкрыць пры вучылішчы трэці і чацвёрты класы з захаваннем дапамогі 700 рублёў.[5] Савет разгледзіў план, праграму і размеркаванне ўрокаў Полацкага чатырохкласнага з падрыхтоўчым класам жаночага вучылішча гаспадыні Чарновай. Усе дакументы атрымалі станоўчы водгук, але было выказана два патрабавання:

1. пры выкладанні рускай мовы павінна быць літаральна выпаўнена без уселякіх змяненняў і адступленняў праграма, якую зацвердзілі для Віленскага Марыінскага жаночага вышэйшага вучылішча;
2. Чарнова павінна ў дапаўненне да прадстаўленай праграмы ўказаць з дакладнасцю тыя падручнікі, па якіх будзе выкладацца кожны прадмет, праграмы з дакладным тлумачэннем, у якім аб'ёме будзе праводіцца па прадмету Закона божага чытанне і тлумачэнне святога пісання.[6]

Такім чынам, вучылішча пачало працу на больш вышэйшай ступені. Апошні раз Чарнова ўпамінаецца ў дакументах 10 студзеня 1880 года, калі папячыцель просіць прадставіць справаздачу аб працы вучылішча. У чэрвені 1880 года дырэктар народных вучылішч просіць памочніцу Чарновай Вільгельміну Рульковіус заняць месца гаспадыні вучылішча.[7] У 1881 годзе гарадская Дума выдзяляе ад горада дапамогу 300 рублёў у год, каб адкрыць пяты клас у новым навучальным годзе. А ў 1888 годзе вучылішча пераезджае на вуліцу Ніжнепакроўскую ў дом манастыра.[8]

Змест навучання ў вучылішчы вызначаўся адпаведнымі «палажэннямі» і «правіламі», прынятымі ў перыяд з 1871 па 1889 г., дзе галоўная ўвага звярталася на выкладанне закону

[5] НГАРБ, ф. 2737, воп. 1, спр. 2, а. 8.
[6] Там жа, ф. 2737, воп. 1, спр. 2, а. 7-8, 16-18.
[7] Там жа, ф. 2737, воп. 1, спр. 4, а. 16.
[8] Там жа, ф. 2737, воп. 1, спр. 4, а. 36.

божага, рускай мовы, гісторыі і геаграфіі. Школьнае начальства ўсяляк імкнулася захаваць старыя метады навучання шляхам зубрэння падручнікаў. Упраўленне Віленскай вучэбнай акругі ставіла задачу перад школай – выхоўваць вучаніц у духу вернасці праваслаўнай царкве і адданасці царскаму самадзяржаўю. У раскладзе ўрокаў вучылішча значацца наступныя прадметы: падрыхтоўчы класс – руская, французская мовы, чыстапісанне, рукадзелле, арыфметыка. У першым класе ўводзіліся геаграфія, нямецкая мова, руская вусная і пісьмовая мова. У трэцім і чацвёртым класах прыбаўляліся гісторыя, геаграфія, прыродазнаўства. Экзамены праходзілі з 7 мая па 4 чэрвеня ва ўсіх класах па рускай, нямецкай, французскай мовах, геаграфіі, арыфметыцы, а ў старшых класах яшчэ па гісторыі і прыродазнаўству. Таксама ацэньваліся паводзіны, увага, парадак, стараннасць. Значнае месца адводзілася вывучэнню Закону божага.[9] Цікавая асаблівасць назіраецца ў вучылішчы. Так, у пансіёне, які існаваў да гэтага выкладаўся Закон Божы ці «Священная история Ветхого и Нового завета и закона божьего Греко-российского и римско-католического исповедания, также евангелическо-лютеранского». Улічваўся канфесійны стан і пазней, у гімназіі, дзе Закон Божы выкладалі для праваслаўных, каталікоў, лютэран, іудзеяў. А вось тут Закон божы выкладае толькі праваслаўны святар Міхаіл Іонавіч Дуброўскі. Але вучаніцам іншага веравызнання было дазволена не наведваць урокі Закона Божага. Тым не менш, іх было болей паловы. Так, у 1896/1897 навучальных гадах навучалася: праваслаўнага веравызнання – 45, іудзейскага – 61, лютэранскага – 10, рымска-каталіцкага – 12. У 1897/1898 гг. праваслаўнага – 40, іудзейскага – 72, рымска-каталіцкага – 11, лютэранскага – 9. У 1896 г. была праведзена праверка вучылішча ўчастковым інспектарам народных вучылішч, стацкім саветнікам Я.І. Тараноўскім. Ён адзначыў добрую пастаноўку навучальна-выхаваўчай справы, але заўважыў, што ў методыцы выкладання некаторых прадметаў назіраецца адступленне ад дыдактычных патрабаванняў і ў засваенні вучэбнага курса выхаванкамі заўважаюцца праблемы:

[9] НГАРБ, ф. 2737, воп. 1, спр. 6, а. 7-9.

1. выкладанне рускай мовы ідзе паспяхова, але змест вершаў павінен быць патрыятычным.
2. па гісторыі ўрокі старанна завучваюцца і перадаюцца правільна, але ў пераказе матэрыялу, які вывучаўся раней, не выяўлена трывалых ведаў па храналогіі.
3. вучаніцы валодаюць дастатковымі ведамі па фізічнай і палітычнай геаграфіі, як агульнай, так і рускай, але звесткі па матэматычнай геаграфіі нельга лічыць здавальняючымі – вучаніцы не маюць выразнага ўяўлення аб напрамках мерыдыянаў і шыраты месца, і ім цяжка ў вызначэнні шыраты і даўгаты па карце і глобусу.

Таксама было адзначана, што пры добрай пастаноўцы вучэбнай работы недастаткова заўважаецца клопат аб развіцці патрыятычнага, нацыянальнага, рэлігійнага пачуццяў. Неабходна ўстанавіць пільны нагляд за выкананнем рэлігійных абавязкаў вучаніцамі, акуратнасць у наведванні імі храма ў вольны ад класных заняткаў час. Для вучаніц быў рэкамендаваны спіс лепшых рускіх гістарычных твораў.[10]

Змест выхавання таксама вызначаўся статутамі, цыркулярамі і інструкцыямі Міністэрства Народнай Асветы і папячыцеля Віленскай вучэбнай акругі. Гэтыя дакументы сведчаць аб няўхільным імкненні міністэрства і яго органаў на месцах узмацніць уплыў навучальных устаноў на вучаніц як праз навучанне, так і пры дапамозе спецыяльных мерапрыемстваў. Да такіх мерапрыемстваў можна аднесці шматлікія святкаванні з нагоды юбілеяў і памятных дат. Напрыклад, у красавіку 1900 года дырэктар народных вучылішч піша цыркуляр Рульковіус аб святкаванні 100-годдзя са дня смерці Суворава.[11] У цыркуляры ўтрымліваецца прапанова 7 мая ўшанаваць памяць расказамі і чытаннем. Цыркуляры 1902 года прапаноўваюць правесці 21 лютага паніхіду з нагоды 50-годдзя смерці Гогаля і літаратурна-вакальныя чытанні, а 23 красавіка - ушанаванне рускага паэта Васіля Андрэевіча Жукоўскага.[12] Для апошняй

[10] НГАРБ, ф. 2737, воп. 1, спр. 8.
[11] Там жа, ф. 2737, воп. 1, спр. 10, а. 5.
[12] Там жа, ф. 2737, воп. 1, спр. 10, а. 5.

падзеі была распрацавана папячыцельская праграма, надрукаваная ў друкарні Клячко.

1. «Боже царя, храни» – хор вучаніц старшага класа
2. Прамова выкладчыка Даўгова І.І.
3. Чытанне ўголас вершаў і сляванне песень вучаніцамі. І пад канец – народны гімн.[13]

Састаў выкладчыкаў быў невялікі. Як правіла, яны працавалі не толькі ў адной навучальнай установе, таму расклад заняткаў складаўся так, каб выкладчыкам было зручна. Варта прывесці і прозвішча выкладчыкаў. Рускую мову выкладаў спачатку Васіль Ягоравіч Савіцкі, потым Далгоў Іван Іванавіч, выкладчык кадэцкага корпуса, Зязюлін Іосіф Іванавіч – рускую мову і геаграфію, Леанардаў Дзмітрый Сяргеевіч, кандыдат багаслоўскіх навук, выкладаў рускую і царкоўнаславянскую мову, выкладчык кадэцкага корпуса – Берг Генрых Эмілевіч – матэматыку. Працаваў тут і Ласковіч Мікалай Восіпавіч. Невырава Марыя Пятроўна, Міцкевіч Марыя Сцяпанаўна (потым у гімназіі) і настаўніцы, якія жылі ў пансіёне на пансіённым утрыманні. Заработная плата не ва ўсіх была аднолькавая, плацілі ў асноўным паўрочна. Жанчынынастаўніцы атрымлівалі значна менш. Напрыклад, Ласковіч за 10 урокаў у тыдзень атрымліваў 342 рублі ў год,а Міцкевіч за 12 урокаў – 138 рублёў. Вучылішча валодала добрай бібліятэкай, але кнігі падбіраліся ў асноўным, улічваючы праграмны курс і прапускаліся праз цэнзуру. Напрыклад, у пачатку 1902 г. быў забаронены часопіс «Детское чтение» Навуковы камітэт прыняў наступную пастанову:

1. Приостановить с 1902 г. разрешение ученическим библиотекам средних учебных заведений и народным читальням и билиотекам выписывать журнал «Детское чтение» по предварительной подписке и допускать впредь этот журнал, если о том поступило ходотайство лишь по предварительному разрешению Ученого комитета
2. Изъять книги за 1901 год из библиотек.[14]

---

[13] НГАРБ, ф. 2737, воп. 1, спр. 10, а. 36.
[14] Там жа, ф. 2737, воп. 1, спр. 10, а. 6-7.

Усяго ў горадзе існавала каля 10 аматарскіх тэатральных калектываў. На іх базе пад кіраўніцтвам Савельева Андрэя Васільевіча (фота), чалавека адукаванага ў тэатральнай справе, пададзел мастацтваў (тэатральны аддзел) народнай адукацыі Полацка вядзе размовы аб стварэнні прафесійнай трупы акцёраў для гарадскога тэатра.

Спачатку ствараецца дзіцячая студыя пад кіраўніцтвам артысткі Оленевай. У верасні 1920 года яна працуе з дзвюма групамі дзетак. 48 чалавек пачалі вывучаць танцы, пластыку, міміку, рыхтавацца для пастановак спектакляў.

У маі-чэрвені 1921 года пры аддзеле народнай адукацыі ствараецца два прафесійныя калектывы: Яўрэйская драматычная трупа, з артысты: Бязродны М., Лазараў А., Мармур М., Рафайловіч Р., Пук, Капейкіна Б., Фіш Г., Рапапорт М., Сорын Б.

А з 1 чэрвеня 1921 года пачынае працу Рускі драматычны калектыў: С. Горчыкаў – Сазоўскі, Е. Баршчэўская-Зорына, В. Міркоўская-Мірская, А. Судзілоўская, Е. Паўлава-Любімава, Г. Аўсяннікава, Крупеніна Яўгенія, Ларын Рыгор. Таксама сярод рускага драматычнага калектыву ў Полацку на пачатку 20-гадоў сустракаюцца імёны – А. Воліна, Раманоўскі-Волін, Пакроўская-Дункан, Хамчаноўскі, Варлай-Верабьёў, Паскаль-Надзеждзіна, Нікановіч, Сцяпанаў-Таболішчаў. Артысты прызначаны ў пастаянныя драматычныя трупы з выплатай па разавых стаўках за кожнае выступленне. Драматычным і музычна-адказным распарадчыкам прызначаецца Нэйгаўзен Якаў на ўсе спектаклі і канцэрты, якія арганізоўвае аддзел народнай адукацыі. У якасці загадчыкаў гарадскога тэатра ў 1921 і 1923 гадах у архіўных дакументах ўзгадваюцца Яфімаў Рыгор – актыўны дзеяч Тэатральнай камісіі – і акцёр Варлай-Верабьёў.

Як часта і якія ставіліся спектаклі ў Полацку? У 1920 годзе амаль кожны дзень ставіліся спектаклі бясплатныя і за грошы мастацкімі драматычнымі калектывамі горада. Агульная колькасць спектакляў на 1924 год – 114, 10 палітсудоў, 13 вечароў самадзейнасці. Па тэматыцы гэта рэвалюцыйныя, бытавыя, класічнага рэпертуара п’есы на рускай і яўрэйскай мове. У 1924-25 гг. у гарадскім тэатры ставяцца спектаклі на яўрэйскай і масавыя пастаноўкі на беларускай мовах.

Безумоўна трэба выдзеліць існаванне ў горадзе польскага драмгуртка, які ставіў у 1924-25 гг. пастаноўкі на польскай мове.

Сярод папулярных аматарскіх гурткоў выдзяляецца драматычны гурток пры клубе міліцыі. Акцёры-аматары ставяць смелыя і фантазійныя вадэвілі ў адной дзеі на рускай мове – «Начальник отряда», альбо «Ожидание кометы в уездном городе». Падчас спектакляў у гарадскім тэатры ўлады падтрымлівалі парадак. Так Свярдлоў Лазар і Леў Леў пачалі

курыць седзячы ў ложы і здекавацца з міліцыянера, за што атрымалі 15 сутак у арыштным доме.

У фондах музея захоўваюцца фотаздымкі гуртка пры культурна-асветным таварыстве саюза кааператываў, куды ўваходзілі настаўнікі горада. У часопісе «Мішпоха» № 1 за 1995 год ёсць звесткі і фотаздымкі аднаго з яўрэйскіх драматычных гурткоў «Чырвоных саматужнікаў» і іх пастаноўкі ў Полацку. Пачатак развіцця тэатральнай справы ў горадзе, безумоўна, каштоўная старонка нашай гістарычнай спадчыны.

Кінатэатр «Калізей» – першы кінатэатр савецкага часу.

Гарадскі кінатэатр «Калізей» пачаў працаваць з кастрычніка 1920 года штодзённа, акрамя панядзелка. Ён быў нацыяналізаваны ў прадпрымальніка Аронава і меў вялікае памяшканне – дзвух'яруснае, з балконам і ложай. Білеты былі танныя, гэта рабіла яго папулярным. Каштавалі білеты ў 1920 годзе ад 15 да 30 рублёў[19].

Памяшканне кінатэатра змяшчала 500 глядачоў. Наперадзе, перад экранам, была пабудавана эстрада, на якой адбываліся канцэрты. У 1923 годзе піяністка Дора Шнеерсон (выкладчыца музычнай школы) і скрыпач Кюльбах забяспечвалі музычнае суправаджэнне да фільмаў. Але ж у памяшканне кінатэатра не было электраэнергіі, раней была свая электрастанцыя, а ў бальшавіцкі час, відаць, не працавала. Было цяжка і з фільмамі патрэбнага ўладам сэнсу. Агітацыйныя фільмы прыходзілі з Віцебска. Тры дні на тыдзень былі бясплатныя сеансы для чырвонаармейцаў і для членаў прафсаюза. Па суботах і ў нядзелю былі спецыяльныя сеансы для дзяцей. Па меры неабходнасці арганізоўваўся перасоўны кінематограф для павета. У 1923 годзе загадчыцай кінатэатра «Калізей» была Аронава Раіса, раней – Сінайскі і Трыфсік.

У 1922 годзе кінатэатр быў пераведзены на самаакупаемасць і здаваўся ў арэнду. Супрацоўнікі скардзяцца на цяжкія падаткі і просяць паменшыць працэнт адлічэння грошаў: замест 25 % – 10%. Але ж усё роўна ў 1925 годзе кінатэатр,

---

[19] ЗДАП, ф. 54, воп. 1, спр. 34, а. 49, 51; Там жа, ф. 54, воп. 1, спр. 34, а. 1.

як і гарадскі тэатр, нягледзячы на вялікія запазыкі дзяржаве, працягвае актыўную прапагандысцкую дзейнасць новага часу.

Полацкая Цэнтральная бібліятэка пры павятовым аддзеле адукацыі была створана як гарадская бібліятэка яшчэ ў 1919 годзе, месцілася па вуліцы Троцкага 11,б.[20]

Сярод першых загадчыкаў бібліятэкі ўзгадваецца Шымановіч Мордух. Пасля 1921 года на гэтай пасадзе працаваў Вітэнберг Вульф – 52 гадовы вопытны бібліятэчны супрацоўнік, які ўжо меў стаж працы з кнігамі. Працавалі бібліятэкарамі – Дзерве Эмілія Якаўлеўна (28 год) і Лебедзева Вольга Сяргееўна (49 год). Бібліятэка мела 11 кв сажняў пад бібліятэку і 20 кв сажняў пад базу ў будынку, дзе захоўваліся кнігі, нацыяналізаваныя аддзелам народнай адукацыі ў былога асветніцкага таварыства Полацка былога «Благароднага сабрання». Спачатку цэнтральная бібліятэка мела 2 чытальныя залы, але ў 1924 годзе засталася толькі 1 – чытальная зала пры рабочым клубе – загадчыкам быў Давід Яфімавіч Клячко.

Цэнтральная бібліятэка мела самы вялікі кніжны фонд у горадзе. У 24 годзе ў ёй было 5815 тамоў кніг. Таксама было 14000 брашур, з якіх толькі 20 % былі падыходзячыя па сэнсу для карыстання. Бібліятэка існавала на сродкі аддзела адукацыі і на плату падпісчыкаў.

За карыстанне кнігамі для дарослых плацілі 10 капеек, для дзяцей – 5. Клубныя работнікі , чырвонаармейцы, маламаёмные грамадзяне – карысталіся бясплатна. Па статыстыцы самой цэнтральнай бібліятэкі на 1 студзеня 1924 года яна абслугоўвала 26 дарослых кожны дзень.

У горадзе пры доме Саветаў (былы дом Мінца) на 3 паверсе па вуліцы К. Маркса існавала бясплатная бібліятэка Полацкага Павятовага камітэта КПБ – партыйная бібліятэка. Загадчыца ў 1923 годзе – Гольдвасер Сафія, потым – 19 гадовы Іткінсан Аркадзь Восіпавіч. Партыйная бібліятэка абслугоўвала 35 чалавек на дзень, мела 2008 кніг для карыстання. Тут жа быў і клуб партыйна-рабочы.

---

[20] ЗДАП, ф.54, воп.1, спр.34, а. 51; Там жа, ф. 54, воп. 1, спр. 366, а. 246-249, 263, 353; Там жа, ф. 54, воп. 1, спр. 238, а. 39; Там жа, ф. 54, воп. 1, спр. 369, а. 57; Там жа, ф. 2212, воп. 1, спр. 20, а. 39.

Таксама пры клубах камсамольскім і піянерскім па Крапасной вуліца № 2 існавала бібліятэка К.С.М.Б. Кніжны фонд – 764 кнігі.

Акрамя гэтых гарадскіх бібліятэк, у 23-24 гг. у горадзе на сродкі Палітасветы Полацка існавала і Дрысенская бібліятэка.

Дрысенская Цэнтральная бібліятэка – самая першая у павеце, створаная ў гады Савецкай улады – у 1918 годзе. Яе ўзначальвала Бедзерава Вера Абрамаўна (1901 г.н.).Кніжны фонд быў вельмі вялікі – да 4,5 тысяч кніг, але ў асноўным (звыш 4 000) «устарэўшыя» кнігі на польскай, французскай, нямецкай, англійскай і яўрэйскай мове. Гэтыя кнігі канфіскоўваліся, частка кніг (315) навуковага і археалагічнага значэння была вывезена ў віцебскі Археалагічны Інстытут навуковым супрацоўнікам М.Мялешка.

Абавязковымі былі праверкі і канфіскацыі нацыялістычнай і рэлігійнай літаратуры ў кніжных фондах бібліятэк. Так, 8 жніўня 1924 года прадстаўнікі ГПУ і загадчыкі бібліятэк склалі спіс забароненых кніг, якія павінны былі канфіскавацца. Сярод іх – гістарычная літаратура: «Германия, Россия, Польские дела», «Национальное движение в еврействе», «Родная старина», «Русский вестник», релігіийныя даследаванні: «Библия и наука», «Сборник религиозных верований с древнейших времен до наших дней», і іншыя – Талстой «Зелёная палочка».

Бібліятэкі павінны былі праводзіць літаратурныя суды, нядзелі кнігі, выставы.

Акрамя таго, існавалі спецыяльныя аддзелы драматычнай літаратуры, музычнай літаратуры, літаратуры па выяўленчым мастацтве пры пададзеле мастацтваў Полацка ў Народным доме. Загадчыца – Супрун Ліна Восіпаўна. Месца знаходжання гэтых аддзелаў у больш позні час – Дом Настаўніка, на месцы, дзе зараз малочная крама. Гэтыя звесткі пакінуў нам І.П. Дэйніс. Ён піша пра бібліятэку, сцэну, метадычныя кабінеты у распараджэнні народнай асветы.

Полацкі Акруговы Краязнаўчы Музей.

Сярод вышэйадзначаных гарадскіх установ культуры, Полацкі Акруговы Краязнаўчы Музей быў створаны значна

пазней. У снежні 1924 года пачынаецца праца Краязнаўчага таварыства ў Полацку[21]. Старшыня праўлення – Лубоўскі, яго намеснік – Пётр Дэйніс, члены праўлення – Цясто, Заслаўскі, Крывіцкі (выпускнік мінскага педагагічнага тэхнікума), абапіраючіся на вялікі (50 чалавек) актыў культурных работнікаў, у асноўным педагогаў Полаччыны, яны пачынаюць працу па вывучэнні культуры краю, збіранні і класіфікацыі краязнаўчага матэрыялу. І. Дэйніс, Гарбур, Южык, выкладчыкі педагагічнага тэхнікума Сяргей Мялежка і Трубач (ён вёў беларусазнаўства) – гэта таксама пачынальнікі дадзенай справы. Увосені 1926 года пры дапамозе ўладаў горада і Аляксандра Адамовіча – сакратара Полацкага акруговага камітэта КП(б) Б – на 1500 рублёў быў зроблены рамонт будынка Сафійскага сабора. Была абрана музейная рада, якую ўзначаліў выкладчык педагагічнага тэхнікума Сяргей Мялешка, і першы дзяржаўны гарадскі музей пачаў працаваць у Полацку.

Музей працаваў у аўторак, сераду і нядзелю ад 10 да 15-16 гадзін. Для экскурсій , якія праводзілі члены музейнай рады, музей адчыняўся ў любы час. За тры гады ў музеі было, па словах С. Мялешкі, – 15 000 наведвальнікаў; яны мелі магчымасць пазнаёміцца з этнаграфічнымі рэчамі ў хаце полацкага селяніна 19 стагоддзя, пазнаёміцца з прыроднымі асаблівасцямі наваколля, а ў 7 асобных кутках музея пaглядзець разнастайныя цікавыя рэчы, якія асвятлялі пытанні культуры

[21] ЗДАП, ф. 54, воп. 1, спр. 34, а. 187; Там жа, ф. 112, воп. 1, спр. 37, а. 16-17, 43; Там жа, ф. 54, воп. 1, спр. 365, а. 14; Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 1, Мн., 1993, с. 44; Мялешка С. Полацкі Акруговы Краязнаўчы музей.// Наш край, № 12, 1929, с. 55-58; Мялешкаъ С. Праца Навукова-Дасьледчае Экспедыцыі Цэнтральных Дзяржаўных Рэстаўрацыонных Майстэрняў у г. Полацку.// Наш край, № 8-9 (47-48), 1929, с. 77-80; Ляўданскі А. Нацдэмы ў саюзе з рэлігіяй і царкоўнікамі супроць дыктатуры пролетарыяту.// Савецкая Краіна, № 3, 1931, с. 24-29; Аркуш А. Рызыкоўная барацьба намэнклятуры.// Наша Ніва, № 7, 18 лютага 2005, с. 13; Гужалоўскі А.А. Музеі Беларусі 1918-1941. Мн. 2002. с. 87-88; Джумантаева Т.А. Краязнаўчы музей Полацка. Полацк, 2000, с. 5; Краско О.Д. История полоцкого краеведсеского музея. Полоцк. 1998.

і гісторыі Полаччыны. Звяртаюць увагу планы супрацоўнікаў музейнай рады па далейшаму развіццю экспазіцыі музея. Аднач асова з планамі па стварэнню ў краязнаўчым музеі асобнага аддзела гісторыі рэвалюцыйнага руху, паказу дасягненняў у справе правядзення калектывізацыі і выканання пяцігадовага плана на Полаччыне, музейныя супрацоўнікі плануюць адкрыццё асобнага аддзела рэлігіі. Гэты аддзел павінен мець антырэлігійную накіраванасць, але ж экспанаты павінны наведвальнікам-экскурсантам расказаць і пра рэлігійныя культы на Полаччыне ў старажытны час, быт духавенства, як чорнага, так і белага, раскрыць эканамічныя пытанні царкоўнага жыцця, паказаць царкву і саюз рускага народа, барацьбу царквы з Кастрычніцкай рэвалюцыяй, культ мошчаў, царкву і голад 1921 года і шмат іншага.

Гэтаму спрыяла актыўная доследная і пошукавая праца ў Полацку, як супрацоўнікамі музейнай рады так і навуковымі экспедыцыямі. Сяргей Мялешка знаходзіць у Полацкім фінаддзеле крыж Лазара Богшы. Сумеснымі сіламі навукоўцаў даследуюцца асноўныя старажытныя помнікі Полацка і прымаюцца наступныя вывады, якія Сяргей Мялешка публікуе ў рэспубліканскім друку:

- захаваць ад руйнавання каштоўныя фрэскі Барысаглебскага манастыра…

- старажытны сабор у былым Спаса-Еўфрасіьеўскім кляштары вызваліць ад культу, узяць пад музей і рэстаўраваць старажытныя роспісы…

- у мэтах папулярызацыі беларускіх помнікаў старажытнасці трэба змясціць каля кожнага помніка альбо на самым помніку, асобыя дошчачкі, якія будуць растлумачваць старажытнасць і сусветнае значэнне помнікаў.

Вядома, што гэтыя планы першых музейшчыкаў горада здзейсніліся. Але ж у 1929-30 гадах разгортваецца барацьба з так званым «нацыянал – дэмакратызмам». Зняты з работы і выключаны з партыіі, а потым і вогуле растраляны Аляксандр Адамовіч, публічна шэльмуецца палітыка збірання царкоўных рэчаў беларускага стылю гісторыкамі – навукоўцамі

і музейнымі супрацоўнікамі, Сяргей Мялешка таксама ў рэспубліканскім друку абвінавачваецца ў нацыянал – дэмакратызме.

Усе гэтыя пытанні патрабуюць большага вывучэння ў спецыяльных архівах, але ж відавочна тое, што першы гарадскі Полацкі краязнаўчы музей быў сапраўдным цэнтрам адраджэння беларускай культуры на Полаччыне.

Такім чынам, першыя дзяржаўныя ўстановы культуры ў Полацку аб’ядноўвае прафесіяналізм пачынальнікаў – мастацкай, музычнай, тэатральнай, бібліятэчнай, музейнай справы і вялікая колькасць жыхароў горада, якія падтрымлівалі і ўдзельнічалі ў развіцці культурных устаноў. Культурны актыў горада на пачатку 1920-х гадоў складаўся з педагогаў і выкладчыкаў Полаччыны. Выяўлены імёны пачынальнікаў першых гарадскіх устаноў культуры Полацка, але ж, на жаль, вельмі мала фатаграфічных здымкаў таго часу. Выяўленая сітуацыя у культурным жыцці горада на пачатку 20-х гадоў значна разыходзіцца з версіямі тых прац, якія падаюць дадзены перыяд гісторыі горада напружаным «грамадзянскай вайной», нестабільным.

Звесткі аб народнай мастацкай школе ў Полацку і яе заснавальніку – Вінаградаве Д.А. – уводзяцца ў навуковы абарот упершыню.

Выяўлены матэрыял павінен дапамагчы супрацоўнікам музеяў праз экскурсіі, канцэпцыі выстаў, збор фондавага матэрыялу больш дакладна асвятляць дадзены перыяд.

# Асаблівасці развіцця жаночага касцюма на Паазер'і ў канцы XIX – пачатку XX ст.
## (канструктыўна-тэхналагічныя асаблівасці жаночага адзення Расонска-Верхнядзвінскага крою)

***Н.В. Філатава***

У адносінах да касцюма Віцебскай Беларусі склаліся асабістыя абставіны. Традыцыйны касцюм поўначы Беларусі – з'ява мала даследаваная і амаль таямнічая нават для спецыялістаў-даследчыкаў беларускага народнага мастацтва. На жаль, мы не можам уявіць сабе народны касцюм Падзвіння ва ўсёй сваёй паўнаце і мастацкім аздабленні. У параўнанні з касцюмамі іншых рэгіёнаў Беларусі, народны касцюм Падзвіння вельмі сціслы ў калекцыях, ці няма зусім.

Невялікая колькасць калекцый, этнаграфічных замалёвак, рознага роду апісанняў, літаратурных матэрыялаў прымушае нас рэтраспектыўна падыходзіць да вывучэння касцюма, які быў у нашай мясцовасці.

Вялікую ролю ў вывучэнні і рэканструкцыі народнага адзення Паазер'я пакінуў М.Ф. Раманюк. У фондах Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, у фондах Лепельскага дома рамёстваў захоўваюцца мастацка-графічная рэканструкцыі традыцыйных лакальных строяў народнага адзення гэтага рэгіёну. Тое, што дайшло да нас праз літаратурныя крыніцы М. Аніміле, М. Нікіфароўскага, А. Лісоўскага, праз калекцыі Е. Раманава, А Сержпутоўскага, фотаздымкі, якія былі зроблены ў сярэдзіне XIX ст. М. Кусцінскім, А. Крукоўскім, дае магчымасць правесці мастацтвазнаўча- этнаграфічнае раянаванне нацыянальнага касцюма Паазер'я з мэтай выяўлення лакальных адметнасцяў у відах і формах адзення, яго крої і аздабленні, спосабах нашэння.

Да асноўных строяў Паазерскага крою можна аднесці Лепельскі, Суражскі, Верхнядзвінскі строі, пераходныя Дубровенскі, Парэчскі.

Нацыянальны склад насельніцтва, узаемасувязь з культурамі суседніх народаў, прысутнасць рускіх- старавераў,

латышоў, літоўцаў вельмі ўплывалі на народны касцюм нашага рэгіёна.

Для жаночага адзення маладой жанчына Паазер'я характэрны два варыянты галоўных комплексаў. У адзін уваходзіла спадніца-андарак, у другі – саян тыпу сарафан.

«Слово «саян» встречается в западно-русских актах XVI-XVII вв., из которых видно, что эта одежда была распространена в те же времена в Литве и Белоруссии» – піша Г.С. Маслава.

Саянны комплес характэрны ў асноўным для Магілёўскага Падняпроўя, але ў блізкіх варыянтах ён сустракаецца на паўднёва-усходняй частцы Віцебшчыны.

Саян – род спадніцы, з каляровай паласой па нізе спадніцы, з прышыўным ліфам. Спадніца на таліі закладалася ў зборкі, якія фіксаваліся ўверсе на адлегласці 10-15 см ад яе. Зборкі размяшчаліся на таліі нераўнамерна. Неглыбокія складкі ад пярэдняй да задняй полак павялічваліся, і такім чынам, аб'ём пераносіўся назад. Невялікі ліф шчыльна аблягаў фігуру. Падобны сарафан з прышыўным ліфам- карсетам можна знайсці ў фондах ВАКМ.

На слайдах, якія знаходзяцца ў фондах Дзяржаўнага музея этнаграфіі Санкт-Пецярбурга, мажна ўбачыць летні жаночы сарафан.

Ён шарачковы, стракаты, на лямках, і вельмі падобны на сарафан тыпу саян з прышыўным ліфам, які маглі апранаць дзяўчаты і маладыя жанчыны летняй парой у Расонскім і Верхнядзвінскім раёнах.

Альбом М. Раманюка з мастацка-графічнай рэканструкцыяй Расонскага строя сведчаць аб тым, што паясное адзенне маладой жанчыны сваі знешнім выглядам падобнае на рускі касаклінны распашны сарафан, з зашытым разрэзам, а па шву нашыты петлі і гузікі, каб імітаваць засцежку.

Вось якое тлумачэнне можна знайсці ў Г. Маславай: «Шили сарафан-клинник из одноцветной холщёвой или шерстяной ткани, крашеной в чёрный или синий цвет, или из китайки- синей бумажной материи или кумача, ... значительно реже из набойки..., украшали спереди вдоль разреза или шва и на подоле нашивали из красного шнура...

Разные типы сарафанов в XVIII в были перенесены русскими старообрядцами в разные местности России, в том числа на Украину и в Белоруссию… У белорусов сарафаны встречаются только в районах, пограничных с великорусскими…».

Са старажытных часоў захавалася традыцыя пакрываць валасы хусткай (платам). Само слова «плат» Л. Нідэрле адносіць да тэрмінаў, якія выяўляюць старажытнаславянскую традыцыю. Аб гэтай традыцыі пісаў С. Стрэкалаў: «Девицы у славян ходили с непокрытой головой, так, что всякий мог их увидеть, кто чувствовал наклонность к какой либо из них, тот бросал ей покрывало на голову и она становилась его женою без всякого прекословия.»

Галаўны ўбор у традыцыйным касцюме беларусаў у XIX ст. з'яўляўся важнай этнавызначальнай і маркіруючай формай жаночага касцюма. Жанчыны пакрывалі галаву, закрываючы валасы поўнасцю, а дзяўчата мелі магчымасць з'яўляцца на людзях з непакрытай галавой і не заплеценымі ў косы валасамі.

Зараз разгледзім цікавы і вельмі прыгожы галаўны ўбор маладой жанчыны Расонскага строю, які бачым у альбоме М. Раманюка. Як піша Л. Маленка: «У жаночыя галаўныя ўборы ўваходзяць: група ручніковых (намётка – намітка; скіндачка, павівала і шырынка), атрыманыя на аснове хусткі, кроеныя або вязаныя (чапец, каптур, павойнік, зборнік), зробленыя на цвёрдай аснове (вянцы). Пры гэтым форма аднаго голаўнога убору стварылася спалучэннем (наміткі і чапца з дапамогай каркаснай канструкцыі).

У Н. Нікіфароўскага пра такі галаўны ўбор напісана: «Благодаря соседству старообрядческих женщин (в. Лавож и в. Жарцы Полацкага у-ду), употребляющих весьма изящную головную повязку, где совмещается чепчик и платок, и тамошния белорусские нарядницы пользуются той же повязкой. Приготовлением последней, заведуют отдельные модистки по мере головы они складывают головной платок «валосник» шапочкою и сшивают, причём концы платка складываются в изящно расположеных складках.»

Такім чынам, можна сцвяржаць, што галоўную частку разглядаемага убора складае хустка (крамная), якая аблягае

галаву ў выглядзе чапца, канцы яе прыгожа задрапіраваны ззаду, а над ілбом даматканая на цвёрдай аснове ўстаўка. Яна прамавугольнай формы і зроблена асобна.

Геаметрычны арнамент можа быць ткань ці вышыты. У верхніх вуглах устаўкі два вялікіх ніцяных каляровых пампоны.

Самы галоўны прадмет жаночага паяснога адзення – кашуля. Разглядзім два асноўных тыпы кашулі.

Г.С. Маслова азначае, што «тип женской рубахи, со вставками-поликами на плечах, с рукавами и собранным воротником были характерным для всех трех восточно-славянских народов, что отличало их женский костюм от многих финно-тюркоязычных соседей». Шырока вядомы пакрой сарочкі з «гесткамі». Як піша Л.А. Малчанава аб такім крої: «...основной материал пришивался вверху к неширокой кокетке. Материал, который пришивался к кокетке, собирался в сборку спериди и сзади, а иногда только спериди. Кокетка имела только плечевые швы, или просто материал перегибался, как при туникоподобном покрое. Такие сорочки часто не имели воротники. Горловина обшивалась тем же холстом, и передний разрез около шеи застёгивался на пуговицу – «гузік» или запонку – «шпонку». Края разреза – «пазухі», расположенного обычно спереди, обшивались – «заделывались» узкой подшивкой.»

Тып і крой такіх кашуль, для прыкладу, ма можам убачыць у Лепельскім краязнаўчым музеі, абласным Віцебскім краязнаўчым музеі, у экспазіцыі музея ткацтва НПГКМЗ. Усе элементы кашулі маюць у сваёй аснове такія геаметрычныя формы- квадрат, прамавугольнік, круг. Гэта робіць адзенне практычна безразмерным, ідэальна прыстасаваным для нашэння некалькімі пакаленнямі. Таму што святочнае адзенне ўпрыгожвалася больш багата і патрабавала вялікіх затрат ручной работы і каштоўных матэрыялаў для ткацтва і вышыўкі.

# Канцэпцыя экспазіцыі, прысвечынай гісторыі Полацкага езуіцкага калегіума

***Т.У. Явіч***

На сённяшні дзень экспазіцыя Полацкай мастацкай галерэі дае магчымасць пазнаёміцца з гісторыяй культавага мастацтва Беларусі XI-XVIII стст., з гісторыяй развіцця беларускага мастацтва XX ст., убачыць творы лепшых сучасных беларускіх мастакоў.

Між тым, Полацкая мастацкая галерэя размяшчаецца ў адным з карпусоў архітэктурнага ансамбля XVIII ст., які вядомы – спачатку як Полацкі езуіцкі калегіум, што дзейнічаў у горадзе з 1580 г., потым – як Полацкая езуіцкая акадэмія (1812-1820), затым – як піярская вучэльня (1822-1829), нарэшце – кадэцкі корпус (1835-1915).

Акрамя таго, Полацкі езуіцкі калегіум, а пазней езуіцкая акадэмія адыгрывалі ўвесь час свайго існавання ролю буйнога культурнага цэнтра: тут дзейнічалі тэатр, музычная бурса, існавалі бібліятэка, друкарня, а з 1788 г. – музей, у склад якога ўваходзіла і карцінная галерэя, якая валодала як выдатнымі творамі заходнееўрапейскага мастацтва, сярод якіх палотны Сальватора Розы з Вероны, польскага мастака Сымона Чаховіча, Ігнація Дораці, магчыма нават Пауля Рубенса, так і творамі полацкіх айцоў-езуітаў, атрымаўшых мастацкую адукацыю ў Еўропе.

На працягу стагоддзяў у Полацкім езуіцкім калегіўме (акадэміі) выкладалі малюнак і жывапіс таленавітым вучням, што ў нямалай ступені садзейнічала складанню к сярэдзіне XVIII ст. тут так званай Полацкай мастацкай школы.

У свеце ўсяго вышейсказанага падаецца неабходным стварэнне ў мастацкай галерэі асобнага раздзела, асноўнымі мэтамі якога з’яўляецца: выразна данесці да наведвальніка інфармацыю аб надзвычайнай сацыяльна-гістарычнай значнасці полацкай рэзідэнцыі езуітаў, аб маштабах яе культурна-асветніцкай дзейнасці, грандыёзнасці архітэктурнага ансамбля, які адыгрываў дамінантную ролю ў горадабудаўнічай сітуацыі, і,

нарэшце, што багатыя мастацкія традыцыі сённяшнега Полацка бяруць пачатак у далёкім XVIII ст.

Як мяркуецца, раздзел гэты размесціцца ў цокальным паверсе ў трох нішах, агульная плошча якіх складае прыкладна____м/кв.

Асноўны характар плануемага раздзела–інфармацыйны. Асноўны метад раскрыцця тэмы: комплексна-тэматычны (праз паказ асобных дакументаў, фотадакументаў, выяўленчых матэрыялаў, тлумачальных тэкстаў). У дадзенай канцэпцыі прапаноўваецца тры такіх комплекса.

Тэма 1. «Комплекс былога Полацкага езуіцкага калегіума як помнік архітэктуры».

Вядома, што каменныя карпусы калегіума пачалі ўзводзіцца з 1747-49 гг. Першы з іх, у якім і месціцца сёння галерэя, быў пабудаваны пад кіраўніцтвам архітэктара Якуба Руофа. Будаўніцтва новых карпусоў працягвалася да пачатку XIX ст., калі мураваны полацкі калегіум стаў самым вялікім сярод манастыроў Беларусі (агульная плошча 7180 м/кв). У самім Полацку яго называлі «горад ў горадзе».

Візуальны рад гэтага тэматычнага комплекса будзе ўтрымліваць:

- план ансамблю калегіума паводле абмераў 1828 г. – паштоўкі пач. XX ст. і фотадакументы, якія адлюстроўваюць як агульны, панарамны выгляд калегіума, так і асобныя яго будынкі. – праект будынкаў Полацкага езуіцкага калегіума паводле малюнка Габрыэля Грубера 1785 г.

Тэма 2. «Гісторыя комплекса як адукацыйнага цэнтра».

Рэзідэнцыя езуітаў у Полацку заснавана ў 1579 г. А ўжо летам 1580 г. пад патранатам Стэфана Баторыя і намаганнямі вядомага езуіта, палеміста і прапаведніка Пятра Скаргі тут быў заснаваны калегіум – першая сярэдняя навучальная ўстанова ордэна езуітаў на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Гэта была пяцікласная гімназія філалагічна-тэалагічнага профілю, дзе выкладаліся лацінская і грэчаскія мовы, рыторыка, паэтыка, антычная літаратура і Свяшчэннае Пісанне.

Першапачаткова калегіум размясціўся на востраве Дзвіны, дзе раней быў манастыр Іаана Прадцечы, адкуль быў перанесен у 1598г. на Ніжні замак..

На базе калегіума ў 1812 г. была створана вышэйшая навучальная ўстанова – Полацкая езуіцкая акадэмія. Было значна пашырана кола дысцыплін, якія выкладаліся, і арганізаваны тры факультэты: тэалагічны, моваў і літаратур, філасофіі і вольных мастацтваў. У 1820 г. акадэмія была зачынена ў сувязі з выгнаннем езуітаў з тэрыторыі Расійскай імперыі. Маёмасць езуітаў была перададзена ордэну піяраў, якія валодалі ёй да 1829 г. З 1835 г. будынкі былога калегіўма займае кадэцкі корпус.

Мяркуемы візуальны рад уключае:

- муляж данацыйнага акта Ст. Баторыя 1582 г. (побач з перакладам на беларускую мову асноўных палажэнняў гэтага дакумента);
- партрэт Ст. Баторыя (магчыма, партрэт П. Скаргі);
- карта Полацка з адлюстраваным на ёй востравам і Ніжнім замкам;
- медальён з выявай Ігнацfolowing Лайолы (заснавальніка ордэну езуітаў) з фондаў запаведніка;
- асноўныя палажэнні Устава Акадэміі;
- паштоўкі пач. 20 ст.якія адлюстроўваюць штодзённае жыццё выхаванцаўкадэцкага корпуса;

Тэма 3. «Карцінная галерэя полацкіх езуітаў» і тут жа «Вядомыя мастакі-навучэнцы Полацкага езуіцкага калегіўма (акадэміі)».

Магчымая экспанатура ўключае:

- партрэт Габрыеля Грубера – стваральніка музея, галерэі, аўтара фрэскавых роспісаў у гэтай галерэі і шматлікіх малюнкаў з яе калекцыі, настаўніка малюнка і жывапісу ў калегіуме – гіпсавыя копіі медаляў Ф. Талстога – вучня Г. Грубера – рэпрадукцыі (копіі) твораў В. Ваньковіча, Р. Слізеня, К. Бароўскага, А. Нядзвецкага – вядомых мастакоў, якія пачатковую мастацкую адукацыю атрымалі ў полацкіх езуітаў – рэпрадукцыя (копія) малюнка Г. Грубера

# Агляд калекцый,
# каталогі прадметаў
# з фондаў НПГКМЗ

# Газеты ў фондах НПГКМЗ

*І.П. Воднева*

## КАТАЛОГ. Частка II.

## Газеты 1917-1940 гг., надрукаваныя на тэрыторыі Беларусі.

Развіццё перыядычнага друку на Беларусі ў 1917-1940-х гг. мела свае асаблівасці. Падчас рэвалюцыйных падзей 1917г. з'явіліся выданні нацыянальна-дэмакратычнага перыяду, такія як «**Вольная Беларусь**», «**Беларускі шлях**» (1918 г.). Газета стала дзейсным сродкам барацьбы розных партый за пашырэнне сваіх ідэй. Шмат матэрыялаў на гэтыя тэмы друкавалася ў такіх газетах, як «**Звезда**», «**День**», «**Минский голос**», «**Вестник Минского губернского комиссариата**», «**Витебский листок**» і інш. Большасць выданняў было рускамоўных. Свае газеты выдавалі Саветы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў: «**Известия Минского Совета рабочих и солдатских депутатов**», «**Известия Армейского совета солдатских депутатов 3 армии Полоцкого совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов**» і інш.

У сакавіку 1918 г. пачала выдавацца першае пралетарскае выданне на беларускай мове – газета «**Дзянніца**». Змест газеты вызначаўся матэрыяламі па пытаннях рэвалюцыйнага руху працоўных Беларусі, артыкуламі на агульнапалітычныя, эканамічныя і нацыянальныя тэмы. Газета змяшчала мастацкі аддзел, афіцыйны, палітычныя фельетоны, хроніку і паведамленні.

У гады грамадзянскай вайны друк Беларусі працягваў сваё развіццё. Ва ўмовах неверагоднай разрухі і жорсткіх баёў з інтэрвентамі газеты імкнуліся быць бліжэй да падзей, якія адбываліся як на фронце, так і ў тыле. У розных гарадах рэспублікі выдаваліся «**Известия военно-революционного комитета Социалистического Совета Республики Беларусь**» (Мінск), «**Набат**» (Орша), «**Соха і молот**» (Магілёў) і інш.

З пачаткам мірнага будаўніцтва ў 1920 г. створана шырокая сетка газет, якія з'ўляліся афіцыйнымі органамі

Саветаў і партыйных калектываў усіх узроўняў. У іх пісалі пра калектывізацыю і гаспадарку краіны, пра тое новае, што з'яўлялася ў жыцці працоўных мас. Шырока прапагандаваліся задачы першых пяцігодак (1928-1932, 1933-1937, 1938-1941). Друк стаў ініцыятарам масавага сацыялістычнага спаборніцтва, новых форм яго арганізацыі. Газеты адводзілі цэлыя старонкі пад справаздачы аб сходах на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах. У Мінску выходзілі газеты «**Беларуская вёска**», «**Рабочий**» (у будучым «**Советская Белоруссия**»), «**Красная смена**» (потым «**Чырвоная змена**»); у Віцебску – «**Заря Запада**» (з 192 г. – «**Віцебскі рабочы**») і інш. У 1925 г. у БССР выдавалася 42 газеты разавым тыражом 200 тыс. экзэмпляраў.

У 20-я г. падчас беларусізацыі большасць цэнтральных і мясцовых газет была пераведзена на беларускую мову. Развіваўся нізавы друк. Выдаваліся акружныя газеты – органы акружных камітэтаў КП(б)Б і аргвыканкамаў: «**Віцебская сялянская газета**», «**Віцебскі пралетарый**», «**Чырвоная Полаччына**» і інш. У 1930-х гг. на базе беларускіх акруговых, шматтыражных калгасна-саўгасных і некаторых фабрычных газет пачалі выходзіць раённыя.

Да пачатку 1933 г. на Беларусі выдавалася 201 газета гадавым тыражом 113,5 млн. экзэмпляраў, у тым ліку 13 цэнтральных, 75 раённых (па адной у кожным раёне) і 113 шматтыражных З 13 цэнтральных – 8 газет выходзіла на беларускай мове, 2 – на яўрэйскай, 1 – на польскай, 1 – на літоўскай. Гадавы тыраж іх раўняўся 58 681,6 тыс. экзэмпляраў. Тыраж раённых газет – 46 476 тыс. экзэмпляраў. 74 газеты выходзілі на беларускай мове, 1 на польскай. З 113 шматтыражных газет – 77 на беларускай мове, 5 – на рускай і 31 – на змешанай. Гадавы тыраж – 8 386 тыс. экзэмпляраў.

З утварэннем абласцей у 1938 г. пачалі выходзіць абласныя газеты.

У гады трэцяй пяцігодкі (1938-1941) умацоўваецца роля партыйна-савецкага друку. Больш увагі надаецца пастановам ЦК КП(б)Б, з'ездам, пленумам, вядзецца прапаганда марксізму-ленінізму. Шмат друкуецца тэарэтычных артыкулаў, гутарак, адказаў на лісты чытачоў. Удзяляецца ўвага пытанням жыцця Чырвонай Арміі, падрыхтоўкі моладзі да службы

ў ёй. Газеты друкуюць міжнародныя агляды, тэлеграмы з-за мяжы, падкрэсліваючы асаблівасці жыцця і барацьбы супраць германскага фашызму. У 1940 г. у БССР выходзіла 252 газеты гадавым тыражом 192,7 тыс. экзэмпляраў.

Шмат газет розных партый і рухаў у 1921-1939 гг. выдавалася і на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Сярод іх такія як: «**Беларускія Ведамасці**», «**Бальшавік**», «**Вольны сцяг**», «**Малады камуніст**», «**Новы шлях**» і інш. Друк Кампартыі Зах. Беларусі (КПЗБ) шырока асвятляў забастовачны рух, выступаючы ў якасці арганізатара многіх стачак і забастовак. Газеты выкрывалі здрадніцкую палітыку ўрада Пілсудскага, вялі барацьбу за школы на роднай мове, выступалі супраць вайны, асвятлялі жыццё арміі, працу прафсаюзаў. Большасць газет Зах.Беларусі выдавалася ў Вільні.

У фондах НПГКМЗ дадзены перыяд прадстаўлены 23 адзінкамі асноўнага фонду. Гэта нашы полацкія выданні. З 3.01.1918 г. па 17 лютага 1918 г. Армейскім Саветам салдацкіх дэпутатаў III Арміі і Полацкім Саветам рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў выдаваліся «**Известия армейского Совета солдатских депутатов 3-й армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов**». У каталог увайшло 20 нумароў дадзенага выдання. Пасля вызвалення горада ад нямецкіх захопнікаў, падчас Першай сусветнай вайны, у лістападзе 1918 г. пачалі працаваць павятовы выканкам і ВРС. Іх друкаваным органам стала «**Красная газета**», якая з 19 снежня стала выходзіць пад новай назвай – «**Известия полоцкого уездного совета рабочих, крестьянских, батрацких и красноармейских депутатов**». Адзін нумар за 29 ліпеня 1919 г. увайшоў у каталог.

Полацкія выданні часта мянялі свае назвы. З 1926 г. па 1936г. органам Полацкага Райкама КП(б)Б, Райвыканкама і Райпрафсавета стала газета «**Чырвоная Полаччына**». 2 нумары за 1934г. увайшлі ў дадзены каталог.

Дадзеныя выданні экспануюцца ў розных музеях НПГКМЗ: МБК-3, ПКМ-1; шырока выкарыстоўваюцца на выставах.

**1. «Известия армейского Совета солдатских депутатов 3-й армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов»** № 1, 3.01.1918 г. Рэдакцыйная Камісія. Друкарня штаба III арміі. Полацк, 1918 г.

«Декрет о введении новаго правописанія», с. 3.

**ПИАЗ КП7-3828**

Бальшавіцкая газета, якая выдавалася з лістапада 1917 г. да лютага 1918 г. у Полацку на рускай мове 5-6 разоў на тыдзень. З № 32 (26.12.1917) выходзіла пад назвай «Известия армейского Совета солдатских депутатов III армии», а з 3(16).1.1918 г. «Известия армейского Совета солдатских депутатов III армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов». Рэдактары А. Свадкоўскі (эсэр-максіміліст) і М. Цароў ( бальшавік). Як выданне бальшавіцкага кірунку актыўна прапагандавала дэкрэты 2-га Усерасійскага з'езда Саветаў, усхваляла кастрычніцкі пераварот. Друкавала загады і распараджэнні ВРК, асобныя пісьмы ў падтрымку новай улады. Асвятляла дзейнасць вайсковых арганізацый, працу 3-га Надзвычайнага з'езда III арміі і 2-га Надзвычайнага з'езда салдат і сялян III арміі. Апошні вядомы нумар ад 17.02.1918 г.

**2. «Известия армейского Совета солдатских депутатов 3-й армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов»** № 2, 4.01.1918 г. Рэдакцыйная Камісія. Друкарня штаба III арміі. Полацк, 1918 г.

Заклік старшыні бюро армейскага камітэта 3 арміі Івана Андрэева «Ко всем организациям РСДРП (большевиков)», с.1.

Аб'ява пра двухтыднёвы часопіс «Вестник Ротных Фельдшеров», с. 3.

**ПИАЗ КП7-3831**

**3. «Известия армейского Совета солдатских депутатов 3-й армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов»** № 4, 6.01.1918 г. Рэдакцыйная Камісія. Друкарня штаба III арміі. Полацк, 1918 г.

**ПИАЗ КП7-3829**

**4. «Известия армейского Совета солдатских депутатов 3-й армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов»** № 5, 10.01.1918 г. Рэдакцыйная Камісія. Друкарня штаба III арміі. Полацк, 1918 г.

«Полоцкая жизнь. Хроника.» Паведамленне пра ліквідацыю судовых пастаноў па гораду Рэвалюцыйным трыбуналам…, с. 3.

**ПИАЗ КП7-3830**

**5. «Известия армейского Совета солдатских депутатов 3-й армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов»** № 7, 12.01.1918 г. Рэдакцыйная Камісія. Друкарня штаба III арміі. Полацк, 1918 г.

Паведамленні пра Першы Полацкі Павятовы З'езд Сялянскіх, Рабочых і Салдацкіх дэпутатаў, які адбываўся 28.01.1918 г., с. 1-2.

**ПИАЗ КП7-3974**

**6. «Известия армейского Совета солдатских депутатов 3-й армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов»** № 8, 13.01.1918 г. Рэдакцыйная Камісія. Друкарня штаба III арміі. Полацк, 1918 г.

Паведамленні пра Першы Полацкі Павятовы З'езд Сялянскіх, Рабочых і Салдацкіх дэпутатаў, які адбываўся 28.01.1918 г.

**ПИАЗ КП7-3975**

**7. «Известия армейского Совета солдатских депутатов 3-й армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов»** № 8, 13.01.1918 г. Рэдакцыйная Камісія. Друкарня штаба III арміі. Полацк, 1918 г.

«Третий Всероссийский съезд Советов Рабочих и Солдатских депутатов. Заседание 10-го января.», с. 2-3.

**ПИАЗ КП7-3832**

**8. «Известия армейского Совета солдатских депутатов 3-й армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов»** № 10, 16.01.1918 г. Рэдакцыйная Камісія. Друкарня штаба III арміі. Полацк, 1918 г.

Паведамленні пра Першы Полацкі Павятовы З'езд Сялянскіх, Рабочых і Салдацкіх дэпутатаў, які адбываўся 28.01.1918 г.

**ПИАЗ КП7-3833**

**9. «Известия армейского Совета солдатских депутатов 3-й армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов»** № 11, 17.01.1918 г. Рэдакцыйная Камісія. Друкарня штаба III арміі. Полацк, 1918 г.

Паведамленні пра Першы Полацкі Павятовы З'езд Сялянскіх, Рабочых і Салдацкіх дэпутатаў, які адбываўся 28.01.1918 г., с. 1.

Паведамленне пра зварот вучняў і іх бацькоў да суда Рэвалюцыйнага трыбунала па пытаннях абмежавання свабодных сходаў, с. 2.

«Декрет Полоцкого Совета Рабочих, Солдатских и Крестьянских Депутатов № 2» ад 14.01.1918 г. за подпісамі:

Старшыня Выканаўчага камітэта Полацкага Савета Р.С. і С. ДэпутатаўЛук'янаў.

Старшыні секцый і камісій:

Ваеннай – Яфрэтаў.

Фінансавай – Чудоўскі.

Гаспадарчай – Ніканораў.

Рэдакцыйнай – Свядзіоўскі.

Прадуктовай – Хамутоў.

Канфліктнай – Ягораў.

Следчай – Собалеў. с. 3.

«Третий Всероссийский съезд Советов Рабочих и Солдатских депутатов. Заседание 10-го января.», с. 3.

**ПИАЗ КП7-3834**

**10. «Известия армейского Совета солдатских депутатов 3-й армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов»** № 12, 18.01.1918 г. Рэдакцыйная Камісія. Друкарня штаба III арміі. Полацк, 1918 г.

Свадкоўскі. «Народные театры», с. 2.

«Третий Всероссийский съезд Советов Рабочих и Солдатских депутатов. Заседание 10-го января.», с. 3.

«В Полоцком Совете Р.С. и Кр. Д». Па шматлікіх пытаннях вынесены наступныя рашэнні: а) выпрацоўка праекта падаходнага падатку, б) штрафаванне самагоншчыкаў і марадзёраў, в) адкрыццё дзіцячага прытулку ў шэрагу дамоў Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра, с. 4.

**ПИАЗ КП7-3835**

**11. «Известия армейского Совета солдатских депутатов 3-й армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов»** № 13, 19.01.1918 г. Рэдакцыйная Камісія. Друкарня штаба III арміі. Полацк, 1918 г.

Паведамленні пра Першы Полацкі Павятовы З'езд Сялянскіх, Рабочых і Салдацкіх дэпутатаў, які адбываўся 28.01.1918 г., с. 1.

«Третий Всероссийский съезд Советов Рабочих и Солдатских депутатов. Заседание 10-го января.», с. 2-3.

**ПИАЗ КП7-3836**

**12. «Известия армейского Совета солдатских депутатов 3-й армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов»** № 14, 20.01.1918 г. Рэдакцыйная Камісія. Друкарня штаба III арміі. Полацк, 1918 г.

Аб'ява пра нараду Культурна-Асветніцкай камісіі Полацкага Савета Рабочых, Салдацкіх і Сялянскіх Дэпутатаў і ўстаноў, якія павінны на яе прыбыць, с. 1.

«Третий Всероссийский съезд Советов Рабочих и Солдатских депутатов. Заседание 10-го января», с. 2.

**ПИАЗ КП7-38367**

**13. «Известия армейского Совета солдатских депутатов 3-й армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов»** № 16, 23.01.1918 г. Рэдакцыйная Камісія. Друкарня штаба III арміі. Полацк, 1918 г.

Гандэльман «О Революционном Трибунале», с.1-2.

**ПИАЗ КП7-3838**

**14. «Известия армейского Совета солдатских депутатов 3-й армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов»** № 17, 24.01.1918 г. Рэдакцыйная Камісія. Друкарня штаба III арміі. Полацк, 1918 г.

Паведамленне пра арганізацыйны збор на Першы Полацкі Павятовы З’езд Сялянскіх, Рабочых і Салдацкіх дэпутатаў, с. 1.

**ПИАЗ КП7-3839**

**15. «Известия армейского Совета солдатских депутатов 3-й армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов»** № 18, 25.01.1918 г. Рэдакцыйная Камісія. Друкарня штаба III арміі. Полацк, 1918 г.

«Приказ по г. Полоцку № 2» (пра выдачу дазволаў на права набыцця, захавання і нашэння зброі), с. 1.

«Приказ по г. Полоцку и уезду № 3» (дадатак да № 1), с. 1.

«Полоцкая жизнь» (паведамленні пра падаткі прадстаўнікоў культурна-асветніцкіх устаноў г.Полацка і пра сход (22.01) працоўных чыгункі г.Полацка), с. 2.

**ПИАЗ КП7-3840**

**16. «Известия армейского Совета солдатских депутатов 3-й армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов»** № 19, 26.01.1918 г. Рэдакцыйная Камісія. Друкарня штаба III арміі. Полацк, 1918 г.

«Обязательное постановление» (пра налогі па гораду, штрафы за вінакурства, пра дазвол на нашэнне зброі), с. 1.

Пералік пытанняў, разглядаемых Рэвалюцыйным трыбуналам, пасяджэнне якога адбудзецца 1.02.1918 г., с. 1.

Паведамленне пра Першы Полацкі Павятовы З’езд Сялянскіх, Рабочых і Салдацкіх дэпутатаў, с. 1.

**ПИАЗ КП7-3841**

**17. «Известия армейского Совета солдатских депутатов 3-й армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов»** № 20, 27.01.1918 г. Рэдакцыйная Камісія. Друкарня штаба III арміі. Полацк, 1918 г.

«Задачи предстоящего съезда Рабочих, Крестьянских и Солдатских Депутатов», с. 1.

«Декрет о введении гос. монополии на объявления», с. 1.

«Резолюция съезда», с. 2.

«Инструкция Полоцкому Совету Рабочих, Солдатских, Крестьянских и Батрацких Депутатов», за подпісам старшыні т. Лук'янава, с. 2.

**ПИАЗ КП7-3842**

**18. «Известия армейского Совета солдатских депутатов 3-й армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов»** № 21, 28.01.1918 г. Рэдакцыйная Камісія. Друкарня штаба III арміі. Полацк, 1918 г.

«Обязательное постановление Верховнаго Совета Северо-Западной области… о воспрещении к распространению всякой буржуазной печати» за подпісам старшыні Вярхоўнага Савета Мармуса, с. 1.

**ПИАЗ КП7-3843**

**19. «Известия армейского Совета солдатских депутатов 3-й армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов»** № 22, 31.01.1918 г. Рэдакцыйная Камісія. Друкарня штаба III арміі. Полацк, 1918 г.

«Аб'ява» (стварэнне калегіі па фарміраванні рабочай і сялянскай Чырвонай Арміі), с. 1.

«Приказ Главнокомандующего Армиями Западного Фронта» (аб падпісанні мірнага дагавора паміж Расіяй і краінамі Антанты), с. 1-2.

Матэрыялы пра Першы Полацкі Павятовы З'езд Сялянскіх, Рабочых , Салдацкіх і Батрацкіх Дэпутатаў, с. 1.

**ПИАЗ КП7-3844**

**20. «Известия армейского Совета солдатских депутатов 3-й армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов»** № 24, 15.02.1918 г. Рэдакцыйная Камісія. Друкарня штаба III арміі. Полацк, 1918 г.

Паведамленні пра пасяджэнні Рэвалюцыйнага Трыбунала з 2.02. па 7.02.1918 г., с. 2.

**ПИАЗ КП7-3845**

**21.** «**Известия Полоцкого Уездного Совета Рабочих, Крестьянских, Батрацких и Красноармейских депутатов**» № 195, 29.07.1919 г. Рэдакцыйная Камісія. Полацкі Павятовы Выканкам. Полацк, 1919 г.

«Оперативная сводка от 26 июля (РОСТА). Западный фронт.» (звесткі пра чыгунку Пскоў-Полацк), с. 2.

Ільін «К предстоящей конференции культурно-просветительных организаций Полоцкого гарнизона»,с. 2-3.

**ПИАЗ КП5-2332**

«Известия Полоцкого Уездного Совета Рабочих, Крестьянских, Батрацких и Красноармейских депутатов»

Газета, орган Полацкага павятовага выканкама. Выдавалася ў Полацку з 19.12 1918 г. па 16.08.1919 г. (№ 211) на рускай мове. Пасля вызвалення горада ад нямецкіх захопнікаў у лістападзе 1918 г. пачалі працаваць павятовы выканкам і ВРС. Іх друкаваным органам стала «Красная газета». Павятовы камітэт РКП(б) зацвердзіў рэдакцыйную калегію ў складзе Кабаніхіна, Шпаера, Падалкі. У распараджэнне газеты было перададзена абсталяванне прыватных друкарняў горада. Першы нумар выйшаў 22 снежня 1918 г. З № 24 газета стала выходзіць пад новай назвай – «Известия Полоцкого Уездного Совета Рабочих, Крестьянских, Батрацких и Красноармейских депутатов». Выданне асвятляла дзейнасць мясцовай улады па аднаўленні мірнага жыцця ў горадзе, друкавала загады і распараджэнні ўлад, асвятляла падзеі на фронце. Праз 8 месяцаў левабярэжная частка горада была захоплена белапалякамі. Рэдакцыя газеты была эвакуіравана на ст. Дрэтунь Полацкага раёна. І з лістапада 1919г. ужо пад новай назвай – «Октябрьское эхо» – пачала нанава сваё жыццё.

**22.** «**Чырвоная Полаччына**» № 6 (1242), 12.01.1934 г. Рэд. – Рабіновіч А. Друкарня «Чырвонай Полаччыны». Полацк, 1934 г.

«Пастанова III раённай партканферэнцыі па дакладу ЦК КП(б)Б, с. 1.

Матэрыялы, прысвечаныя III раённай партканферэнцыі, с. 1.

Самуйлёнак Э. «Па-новаму жыць, па-новаму работаць», с. 2.

Матэрыялы, прысвечаныя лесанарыхтоўкам і лесавывазам, с. 2.

**ПГКМЗ КП14-11606**

Газета, якая выдавалася з 1926 па 1936 гг. у Полацку на беларускай мове. З'яўлялася органам Полацкага Райкама КП(б)Б, Райвыканкама і Райпрафсавета. Рэдактар А. Рабіновіч. Газета змяшчала артыкулы на тэмы сацыялістычнага будаўніцтва, дзе кіруючая роля адводзілася камуністычнай партыі, барацьбы за рэжым эканоміі. Друкавала пастановы ЦК, з'ездаў, пасяджэнняў. Асвятляла жыццё прадпрыемстваў і калгасаў Полаччыны. На старонках газеты свой літаратурны шлях пачыналі П. Броўка (1926 г., верш «Ой, не шепчи, моя берёзка»), Э. Самуйлёнак (1928 г., аповесць «Теория Каленбрум»), Т. Хадкевіч.

**23.** «**Чырвоная Полаччына**» № 7 (1243), 15.01.1934 г. Рэд. – Рабіновіч А. Друкарня «Чырвонай Полаччыны». Полацк, 1934 г.

Матэрыялы, прысвечаныя III раённай партканферэнцыі, с. 1.

«Справаздача Раённага Камітэта КП(б)» (даклад т. Турлая), с. 2-3.

**ПГКМЗ КП14-116065**

**Літаратура**

1. **Булацкі Р.В.** Гісторыя беларускай журналістыкі. Мн., 1979.

2. **Полоцк. Исторический очерк.** Мн.: Наука і тэхніка, 1987.

3. **Марцелев С.В.** Печать советской Белоруссии. Мн., 1967.

4. **Энцыклапедыя гісторыі Беларусі**. У 6 т. Т. 2. Мн., 1985.

5. **Памяць. Гістарычна-дакументальная хроніка Полацка.** Мн., 1996.

# Каталог польскамоўных часопісаў «Вэндровец», «Край» і «Земя» ў фондах НПГКМЗ

*Г.П. Зуева*

Сярод польскамоўных часопісаў XIX – першай пал. XX стст., якія захоўваюцца ў фондах НПГКМЗ, значную колькасць складаюць часопісы «Вэндровец», «Край» і «Земя».Калекцыя гэтых часопісаў налічвае 13 адзінак (з іх 10 падшывак і 3 асобныя нумары).Усе гэтыя часопісы былі перададзены ў фонды НПГКМЗ у 1991 годзе з бібліятэкі Саюза мастакоў БССР, г. Мінск.

«Вэндровец» («Wêdrowiec») – польскі ілюстраваны часопіс-штотыднёвік, выдаваўся ў Варшаве з 1862 года. У фондах запаведніка захоўваюцца 2 падшыўкі за 1889 г. і 1896 г. (па 20 і 26 нумароў адпаведна ў кожнай падшыўцы). Першым выдаўцом і друкаром «Вэндроўца» быў даволі вядомы чалавек у выдавецкай справе Польшчы Юзаф Унгэр, а першым рэдактарам – Ф.Сулімерскі. Па зместу «Вэндровец» можна назваць навукова-папулярным і літаратурна-мастацкім часопісам. У ім змяшчаліся апісанні падарожжаў па розных краінах, у тым ліку і ўсходнеславянскіх, апісанні мясцовасцей, звычаяў, традыцый і абрадаў розных народаў. Друкаваліся ў часопісе і навуковыя, літаратуразнаўчыя, мастацтвазнаўчыя артыкулы, артыкулы, прысвечаныя новым адкрыццям і вынаходніцтвам, а таксама матэрыялы па філасофіі, псіхалогіі, медыцыне. У часопісе змяшчаліся палітычныя навіны, біяграфіі вядомых дзеячаў, літаратурна-мастацкія творы.

Іншым па афармленні і па зместу быў часопіс «Край» («Kraj»). «Край» – польскі штотыднёвы грамадска-палітычны часопіс. Выдаваўся ў Пецярбургу ў 1882-1909 гг. на польскай мове. Значнае месца адводзіў агляду палітычных , знешнепалітычных , эканамічных навін, матэрыялам з гісторыі, культуры, навукі. Пэўную цікавасць прадстаўляе рубрыка «Весткі з правінцыі», у якой змяшчаліся навіны з Вільні, Смаргоні, Віцебска, Нясвіжа, Магілёва, Камянца, Гомеля і іншых беларускіх гарадоў. Часопіс меў дадаткі «Przegląd

literacki» («Літаратурны агляд») і «Dział artystyczno-literacki» («Літаратурна- мастацкі аддзел»), у якіх друкаваліся творы пісьменнікаў і паэтаў. У фондах НПГКМЗ захоўваецца ўсяго адна падшыўка часопіса «Край» за 1897год (19 нумароў у падшыўцы).

Найбольшую колькасць калекцыі складае часопіс «Земя» («Ziemia»). «Земя» – краязнаўчы ілюстраваны часопіс-штомесячнік, орган Польскага краязнаўчага таварыства. Выдаваўся ў 1910-1914, 1919-1920, 1922-1950 гадах у Варшаве на польскай мове. У фондах НПГКМЗ захоўваюцца як асобныя нумары так і падшыўкі па 12 нумароў за 1913, 1920, 1922, 1923, 1932, 1935, 1937, 1938 гады.Выдаўцом гэтага часопіса было Польскае краязнаўчае таварыства, створанае ў Варшаве ў 1906 годзе пад старшынствам Зыгмунта Глогера – польскага археолага, этнографа. У многіх гарадах Заходняй Беларусі існавалі філіялы Польскага краязнаўчага таварыства: Баранавічах, Брэсце, Гродна, Кобрыне, Лідзе, Навагрудку, Нясвіжы, Пінску, Браславе, Глыбокім і інш. Часопіс «Земя» сістэматычна друкаваў справаздачы аб дзейнасці гэтых філіялаў. Акрамя гэтага, часопіс друкаваў: даследванні па гісторыі матэрыяльнай і духоўнай культуры польскага, беларускага, украінскага, літоўскага, рускага і іншых народаў; нарысы, успаміны, біяграфіі дзеячаў навукі і культуры; апісанні палацава-замкавых комплексаў, культавых збудаванняў, памятных мясцін, помнікаў гісторыі, гарадскіх і сельскіх ландшафтаў; матэрыялы пра з’езды славянскіх географаў і этнографаў, турысцкіх таварystваў, турыстычныя кангрэсы; рабіў агляды краязнаўчай, этнаграфічнай літаратуры. На старонках часопіса змяшчаліся карты, планы, рэпрадукцыі карцін, здымкі жыхароў розных этнаграфічных мясцін, помнікаў архітэктуры, узораў нацыянальнага адзення. Вельмі цікавай з’яўляецца рубрыка «Музейны агляд», у якой змяшчаліся матэрыялы пра розныя музеі на тэрыторыі Польшчы і прылягаючых землях.

Такім чынам , часопісы «Вэндровец», «Край» і «Земя» маюць інфармацыйную каштоўнасць. Значэнне часопісаў ў тым, што яны змяшчалі матэрыялы пра беларускія землі. У многіх з іх Беларусь разглядалася як «крэсы ўсходнія» Польшчы, але, безумоўна, інфармацыйная база гэтых выданняў

надзвычай цікавая. Больш падрабязную інфармацыю пра часопісы будзе ўтрымліваць каталог.

У аснову структурнай пабудовы каталога пакладзены храналагічны прынцып.

Бібліяграфічнае апісанне ў каталогу складаецца з наступных частак:

**1.** Парадкавы нумар.
**2.** Назва.
**3.** Нумары часопісаў.
**4.** Рэдактар, выдавец, друкар.
**5.** Месца друку, год выдання, колькасць старонак.
**6.** Змест.
**7.** Захаванасць.
**8.** Матэрыялы, тэхніка, памеры.
**9.** Уліковы нумар.

Імёны і прозвішчы рэдактараў, выдаўцоў і друкароў падаюцца на беларускай мове, а ў дужках – на польскай.

У рубрыцы «Захаванасць» указваюцца толькі страты.

**1.** Вэндровец. Падшыўка №№ 23-42. Рэдактар і выдавец №№ 23-37 Вацлаў Галявінскі (Wacław Holewiński). Рэдактар і выдавец №№ 38-42 Сатурнін Сікорскі (Saturnin Sikorski). Друк №№ 23-35 Завішэўскага (Zawiszewskiego). Друк №№ 36-42 С. Сікорскага (S. Sikorskiego). Варшава. 1889. 232 с.

*Змест.*

1) Часопісы падшыўкі змяшчаюць артыкулы наступнай тэматыкі:апісанні мясцовасцей, гістарычных мясцін, цікавых падзей; апісанні звычаяў, абрадаў, традыцый розных народаў; апісанні новых адкрыццяў і вынаходніцтваў; навукова-папулярныя, гістарычныя, літаратуразнаўчыя артыкулы; артыкулы па медыцыне, педагогіцы і інш. Сярод іх: «У краіне сфінксаў і мумій» (J.G.)*; «Усеагульная выстава ў Парыжы ў 1889 годзе»; «Прадказанні надвор’я па паводзінах жывёл»; «Аб выкарыстанні натуральных крыніц сілы для вытворчасці электраэнергіі»; «Гісторыя развіцця прылад працы» (W.W.);

* У дужках указваюцца крыптанімы, пад якімі друкаваліся артыкулы.

«Розныя звычаі пры народзінах дзяцей» (Z.G.); Г. Лейган «З аўстралійскіх легендаў»; «Школа ў Японіі»; Л. Сімонін «Вялікі тунэль у Альпах»; «Зямны шар, зменшаны да адной мільённай долі»; «Чорнае золата»; «Фатаграфія без фатографа»; «Адзін дзень у Бухарэсце»; «Фотаздымкі маланак» (Z.G.); «Алкагольныя напіткі і жанчыны»; «Павільёны ў Парыжы»; «Змеі ў Індыі»; «Які спосаб пісьма няшкодны для вачэй»; «Асновы арабскай мовы (успаміны з падарожжа)»; «Выміраючыя плямёны»; «Астранамічныя феномены»; «З'езд паэтаў у Танкіне»; «Мёртвае мора»; «Скачкі з-пад аблокаў»; «Томас Алва Эдзісан»; «Польскія вандроўнікі»; «Уплыў магнітызму на чалавечае цела»; «Паравы пакаёвы рухавік»; «На другім паўшар'і (успаміны з падарожжа па Амерыцы)»; «Вялікая сібірская чыгунка»; «Абязбольванне нервовых канчаткаў»; «Вытворчасць нітрагліцэрыну»; «Абразкі з Босніі»; «Першыя рамеснікі»; Р. Гарбе «Жыццё еўрапейцаў у Індыі»; «Разумовыя здольнасці ў звяроў»; «Машына для кідання бомб»; «Выбухі вулканаў» і інш.

2) Літаратурна-мастацкія творы. Сярод іх: гумарэска «Дамоклаў меч» (Leon Ch.); навела «Драма ў тунэлі» (L.F.) Ф.Мазурніч «Дробныя ліcткі»; аповесць С. Кандратовіча «Знішчаная спадчына»; навела Лерміна «Залатая аповесць»; навела П. Маёля «Баль людаедаў»; Е. Онек «Без пасагу»; вершы А. Опмана, А. Немаеўскага і інш.

*Захаванасць*: страчаны фрагмент с. 401-402 (10,9х9,5 см), с. 437-440, 501-504.*

Папера, кардон, тканіна, скура.

Тыпаграфскі друк.

38,5х29,8х1,5(58,2) см.

**ПГКЗ КП12-6965**

**2.** Вэндровец. Падшыўка №№ 1-26. Рэдактар і выдавец Сатурнін Сікорскі (Saturnin Sikorski). Друкакарня С. Сікорскага. Варшава. 1896. 462 с.

*Змест.*

1) Пастаянныя рубрыкі: «Новыя вынаходніцтвы»; Святло і цені»; «На белым свеце» (навіны з розных краін); «Партфель

* Нумарацыя старонак у падшыўцы пачынаецца з 265 с.

Вэндроўца» (розныя навіны, цікавыя падзеі); «Практычныя парады».

2) Біяграфіі: Эдвард Любоўскі, Фелікс Езяранскі, Францішак Яўдыньскі, Фрыдрых Нансен, Станіслаў Яховіч,Вінцэнт Вадзіноўскі, Міхал Навадворскі.

3) Артыкулы на розную тэматыку: Ю. Завадскі «З-пад Балтыкі» (нататкі з падарожжа); «Нашы гравюры» ; «Спадарожнік для купленых кніжак»; З. Наскоўскі «З жыцця павукоў»; Б. Корвін «Немаральная маральнасць»; С. Бэлза «Краявіды Корсікі»; «Фатаграфаванне нябачных прадметаў» (пра рэнтгенаўскія прамяні); «Калі пачнецца XX стагоддзе?»; «Першыя творы літаграфіі ў Варшаве»; К. Недзялкоўскі «Уражанні няверуючага ў Святым месцы»; Э. Маеўскі «У пучынах часу»; «Адкрыццё Рэнтгена»; «Х-прамяні»; «Кіеўскія краявіды»; «З гісторыі пісьма і людзей»; К. Кашэўскі «Хто вінаваты ў «пазбаўленні спадчыны» літаратараў?»; «Прымяненне прамянёў Рэнтгена ў медыцынскіх мэтах»; «Электрычная чыгунка ў Чыкага»; Э. Маеўскі «Сёе-тое пра старажытнасці»; А. Скрынецкі «Будучае Папы»; «50-годдзе першай оперы Станіслава Манюшкі ў Варшаве»; «На эстрадзе і на сцэне»; «Суд Парыса, траянскага каралевіча» – невядомая дагэтуль польская драма, надрукаваная ў 1542 годзе; артыкулы, прысвечаныя розным выставам.

4) Літаратурна-мастацкія творы: празаічныя творы М. Балуцкі «Пратэктарка»; А. Кжыжаноўскі «Пурытанка»; К. Махчыньскі «Аблога на ваўкоў»; Эрнэст Дадэ «Варожыя сцягі»; М. Балуцкі «П…»; вершы С. Дыдыньскага, Ю. Кенцкай, М. Канапніцкай, М. Хлускага, А. Пілецкага, Б. Грабоўскага, К. Градоўскага, К. Гофмана і інш.

*Захаванасць*: страчаны с.3-4, 13-14, 21-24, 37-38, 57-58, 63-64, 81-82,103-104, 117-118, 121-124, 143-144, 221-222, 237-238, 281-284, 289-294, 317-318, 321-322, 377-378, 381-384, 417-418, 441-442, 457-458, 461-462, 481-482, 503-504.

Кардон, папера, скура.

Тыпаграфскі друк.

39,6х29,9х3,0(61,7) см.

**ПГКЗ КП12-6966**

**3.** Край. Падшыўка №№ 27-45. З дадаткамі «Літаратурна-мастацкі аддзел», «Інфармацыйна-ілюстраваны аддзел». Рэдактар і выдавец Эразм Пільц (Erazm Piltz). Пецярбург. 1897. 648 с.

*Змест.*

1) Пастаянныя рубрыкі: «Польскі друк»; «Палітычныя навіны» (навіны з Турцыі, Францыі, Германіі, Англіі і іншых краін); «Усеагульная хроніка»; «Агляд расійскіх газет і часопісаў»; «Бягучыя навіны»; «Весткі з правінцыі» (навіны з Вільні, Дзісненскага павета, Прыбалтыкі, Масквы, Смаргоні, Віцебска, Нясвіжа, Смаленска, Валыні, Мінска, Магілёва, Камянца, Гомеля і іншых гарадоў); «Пецярбургская хроніка»; «З Польскага каралеўства» (навіны); «Розныя весткі»; «Прававы кур’ер»; «Школьны кур’ер»; «Касцёльны кур’ер»; «Эканаміст»; «Агляд эканамічны»; «Эканамічныя навіны»; «З таварных рынкаў»; «Хроніка літаратурная»; «Заходняе рэха» (палітычныя навіны з Кракава, Львова, Вены, Германіі, Паўднёвай Амерыкі, Аўстрыі, Прусіі Венгрыі, Рыма, Парыжа і інш.); «Палітыка»; «Ведамасці палітычныя»; «Хроніка вынаходніцтваў»; «Новыя кніжкі»; «Выдавецкія навіны».

2) Артыкулы на розныя тэмы: «Выстава ў Стакгольме»; «Парыжскія фельетоны»; «Каталіцкі касцёл у Юр’еве» ; «З Новага свету» (спецыяльная справаздача для часопіса «Край» аб падарожжы па ЗША); «Пра ахову лесу»; «З марской хронікі»; В. Гамульскі «Адам Плуг» (юбілейны артыкул); «На паветраным шары да полюса»; «Крыху новых заўваг наконт старых праблем» (да праблемы сервітутаў); «З кракаўскай выставы выяўленчага мастацтва (уражанні турыста)»; П. Варта «Пра спадчыну паэта»; «Практычнае выкарыстанне Х-прамянёў»; «Побыт караля Вільгельма II у Пецярбургу»; «Лекарскі кангрэс у Маскве»; В. Карчэўскі «З карэспандэнцыі Качкоўскага»; «Побыт найяснейшага панства ў Варшаве»; «Міжнародны кангрэс адвакатаў у Бруселі ў 1897 г.»; Ю. Градзіцкі «Апошні год» (пра кнігу У. Смаленскага «Апошні год вялікага сойму» 1896 г.); «Помнік Міцкевічу ў Варшаве»; «Становішча расійскага і замежнага друку»; «П. Варта» З размоў і уражанняў» (тэатральны агляд); «Водгаласы замежнага друку»; «Ажэшка пра польскіх жанчын»; «Карал Маеўскі» (старонкі жыцця);

«Маскоўскія ведамасці «аб польскіх справах»; К. Валішэўскі «Адносіны з Ватыканам»; «Дзённік графіні Патоцкай»; А. Нойманава «Жанчына на Ўсходзе»; «Аднаўленне касцёла Св. Кацярыны ў Пецярбургу»; «Пра Варшаўскі універсітэт»; «Сіянізм і яўрэйская праблема»; «Маджаеўская ў Амерыцы»; «Польская бібліятэка ў Парыжы»; «Польская літаратура ў Швецыі».

3) Літаратурна-мастацкія творы: М. Балуцкі «Замкі на лёдзе» (апавяданне); «Перад бурай» (апавяданне пад крыптанімам Z.L.S.); Э. Ажэшка «Куст бэзу»; вершы Опмана, Феліцыяна.

*Захаванасць*: страчаны с.1-8, 301-308, 323-328, 331-336, 373-378, 445-454; дадатак «Інфармацыйна-ілюстраваны аддзел» да №№ 31, 33, 45.

Папера, кардон, скура.

Тыпаграфскі друк.

31,5x23,5x3,5(48,3) см.

**ПГКЗ КП12-6967**

**4.** Земя. № 1. Рэдактар і выдавец Казімеж Кульвец (Kazimierz Kulwieć). Варшава. 1913. 16 с.

*Змест.*

1) Краязнаўчыя, этнаграфічныя і інш. артыкулы: С. Матусяк «Наша вясельная дружына»; А. Вылежынская «Крулевіц»; Б. Дыякоўскі «Птушкі нашых гор»; І.Т. Руно «Варшаўскія трубачысты».

2) Рубрыкі: «Лісты да рэдакцыі»; «Новыя кніжкі»; «Са спраў Краязнаўчага таварыства»; «Хроніка краязнаўчая».

Папера.

Тыпаграфскі друк.

28,0x19,1(37,7) см.

**ПГКЗ КП11-6955**

**5.** Земя. Падшыўка №№ 1-6 (1920 г.), №№ 1-12 (1922 г.). Рэдактар №№ 1-6 (1920 г.) Эдвард Малішэўскі (Edward Maliszewski). Рэдактар №№ 1-12 (1922 г.) Казімеж Кульвец (Kazimierz Kulwieć). Выдавец Польскае краязнаўчае таварыства. Друк Лявона Новака (Leon Nowak). Варшава. 1920. 1922. 480 с.

*Змест.*

1) Артыкулы па краязнаўству, этнаграфіі, гісторыі, турызму, апісанні мясцовасцей і інш: Э.Малішэўскі «Вяртанне Памор’я»; А. Лангэр «Сутнасць этнаграфіі: яе межы і мэты»; А.Уэмбло «Барацьба за прускую Мазовію»; Э. Малішэўскі «Англійская карта этнаграфіі польскіх зямель»; С. Паўлоўскі «Галоўныя напрамкі развіцця сеткі чыгунак у Польшчы»; Пятроўскі «Дамавік»; Э. Малішэўскі «Клопаты нямецкіх географаў»; М. Арлоўскі «Арганізацыя турызму ў Польшчы»; Пятроўскі «Прастольнае свята на Украіне»; Я. Віктор «Паўднёвыя крэсы»; артыкулы, прысвечаныя гісторыі, геаграфіі, помнікам культуры Спіша (Spisza) і Аравы (Orawy), Сілезіі, Варшавы; М. Смеж «Даліна Белых вод у Татрах»; Ю. Збароўскі «Чэхі ў араўскіх песнях і паданнях»; С. Паўлоўскі «Задачы польскага краязнаўства ў заходніх землях»; М. Вішніцкі «Каштоўнасць грамадскай экскурсіі па краю»; М. Арловіч «Землі Вялікай Польшчы»; «15-годдзе Краязнаўчага таварыства ў Польшчы»; С. Паўлоўскі «Наша ўзбярэжжа»; Я. Франкоўскі «Аднаўленне этнаграфічнай працы ў Польшчы»; М. Арловіч «Турызм ў Польшчы ў 1921 г.»; Я. Франкоўскі «Фатаграфія ў этнаграфіі»; У. Фішэр «Пісанкі гуцулаў»; К. Кульвец «Днестр і яго басейн»; Т. Яворскі «Мазурскія азёры»; Ф. Равіта-Гаўроньскі «Ад вытокаў Віслы да вусця»; «Юбілей А. Яноўскага»; А. Яноўскі «Над Ніжняй Віслай»; У. Фішэр «Руіны замка ў Пнёве»; «Пра Белавежскую пушчу»; Э. Пашкоўскі «Кжэмянец» («Krzemieniec»)

2) Артыкулы, прысвечаныя музеям і музеязнаўству: С. Малкоўскі «Пра ідэі вядучага музея польскай зямлі»; А. Яноўскі «З’езд музейных захавальнікаў у Быдгошчы»; С. Лабяндзінскі «Музейныя каштоўнасці наднатэцкай акругі»; А. Мацеша «Мэты і задачы правінцыяльных музеяў»; Р. Якімовіч «Значэнне старажытнагістарычнага перыяду для правінцыяльных музеяў»; У. Антаневіч «Цэнтральны дзяржаўны археалагічны музей у Варшаве»; «Народны музей у Варшаве».

3) Пастаянныя рубрыкі: «З Польскага краязнаўчага таварыства»; «Лісты да рэдакцыі»; «Краязнаўчая хроніка»; «Новыя кніжкі»; «Турыстычная хроніка».

*Захаванасць*: У №№ 1-6, 1920 г. страчаны с. 39-42, 55-58, 87-90, 135-138.У №№ 1-12, 1922 г. страчаны с. 51-52, 87-90, 149-188, 217-218.*

Папера, кардон, тканіна.

Тыпаграфскі друк.

27,4х20,5х3,2(41,2) см.

**ПГКЗ КП11-6956**

**6.** Земя. Падшыўка №№ 1-12. Рэдактар Казімеж Кульвец (Kazimierz Kulwieć). Рэдактар № 6 У. Сямковіч (Wł. Semkowicz). Выдавец Польскае краязнаўчае таварыства. Друк Лявона Новака (Leon Nowak). Друк № 6 Анчыца і Шпулькі ў Кракаве. Варшава. 1923. 230 с.

*Змест.*

1) Артыкулы па краязнаўству, этнаграфіі, гісторыі, апісанні мясцовасцей, гарадоў, помнікаў культуры і інш.: У. Сямковіч «Права Польшчы на Яважыны»; А. Яноўскі «Грамадская камісія па ахове прыроды»; артыкулы, прысвечаныя Мікалаю Каперніку (Л. Біркентайер «Ягелонскі універсітэт і школьныя гады Каперніка»; «Урачыстасці, прысвечаныя М. Каперніку» і інш.); артыкулы, прысвечаныя гісторыі, геаграфіі, прыродзе,культурным помнікам Торуні, Кракава, Влоцлаўка і іх ваколіц; Г. Штэйман «Краязнаўчая праца ў Даніі»; «Адкрыццё краязнаўчага музея Зямлі Радамскай»; В. Ташыцкі «У мужыцкім асяроддзі»( этнаграфічнае даследаванне); А. Хентнік «Апора краязнаўчай працы на чалавечы фактар»; М. Арловіч «Экскурсійныя дамы ў Польшчы»; В. Пясецкі «15-годдзе куяўскага аддзелу Польскага краязнаўчага таварыства»; «Памор'е»; К. Кетліч-Райскі «Вобразы сялян у мастацтве»; Б. Макоўскі «Хойніцы» і інш.

2) Пастаянныя рубрыкі: «Хроніка» (краязнаўчыя навіны); «З пісьменніцтва» (выдавецкія навіны).

*Захаванасць*: страчаны с. 59-64, 195-196.

Папера, кардон, тканіна.

Тыпаграфскі друк.

27,8х20,9х1,5(41,5) см.

**ПГКЗ КП11-6957**

---

* Нумарацыя старонак у часопісах за 1922 г. пачынаецца нанава.

**7.** Земя. Падшыўка №№ 1-12. Рэдактар №№ 1-7 Ежы Рэмэр (Jerzy Remer). Рэдактар №№ 8-12 Аляксандр Яноўскі (Aleksander Janowski). Выдавец Польскае краязнаўчае таварыства. Друк Яна Свянтонскага (Jan Świętoński). Варшава. 1932. 258 с.

*Змест.*

1) Артыкулы па краязнаўству, геаграфіі, этнаграфіі, апісанні мясцовасцей і інш.: Г. Жулпоўская «Птушкі – носьбіты душы»; М. Валіцкі «Раманскія пабудовы Стжэльна ў святле апошніх даследванняў»; М. Вітаноўскі «Уязная брама Вітаўскага абацтва ( помнік ваеннай архітэктуры XV ст.)»; Ч. Шкадоўскі «Велькапольскія санеты Станіслава Гельштыньскага»; артыкулы, прысвечаныя гісторыі, этнаграфіі, культуры Эстоніі; Платкоўскі «З ваколіц Мышленіц» (Myślenic); М. Нявінскі «Старонка з гісторыі горада Радама»; «Пра мэты і задачы працы над «Геаграфічным слоўнікам Польшчы»; А. Блюм-Квяткоўскі «Этнаграфічныя зборы аддзялення Польскага краязнаўчага таварыства ў Ловічы»; Ч. Пяткевіч «Ноч перад Вялікаднём на Беларусі»; С. Барабаш «Падарожжа на Татры»; К. Гуга-Бадэр «Жэлязова Воля – месца нараджэння Ф. Шапэна»; артыкулы, прысвечаныя ахове помнікаў мастацтва; А. Яноўскі «Польшча як сфера турызму»; К. Кульвец «Славяназнаўства»; матэрыялы да 25-годдзя Польскага краязнаўчага таварыства (выступленні на юбілейных урачыстасцях 1-3 мая 1932 г. у Варшаве); А. Яноўскі «Маладыя краязнаўцы ў Бялянах»; К. Завістовіч «Краязнаўчыя гурткі моладзі: уражанні і развагі з выставы маладзёжных краязнаўчых гурткоў»; «Аб турыстычнай канвенцыі ў Румыніі і іншыя патрабаванні да карпацкага прыгранічнага турызму»; Т. Ячэўскі «Некалькі заметак пра польскія назвы некаторых жывёл і экзатычных раслін»; А. Гурскі «Станіслаў Выспянскі»; А. Яноўскі «Улік заслуг прафесара Ю. Маразевіча»; К. Асінскі «Навуковыя адкрыцці ля берагоў Сану пад Пшэмыслам»; Э. Сукертава-Бядравіна «Мазурская кафля» К. Асінскі «Найстаражытнейшыя вытворчыя сляды чалавека».

2) Артыкулы, прысвечаныя музеям і музеязнаўству: Я. Пшэворская «Да адкрыцця новага будынка Народнага музея ў Варшаве»; «Эстонскія музеі»; У. Антаневіч «Аб’яднанне

музеяў у Польшчы»; Я. Манугевіч «Этнаграфічны музей у Лодзі»; Ю. Дуткевіч «Епархіяльная калекцыя ў гарадскім музеі ў Тарнове»; У. Антаневіч «Польскі марскі музей»; У. Антаневіч «Секцыі рэгіянальных музеяў у аб'яднанні музеяў Польшчы»; у пастаяннай рубрыцы «Музейны агляд» звесткі пра польскі музей у Станіслававе», музей Велуньскай зямлі (Ziemi Wieluńskiej), Польскі прамысловы музей, Музей Польскага краязнаўчага таварыства, музеі ў Кракаве, Ловічы, Сандомежы, Мяхове і інш.

3) Пастаянныя рубрыкі: «Музейны агляд» (гл. вышэй); «З пісьменніцтва» (агляд краязнаўчай, этнаграфічнай і інш. літаратуры); «Краязнаўчыя і турыстычныя весткі» (матэрыялы і справаздачы аб дзейнасці краязнаўчых аддзяленняў і філіялаў: Беласток, Гродна, Навагрудак, Слонім, Вільня і інш.); «Краязнаўчы каляндарык».

*Захаванасць*: страчаны с.1-2, 65-66, 123-134, 235-236, 263-276.

Папера, кардон, тканіна.
Тыпаграфскі друк.
30,3х23,5х1,7(47,3) см.
**ПГКЗ КП12-6964**

**8.** Земя. Падшыўка №№ 1-12. Рэдактар №№ 1-7 Ежы Рэмэр (Jerzy Remer). Рэдактар №№ 8-12 Аляксандр Яноўскі (Aleksander Janowski). Выдавец Польскае краязнаўчае таварыства. Друк Яна Свянтоньскага (Jan Świętoński). Варшава. 1932. 312 с.

*Змест.*

1) Артыкулы па краязнаўству, геаграфіі, этнаграфіі, апісанні мясцовасцей: М. Валіцкі «Раманскія пабудовы Стжэльна (Strzelna) ў святле апошніх даследванняў»; М. Вітаноўскі «Уязная брама Вітаўскага абацтва (помнік ваеннай архітэктуры XV ст.); Ч. Шкадоўскі «Велькапольскія санеты Станіслава Гельштыньскага»; артыкулы, прысвечаныя гісторыі, этнаграфіі, культуры Эстоніі; Платкоўскі «З ваколіц Мышленіц»; М. Нявінскі «Старонка з гісторыі горада Радама»; «Пра мэты і задачы працы над «Геаграфічным слоўнікам Польшчы»; А. Блюм-Квяткоўскі «Этнаграфічныя зборы аддзялення

Польскага краязнаўчага таварыства ў Ловічы»; Ч. Пяткевіч «Ноч перад Вялікаднём на Беларусі»; С. Барабаш «Падарожжа на Татры»; К. Гуга-Бадэр «Жэлязова Воля – месца нараджэння Ф. Шапэна»; А. Гедэман «Знішчэнне мінулага»; «Ахова помнікаў мастацтва»; А. Яноўскі «Польшча як сфера турызму»; К. Кульвец «Славяназнаўства»; М. Клімашэўскі «Вярхоўе Дунайца…»; А. Фішэр «Клён і явар у культуры польскага народа»; К. Завістовіч «Вобраз Св. Ежы ў вершах і народных абрадах»; Л. Савіцкі «Дагістарычны перыяд Валынскага ваяводства»; матэрыялы да 25-годдзя Польскага краязнаўчага таварыства (выступленні на юбілейных урачыстасцях 1-3 мая 1932 г. у Варшаве); А. Яноўскі «Маладыя краязнаўцы ў Бялянах»; К. Завістовіч» Краязнаўчыя гурткі моладзі: уражанні і развагі з выставы маладзёжных краязнаўчых гурткоў»; «Аб турыстычнай канвенцыі ў Румыніі і іншыя патрабаванні да карпацкага турызму»; Т. Ячэўскі «Некалькі заметак пра польскія назвы некаторых жывёл і экзатычных раслін»; А. Гурскі «Станіслаў Выспянскі»; артыкулы,прысвечаныя падарожжам па землях Польшчы»; К. Асінскі «Навуковыя адкрыцці ля берагоў Сану пад Пшэмыслам»; Э. Сукертава-Бядравіна «Мазурская кафля»; Г. Сіпко «Старапольскія горна-металургічныя помнікі»; Я. Франчак «Саха і яе разнавіднасці».

2) Артыкулы, прысвечаныя музеям і музеязнаўству: Я. Пшэворская «Да адкрыцця новага будынка Народнага музея ў Варшаве»; «Эстонскія музеі»; У. Антаневіч «Аб'яднанне музеяў у Польшчы»; Я. Манугевіч «Этнаграфічны музей у Лодзі»; Ю. Дуткевіч «Епархіяльная калекцыя ў гарадскім музеі ў Тарнове»; У. Антаневіч «Секцыі рэгіянальных музеяў у аб'яднанні музеяў Польшчы»; у пастаяннай рубрыцы «Музейны агляд» звесткі пра музеі ў Ловічы, у Сандомежы, у Мяхове, у Станіслававе і інш.

3) Пастаянныя рубрыкі: «Музейны агляд»; «З пісьменніцтва»; «Краязнаўчыя і турыстычныя весткі»; «Краязнаўчы каляндарык».

*Захаванасць*: страчаны с.1-8, 19-20, 157-158.
Папера, кардон, тканіна.
Тыпаграфскі друк.
30,5х23,6х2,1(47,8) см.
**ПГКЗ КП12-6963**

**9.** Земя. №№ 8-9. Рэдактар Аляксандар Яноўскі (Aleksander Janowski). Выдавец Польскае краязнаўчае таварыства. Друк Яна Свянтоньскага (Jn Świętoński). Варшава. 1932. 32 с.

*Змест.*

1) «Юбілей Варшаўскага навуковага таварыства»; А. Гурскі «Станіслаў Выспянскі»; А. Яноўскі «Улік заслуг прафесара Ю. Маразевіча»; Е. Хычэўскі «Касцёл у Закрочыме»; артыкул У. Грушчыньскага, прысвечаны вандроўцы па маршруту Варшава-Чэрвеньск-Жэлязова-Воля-Захачэў-Варшава; Т. Віснёўскі «Бескід Выспавы» (Beskid Wyspowy); К. Асінскі «Навуковыя адкрыцці ля берагоў Сану пад Пшэмыслам»; Э. Супертава-Бядравіна «Мазурская кафля».

2) Пастаянныя рубрыкі: «Музейны агляд» («Дзяржаўны археалагічны і краязнаўчы музей у Польшчы»; «Позірк на дзейнасць Дзяржаўнага заалагічнага музея ў справе даследавання фауны краю ў 1919-1931 гг.»); «З пісьменніцтва»; «Краязнаўчыя і турыстычныя весткі».

Папера.

Тыпаграфскі друк.

30,8х23,5(46,8) см.

**ПГКЗ КП12-6961**

**10.** Земя. №№ 10, 11, 12. Рэдактар Аляксандр Яноўскі (Aleksander Janowski). Выдавец Польскае краязнаўчае таварыства. Друк Яна Свянтоньскага (Jan Świętoński). Варшава. 1932. 32 с.

*Змест.*

1) Я. Сундэрланд «Народныя твары на фотаздымках»; М. Знамяроўска-Пруферава «Садзейнічанне рыбалоўству на Бугу»; Г. Сіпко «Старапольскія горна-металуггічныя помнікі»; Я. Франчак «Саха і яе разнавіднасці»; К. Асінскі «Найстаражытнейшыя вытворчыя сляды чалавека».

2) Пастаянныя рубрыкі: «Музейны агляд» (музеі ў Луцку, Станіслававе); «З пісьменніцтва» (бібліяграфічныя навіны); «Краязнаўчыя і турыстычныя весткі» (навіны з краязнаўчых філіялаў у Браславе, Хойніках і інш.).

Папера.
Тыпаграфскі друк
30,8х23,5(36,8) см.
**ПГКЗ КП12-6962**

**11.** Земя. Падшыўка №№ 1-12. Рэдактар Аляксандр Паткоўскі (Aleksander Patkowski). Выдавец №№ 1-2 Польскае краязнаўчае таварыства. Выдавец №№ 3-12 Польскае турыстычна-краязнаўчае таварыства. Друк Яна Святоньскага (Jan Świętoński). Варшава. 1935. 240 с.

*Змест.*

1) Артыкулы па краязнаўству, этнаграфіі, апісанні мясцовасцей,помнікаў гісторыі і культуры і інш.: Е. Смаленскі «Пейзаж у краязнаўстве»; Э. Гаецкі «Кракаў у паэзіі Эдмунда Васілеўскага»; «Працы прафесара Казімежа Нітша і іх значэнне для краязнаўства»; К. Гуга-Бадэр «Наша марское рыбалоўства»; А. Бросіч «Краязнаўства і графіка»; Ю. Кжыжаноўскі «Са старапольскай паэзіі пра Віслу»; Г. Мюнх «План Каліжа за 1800-1802 гг.»; С. Малкоўскі «Ідэалогія краязнаўства і навукі пра зямлю»; Я. Тохтэрман «Тэрытарыяльнае развіццё Радама»; М. Нявінскі «Бенедыктынцы ў Сяцехаве і Апатаве (Sieciechowie i Opatowie); артыкулы, прысвечаныя гісторыі, помнікам культуры, прыродзе Казімежа Дольнега; А. Кавалькоўскі «Краязнаўства і выхаванне»; Т. Севярын «Ідэалогія і методыка краязнаўчай працы сярод школьнай моладзі»; Я. Дзюр «Дзённік у малюнках Выспянскага з падарожжа па Прыкарпаццю»; артыкулы, прысвечаныя Зыгмунту Глогеру, С. Жэромскаму, Красіцкаму.

2) Пастаянныя рубрыкі: «Музейны агляд» (музей у Пулавах, у Кельцах, рэгіянальныя музеі Украіны); «З пісьменніцтва» (бібліяграфічны агляд новых выданняў); «Бібліяграфія польскага краязнаўства»; хроніка «Краязнаўства і турызм».

*Захаванасць*: страчаны с. 9-20, 29-34, 47-50, 105-144.
Папера, кардон, тканіна.
Тыпаграфскі друк.
29,7х21,5х1,8(44,3) см.
**ПГКЗ КП11-6958**

**12.** Земя. Падшыўка №№ 1-12. Рэдактар Аляксандр Паткоўскі (Aleksander Patkowski). Выдавец Польскае краязнаўчае таварыства. Друк Яна Святоньскага (Jan Świętoński). Варшава. 1937. 302 с.

*Змест.*

1) Апісанні мясцовасцей, краязнаўчыя, этнаграфічныя, гістарычныя артыкулы: А. Стэбельскі «Куявія ў мінулым»; артыкулы, прысвечаныя Влоцлаўку, Хойніцам, Сандомежу, Луцку і іх ваколіцам; З. Казлоўскі «Эканамічнае сёння і заўтра цэнтральнай прамысловай акругі»; «Праблемы сістэматызацыі вырабаў народнай культуры»; артыкулы, прысвечаныя Яну Квяткоўскаму, Уладзіславу Замойскаму, Севярыну Удзелю; С. Гербет «Гісторык Падзвіння Оттан Гедэман» (апісваў Браслаў, Дзісну, Друю); К. Яжджэўскі «Археалогія і краязнаўства»; С. Крукоўскі «Апатаўскія крамнёвыя штольні як помнік горнай справы першабытнага часу і нежывой прыроды»; У. Тамкевіч «Стэфан Чарнецкі і яго радавое гняздо».

2) Матэрыялы, прысвечаныя 30-годдзю Польскага краязнаўчага таварыства: матэрыялы юбілейнага пасяджэння ў Ягелонскім універсітэце ў Кракаве 24 мая 1936 г.; справаздачы аб дзейнасці акруговых упраўленняў Польскага краязнаўчага таварыства (утрымліваюцца матэрыялы пра дзейнасць філіялаў у беларускіх гарадах: Браслаў, Глыбокае, Баранавічы, Слонім, Ліда, Гродна і інш.); матэрыялы пра музейную дзейнасць Польскага краязнаўчага таварыства (музеі ў Слоніме, Брэсце, Пінску, музейныя зборы ў Глыбокім); матэрыялы пра выдавецкую дзенасць Польскага краязнаўчага таварыства.

3) Пастаянныя рубрыкі: «З пісьменніцтва»; «Бібліяграфія польскага краязнаўства»; «Музейны агляд»; хроніка «Краязнаўства і турызм».

*Захаванасць*:
Папера, кардон, тканіна, ледэрын.
Тыпаграфскі друк.
30,9х23,1х2,0(47,7) см.
**ПГКЗ КП11-6959**

[*] Адсутнічае № 7.

**13.** Земя. Падшыўка №№ 1-12.* Рэдактар Аляксандр Паткоўскі (Aleksander Patkowski). Выдавец Польскае краязнаўчае таварыства. Друкарня «Гаспадарчая» ў Варшаве. Варшава. 1938. 300 с.

*Змест.*

1) Артыкулы па краязнаўству, этнаграфіі, гісторыі, апісанні мясцовасцей, гарадоў,помнікаў культуры і інш.: Г. Ружыцкі «Умовы прамысловай каланізацыі ў Тамашове Мазавецкім»; артыкулы, прысвечаныя гісторыі, прамысловасловасці, помнікам архітэктуры, культуры, выдатным дзеячам Апачыньскага (Opoczyńskiego) павету; А. Каліна «Капэла пры касцёле ў Кжыньску»; В. Вальчак «Экзатычная пустыня на польскіх землях»; «Старажытны касцёл у Дрогіне ў Мышлянецкім павеце»; М. Жакоўская «Дэнкуў (Denków) – цэнтр керамічнага промыслу ў Апатаўскім павеце»; У. Анчыц «Замак у Мельштыне» (Mielsztynie); Т. Севярын «Матэйка як краязнаўца»; «Галіч і ваколіцы»?; М. Гаткевіч «Пра нашых закарпацкіх пабрацімаў»; «Падарожжы Юзафа Хацішэўскага па Славакіі»; К. Яворскі «У славацкім раю»; «З гісторыі грабніцы караля Станіслава Аўгуста ў Пецярбургу»; артыкулы, прысвечаныя гісторыі, сучаснаму і будучаму Варшавы; Б. Заборскі «Змены дзяржаўнай граніцы на польска-чэшска-славацкім пагранiччы; У. Мілата «Карпаты зімой».

2) Пастаянныя рубрыкі: «З пісьменніцтва» (бібліяграфічныя навіны); «Бібліяграфія польскага краязнаўства»; «Хроніка «Турызм і краязнаўства» (змяшчаліся розныя краязнаўчыя навіны; справаздачы пра дзейнасць розных філіялаў Польскага краязнаўчага таварыства; зводка дзейнасці аддзелаў Польскага краязнаўчага таварыства за 1937 год,у тым ліку і ў беларускіх гарадах: Баранавічы, Брэст, Браслаў, Давыдгарадок, Гродна, Кобрын, Ліда, Навагрудак, Нясвіж, Пінск, Слонім, Ваўкавыск, Вільня і інш.); «Кароткія краязнаўчыя абразкі»; «Вандроўкі па Польшчы»; «Музейны агляд» (звесткі пра музеі Польшчы, музейныя справы).

*Захаванасць*: страчаны с. 147-174, 255-256.
Папера, кардон, тканіна, ледэрын.
Тыпаграфскі друк.
30,5x21,5x1,8(44,0) см.
**ПГКЗ КП12-6960**

## Літаратура

**Літвіновіч А.** Земя.// Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6-ці тамах. Т. 3. Мн., 1996, с. 446-447.

**Мархель У.** Край.// Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6-ці тамах. Т. 4. Мн., 1997, с. 246.

**Польша. Начало книгопечатания. Издательское дело.**// Книговедение. Энциклопедический словарь. М., 1982, с. 418-419.

# Кірылічныя выданні друкарняў старавераў к. XVIII – пач. XIX стст. у фондах НПГКМЗ

***А.У. Шумовіч***

Кнігавыдавецкая дзейнасць старавераў была адметнай з'явай у гісторыі друкарскай справы. Значэнне дзейнасці стараверскіх друкарняў у першую чаргу звязана з публікацыяй старaверамі кніг і помнікаў пісьменнасці, якія раней не выдаваліся. Кнігі, выдадзеныя старaверамі, выклікаюць цікавасць і таму, што іх друкарская дзейнасць, росквіт якой прыйшоўся на II палову XVIII – пачатак XIX ст., адбывалася ў рамках кірылічнага кнігадрукавання, якое да таго часу прайшло доўгі шлях развіцця, мела свае традыцыі, рэпертуар, сваё месца ў жыцці грамадства.

У канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзя друкарні старавераў выдалі больш за 200 выданняў, апублікавалі шэраг твораў старажытнарускай літаратуры, якія да гэтага не выдаваліся, і тым самым паскорылі вырашэнне пытання аб адкрыцці адзінаверскай друкарні ў Маскве, якая з 1820 году пачала афіцыйна займаццца перадрукоўкай даніканаўскіх выданняў.

У фондах НПГКМЗ захоўваюцца 7 выданняў стараверскіх друкарняў канца XVIII – пач. XIX стст.:

- 1 выданне Клінцоўскай друкарні Дзмітрыя Рукавішнікава: Диоптра, 1787 г. (**КП11-6397**). Кніга была перададзена ў 1991 г. з Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя У.І. Леніна;

- 3 выданні друкарні Карташовых у Клінцах: Канонік, 1793 г. (**КП9-4953**), закупка ў краме «Рарытэт» у Маскве; Псалтырь,1798-1800 г. (**КП4-2226/1**), закупка ў жыхара Наваполацка ў 1987 г.; «Устав о христианском житии», пасля 1814 г. (**КП1-255**), ад жыхара Полацка;

- 1 выданне з выхаднымі звесткамі «Яссы»: Апостал-тетр., 1791 г. (**КП15-12787**). Кніга перададзена ў 1998 г. з Полацкай чыгуначнай мытні;

- 2 выданні друкарні П. Селязнёва ў Махноўцы, або друкарні К. Колычава ў Янова: «Цветник аввы Дорофея», пасля

1804 г. (**КП9-5190**), закупка ў краме «Рарытэт», Масква; «Книга о вере», пасля 1806 г. (КП9-5125), дар ад Мальдзіса А.І. у 1989 г.

1. **Диоптра**.

Клінцы: друкарня Д. Рукавішнікава, 12 верасня 1787.

З куцеінскага выдання 1651 г. (выданне мае тыт.л. з такімі вых. звесткамі).

Тыт. л., л.1а, загаловак: «Диоптра// или зерцало и изображе//ние живота в мире сем // ч/е/л/ове/ческаго трудолюбием // иноко/в/ с/вя/тых общежит/ия/ // оби/тели/ Кутеинския … в ле/то/ /от/ рож/дества/ Х/ристова/: 1651.».

Выхадныя звесткі ў канцы кнігі, л. 344а: «Сия б/о/годохновенная книга // Диоптра // … ныне же новогородского северского // наместничества, округа суражского, в собственной в клинцовском // посаде типографии содержателя, // онаго посада купца, Дмитрия Ру//кавишникова, перепечатана… в // лето 7295 /1787/».

Фармат 4, набор 142х103, шрыфт кірылаўскі: 16 радкоў. 10 радкоў = 91мм.

Кустод няма, сігнатуры літарныя, друк у адну фарбу.

Пагінацыя правая, па лістах, у ніжнім правым вуглу: 1-8, 1-344 = 352 лл.

*Склад*: тыт. л., л. 1а; **1)** прадмова да чытача, л. 2а-6б; **2)** «Каталог, или указание главам», л.7а-8б; **3)** першая частка «Диоптры», лл. 1а (2 паг.) – 119а; **4)** частка другая, лл.119б-229а; **5)** частка трэцяя, лл. 230а-343б; **6)** вых. звесткі, лл. 344а-344б.

*Арнамент*. Ксілаграфічныя застаўкі з кветкавым фонам.

*Гравюры*: **1)** тыт. л (л.1а): тытульная рамка з выявамі Ісуса Хрыста, святых і патрыярхаў, 158х123; **2)** л. 1б, выява Троіцы і хрышчэнне Ісуса Хрыста ў Іардане, 114х87.

Папера ручнога адліву 1784-1786 гг. з ВЗ. Фрагменты філіграней: «ГМ», «РФ», «1786», «1784», «годъ».

Рэшткі пераплёта XVIII ст. (ніжняя покрыўка), 1 зашпілька з бронзы.

*Бібліяграфія*: Вознесенский, 1991, № 288.

**ПИАЗ КП11-6397**

2. **Апостол-тетр**.

Ясы, 15.01.1791 г.

З маскоўскага выдання 8.10.1648 г.

Тыт. л. няма. Пачатак, л.1а: «Сказание святаго Епифания епископа // Кипрьскаго, о двунадесятехъ с/вя/тыхъ ап/осто/лъ.»

Вых. звесткі ў канцы кнігі, л.1 нн.а: «Сия же Б/о/год/о/хновенная книга Ап/о/ст/о/лъ // тетръ, … напечатася по дозволению // Его Светлости князя Григория // Александровича Потемкина Та//врическаго// въ Яссахъ, в лето от создания мира, // 7299 (1791) м/еся/ца генваря 15 дня».

Фармат 2, набор 123х124, 125х128, шрыфт кірылаўскі: 25 радкоў. 10 радкоў = 92 мм.

Кустод няма, сігнатуры літарныя, двухколерны друк.

Пагінацыя правая, па лістах, у ніжнім правым вуглу: 1-284, 255, 286-317, 1нн. = 318 лл.

*Склад*: **1)** «Сказание св. Епифания епископа Кипрскаго, о двунадесятехъ с(вя)тыхъ ап(осто)лъ, л.1а-3б; **2)** «Избрание св. седьмидесяти ап(ос)толъ», л. 4а-7б; **3)** «О чудесехъ св. апостолов», л. 8а-13а; **4)** «Сказание деяний апостольских списана св. ап. и евангелистом Лукою», л. 14а-71б; **5)** «Сказание Иаковля соборного послания», л. 72а-79а; **6)** «Послание ап. Петра», л. 79б-92а; **7)** «послание ап. Иоана Богослова», л. 93а-106а; **8)** «послание Иуды», л. 106б-109б; **9)** «послание ап. Павла к римлянам», л. 110а-133б; **10)** «послание ап. Павла к коринфянам», л. 134а-174б; **11)** «послание ап. Павла к галатам», л. 175б-184б; **12)** «послание ап. Павла к ефесянам», л. 185а-194б; **13)** «послание ап. Павла к филистимлянам», л. 195а-201б; **14)** «колосайское послание ап. Павла», л. 202а-209а; **15)** «послание ап. Павла к солунянам», л. 209б-220б; **16)** «послание ап. Павла к Тимофею», л. 221а-236б; **17)** «послание ап. Павла к Титу», л.237а-241а; **18)** «послание ап. Павла к Филимону», л. 241б-244б; **19)** «послание ап. Павла к евреям», л. 245а-264а; **20)** «Сказание на вся дни», л. 265а-279а; **21)** «Начало св. четверодесятницы», л. 280а-283а; **22)** «Соборник 12-тем месяцем», л. 284а-314а; **23)** малітва на заканчэнне выдання кнігі, л. 315а-317б; **24)** вых. звесткі, л. 1нн. а.

*Арнамент*. Ксілаграфічныя застаўкі (51 з 9 дошак), ініцыялы (23 з 7 дошак), канцоўкі (1 – л.1нн.а), ламбарды. Гравюра: 1) Евангеліст Лука, 232х129 (ксілаграфія), л.15б.

Папера ручнога адліву 1789 г. ( фрагменты філіграні «1789г.»).

Пераплёт XVIII ст., скураны, на дошках , карашок і частка пераплёту рэстаўрыраваныя мешкавінай; захаваліся верхнія часткі 2-х зашпілек з бронзы.

*Бібліяграфія*: Вознесенский, 1991. с. 9, № 361.

*Запісы*:

1) л.225а, на палях: «Зрите како // должны жити и // почитати своих // мужей» (алоўкам).

2) л.6а, на палях: «Не быто // от нас’» (алоўкам).

3) л.51а: «крещени».

4) л.181а: «нарожество».

5) л.200б, л.201а, 282а: «навербною».

6) л.206а: «Новый Год».

7) л.239б: «крещению».

8) л.253а: « на отретинае».

9) л.254а, л.300б: «обретиние».

10) л.266а: « на пас XV».

11) л.295а: «На новый год» (алоўкам, на палях).

**ПГКЗ КП15-12787**

3. **Канoник**.

«Супрасль, друкарня Супрасльская, 1793»./Клінцы: друкарня Ф.Карташова, 1793/. З маскоўскага выдання 25 жніўня 1651 г.

Тыт. л. няма. Пачатак, л.1нн.а: «Оглавление, колико канонов, и про//чих потреб имать с/вя/тая книга сия».

Вых. звесткі ў канцы кнігі, л. 549б: «Ныне же второе издатеся с // дополнением из прочих слу//жебных книг в // друкарни Супрасльской // в лето 7301 (1793)».

Фармат 4, набор 124х93, шрыфт кірылаўскі: 15 радкоў. 10 радкоў = 88мм.

Кустод няма, сігнатуры літарныя, двухколерны друк.

Пагінацыя правая, па лістах, у ніжнім правым вуглу: 3нн., 1-549 = 552 лл.

*Склад*: **1)** аглаўленне, л.1нн.а – 3нн.б; **2)** «начало правилу», л.1а-7б; **3)** каноны, малітвы, л. 8а-542а; **4)** паменнік, л. 542б-548б; **5)** пасляслоўе з вых. звесткамі, л. 549а-549б.

*Арнамент*. Ксілаграфічныя застаўкі з кветкавым фонам.

Папера ручнога адліву з ВЗ.

*Філіграні*: **1)** герб Ганчаровых – «1791», «1792», «ANSG», «1790» (папяровая мельніца Ганчаровых у Калужскай губерніі – Лауцявичюс, №1426); **2)** «Pro Patria» – «1790» – «АГ» (манаграма Ганчаровых).

Пераплёт XVIII ст., скураны, на дошках, з цісненнем раслінным і геаметрычным арнаментам.

*Бібліяграфія*: Вознесенский, 1991. № 20.

*Запісы*:

1) На форзацы: «Сия книга глаголемая Кано//ник Василия Куприянова сына // исъ Опурина // Сия книга глаголемая // Канвоникъ Абре.. мима Ивано//ва рогогозина».

**ПИАЗ КП9-4953**

4. **Псалтырь**.

Клінцы: друкарня Ф. Карташова (?), 1798-1800.

З маскоўскага выдання 1.10.1651 г.

Тыт. л. няма. Пачатак, л.1а (рукапісны): «Ведомо же буди и осемъ, яко // подобает всякому христианину // ведати известно, како лице свое // крестити…»

Вых. звесткі страчаны.

Фармат 4, набор 140х98, 100, шрыфт кірылаўскі: 16 радкоў. 10 радкоў = 88мм.

Кустод няма, сігнатуры літарныя, двухколерны друк.

Пагінацыя правая, па лістах, у ніжнім правым вуглу: 1-36, 1-217, 220-330, 330-354, 361-363 = 392 лл.

**Склад**: **1)** «О крестном знамении», л.1а-15а; **2)** «изложение вкратце о вере и вопросы и ответы о богословии», л. 15б-22б; **3)** «указ о поклонах», л. 23а-27а; **4)** «Устав о Псалтыри», л. 27б-36б; **5)** «Псалтырь, кафизмы 1-20», л.1а (2паг.) – 197а; **6)** «Песни и псалмы избранные», л. 197б-285а; **7)** «Устав всем, хотящим пети Псалтырь», л. 285а-319а; **8)**

«Канон за единоумершего», л. 319б-329а; **9)** «Канон за творящих милостыню», л. 329б-338а; **10)** «Канон за исход души», л. 338а-354б; **11)** Пасляслоўе з маскоўскімі вых. звесткамі 1651 г., л. 361а-363а.

*Арнамент*. Ксілаграфічныя застаўкі (29 з 9 дошак), ініцыялы (22 з 13 дошак), ламбарды, рамка для маргіналій. Гравюра страчана.

Папера ручнога адліву 1796, 1798 гг. з ВЗ. Фрагменты філіграней: «ДОФЕ – Б 1796г.», «ДОФЕ – Б 1798г.» («Дмитровской округи фабрика Елизаветы Баташевой» – Клепиков, № 231).

Пераплёт: дошкі, абцягнутыя скурай цёмна-карычневага колеру, вельмі пацёрты. 1 зашпілька з бронзы, 1 страчана.

*Бібліяграфія*: Вознесенский, 1991, № 52.

*Запісы*:

1) л.2б, 13б, 14а, 42а(2 паг.), 75а, 363б: «проба пяра»;

2) Форзац ніжняй покрыўкі: «Александра (нрзб.) 25 іюня // (нрзб.)», ніжэй –маргінальны запіс: «Матушка Степанида. 19 ин. // во святом хрещение // 16-го сентября упокоилась (нрзб.) // Васильевна» – алоўкам (пач. XX ст.).

3) На адвароце, маргінальныя запісы: «Сестра Зина упокоилась 12 октября // Василей Михайловичъ 4-го сентября // Елена 11 августа, Варвара (нрзб.) // 3-го сентября Игнатей 30 апреля // Григорей 31 мая Во юлеи Его // 4 февраля Марфа (нрзб.) // Евдокия 14 марта // 3 – Улита 18-го сентября // (нрзб.) Петровна. 13 октября // (нрзб.)Федоровна // 10 ноября Илья. А 20 июня // (нрзб.)…», далей закрэслена – алоўкам (пач.XX ст.).

«Ггригорей Кончилей // моя мама 5-го (нрзб.) 12 апреля // Бабушка 13.8.28 (нрзб.) – алоўкам (каля 1928г.).

**ПИАЗ КП4-2226/1**

5. **Дорофей, авва. Цветник**.

«Гродна: друкарня Я.К.В. Гродзенская, 1790» / Махноўка: друкарня П.І.Селязнёва або Янава: друкарня К.Колычава, пасля 1804/.

Тыт.л. няма. Пачатак, л.1а: «Сказание известно главам настоя/щия с/вя/тыя книги сея».

Выходныя звесткі ў канцы кнігі, л.483б: «Сия книга гл/а/ гол/емая // Цветник //, сочиненная С/вя/щенноиноком Дорофе// ем, содержащая в себе за//поведи Ев/анг/альския, и с/вя/тых // о/те/ц поучение. Типом издана // в Типографии Гроденской // в лето 7298 (1790)».

Фармат 4, набор 158х108, шрыфт кірылаўскі: 18 радкоў. 10 радкоў = 91мм.

Кустод няма, сігнатуры літарныя, двухколерны друк.

Пагінацыя правая, па лістах, у ніжнім правым вуглу: 1-332, 335-483 = 481 лл.

*Склад*: **1)** змест, л.1а-7а; **2)** прадмова, л. 8а-14а; **3)** «Цветник», 64 главы, л. 15а-483а; **4)** выходныя звесткі, л. 483б.

*Арнамент*. Ксілаграфічныя застаўкі з кветкавым фонам, ламбарды, наборны арнамент.

Папера ручнога адліву 1804 г. з ВЗ. Фрагменты філіграней: «Pro Patria», «1804»; лацінскія літары «PP» і «Б» (кірылічн.) – магчыма, Баташаў (Аўрам) – Клепікаў, № 1276.

Пераплёт XIX ст., скураны, на дошках, з цісненнем раслінным арнаментам і гербам у круглым шчыце з выявамі стаячых ільва, быка і кароны; з рэшткамі верхніх частак 2 зашпілек з бронзы.

*Бібліяграфія*: Вознесенский, 1991, № 150, 156.

*Запісы*:

1) лл. 2-24: «Сия книга Костромской губернии Чюхломского уезда села Тройцы Мираханова Деревни Савелова крестьянина Дмитрия Иванова. Зари куплена в С.-н Петербурхе. Выплочена двадцать четыре рубля пядесятъ копеекъ. 1840-го года.»

**ПИАЗ КП9-5190**

6. **Книга о вере.**

«Гродна: друкарня Я.К.В. Гродзенская, 1785».

/Махноўка: друкарня П.І.Селязнёва або Янова: друкарня К.Колычава, пасля 1806г./. З маскоўскага выдання 1648 г.

Тыт.л., л.1а, загаловак: «Книга о вере единой, истинной православной // и о с/вя/тей ц/е/ркви восточной и о изрядней-

ших // правоверных сложениях от б/о/жественага писа//ния в кратце избрана.»

Выхадныя звесткі ў канцы кнігі, л. 289а: «А во второе же с тогож переводу ни в единой // точки отменно, издана в типографии // е/го/ к/оролевскаго/ в/еличества/ Гроденской 1785 году».

Фармат 2, набор , шрыфт кірылаўскі: 25 радкоў. 10 радкоў = 90мм.

Кустод няма, сігнатуры літарныя, двухколерны друк.

Пагінацыя правая, па лістах, у ніжнім правым вуглу:1 – 289 = 289лл.

*Склад*: **1)** прадмова, л.1а-5б; 2) аглаўленне, л.6а-7а; **3)** вершы да чытача, л.7а-7б; **4)** другая прадмова, л. 8а-9а; **5)** «вера и учение истинное» і іншыя павучэнні і казанні, у тым ліку «О Флоренском соборе», «о отступлении юнитов», «о антихристе», «О кресте», «о святых иконах» і інш., л.10а-288а; **6)** пасляслоўе, л. 2888б-289а; **7)** выхадныя звесткі, л. 289а.

*Арнамент*. Ксілаграфічныя застаўкі з кветкавым фонам, ініцыялы, ламбарды.

Папера ручнога адліву 1806 г. з ВЗ.

*Філіграні*: Герб Ганчаровых, «1806», «МФАГ» / «Мединская фабрика Афанасия Гончарова» – Клепиков, с.36, 80/.

Пераплёт XIX ст., скураны, на дошках, з залатым цісненнем раслінным арнаментам, з верхнімі часткамі 2 зашпілек з бронзы.

*Бібліяграфія*: Вознесенский, 1991, № 165.

**ПИАЗ КП9-5125**

7. **Устав о христианском житии.**

«Почаев, б.г.». / Клінцы: друкарня Ф. і А. Карташовых, пасля 1814 г.

Тыт. л. няма. Пачатак, л. 1 нн.а: «Оглавление настоящия // сея книги». Л.1а, назва: «Устав // О хр/р/истианском житии // сиречь, о постах, и о // поклонах, и о праздни//цех великих, средних // и малых. Такожде и о // домашней м/о/л/и/тве, како // достоит завсю ц/е/рковную // службу, лишившимся со//

борныя службы, Псалты//рию, или поклонами, или м/о/л/и/ твами исправляти».

Выходныя звесткі ў канцы кнігі, л.127б: «Устав сей о постах // и поклонах, о праздни//цех, о домашней мо//литве и о келейном // правиле, со спальными // молитвами, избранный // из Устава ц/е/рковного и // прочих типиков. // Напечатася в типографии // Почаевской».

Фармат 8, набор 127х73, шрыфт кірылаўскі: 14 радкоў. 10 радкоў = 92 мм.

Кустод няма, сігнатуры літарныя. двухколерны друк.

Пагінацыя правая, па лістах, у ніжнім правым вуглу: 1нн., 1-127 = 128 лл.

*Склад*: **1)** «Оглавление настоящия сея книги», л.1нн.а – 1нн.б; **2)** пачатак: «Устав // о хр/и/стианском житии..», л. 1а; **3)** «О постах», л. 1б-22а; **4)** «О поклонах», л. 22б-30б; **5)** «о праздниках», л.31а – 79б; **6)** «о молитве домашней», л.80а-101а; **7)** «Начало правилу», л. 101а-111б; **8)** «молитвы спальные», л.111б-120а; **9)** «Отпусты во всю седмицу», л.120б-123а; **10)** «Отпусты праздникам», л. 123б-127б; **11)** выхадныя звесткі, л.127б.

*Арнамент*. Ксілаграфічныя застаўкі (2 з 2 дошак), наборны арнамент.

Папера ручнога адліву 1814г.

Пераплёт скураны, на дошках; 1 зашпілька з бронзы. Рэшткі сляпога ціснення на верхняй дошцы.

*Бібліяграфія*: Вознесенский, 1991, №107.

*Запісы*:

1) на форзацы: «Нумерованія денег // 1-100 руб. 1898 года // № ИУ 14899 // 2 – 100 руб. 1910г. № дя 147 818 // 33, - 25 руб.1909го №Гв 626 490 // 4, 25 руб.1909 год. №вв 148 976 // 5, 25 руб. 1909 год №вв 653 755».

2) л.127б: «Т. Типиковъ» – чорн. чарн.

3) форзац ніжняй дошкі: «Polikarp Piotrow» – алоўкам.

**ПКМ КП1-255**

**Літаратура**

**Вознесенский А.В.** Старообрядческие издания XVIII – начала XIX века. Введение в изучение. СПб., 1996.

**Кириллические издания старообрядческих типографий конца XVIII – начала XIX века**. Каталог. Составитель А.В. Вознесенский. Л., 1991.

**Лабынцев Ю.А.** Памятники древнерусской письменности в изданиях старообрядческих типографий XIX – XX вв. // Книга. Исследования и материалы. Сб.39. М., 1979.

**Мельников-Печерский П.И.** Записка о старообрядческих типографиях в Клинцах, Махновке, Янове, Майдане Почапниецком.// Полн. собр. соч. в 7 томах. Издание второе. Т. 7. СПб., 1909. с. 352-375.

**Поздеева И.В.** Древнерусское наследие в истории традиционной книжной культуры старообрядчества ( первый период ).// История СССР. 1988, № 1. с.84-99.

**Стараабраднікі, стараверы**.// Рэлігія і царква на Беларусі. Энцыкл. даведнік. Мн., 2001. с. 310-311.

**Стараабраднікі, стараверы.** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6 тамах. Т. 6. Кн. 1. Мн., 2001. с. 406-407.

**Шумовіч А.У.** Запісы і прыпіскі на кірылічных выданнях XVI – пач. XX ст. (з фондаў Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка).// Зборнік дакладаў навуковых супрацоўнікаў ПГКЗ па выніках працы 1995 г. (навук.-практычная канферэнцыя 1995 г.). Полацк, 1996. с. 10-17.

**Шумович Е.В.** Кириллические старообрядческие издания XVIII – нач. XX в. в фондах ПИКМЗ.// Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі ( па выніках навукова-доследнай работы ў 1997 г.). Полацк, 1998. с. 83-92.

**Шумовіч А.У.** Філіграні на паперы кірылічных выданняў XVI – пач. XIX стст. ( з фондаў Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка).// Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі ( па выніках навукова-даследчай работы ў 1996 г.). Полацк, 1997. с. 51-56.

# Дадаткі

# Невядомая познеготычная выява полацкай трагедыі 1563 г.

***В.В. Глінік***

«...и богомерских же латин...
расплени и расточи»

Бернардынскі касцёл Св.Св. Францішка і Бернардына ў Вільні належыць да найвышэйшых дасягненняў познеготычнай архітэктуры Вялікага княства Літоўскага[1]. Будаўніцтва мураванай святыні пачалося на прыканцы XV ст. Не дужа ўдала – кепскія грунты не вытрымалі цяжару і амаль гатовы касцёл давялося перарабляць. У 1500 г. большасць сцен трохнефавага корпуса была разабрана, засталіся толькі прэсбітэрыум, часткова муры ўсходняга нефа і сакрыстыя. Да 1516 г. пры падтрымцы Радзівілаў на плане разабранай часткі быў змураваны новы трохнефавы зальны корпус[2]. Аздабленчыя работы ў сярэдзіне касцёла доўжыліся да 1520 г., у тым самым годзе адбылася кансекрацыя святыні[3].

Пра існаванне ў віленскім бернардынскім касцёле насценных размалёвак доўга не было вядома, бо познеготычная паліхромія знаходзілася пад шматлікімі напластаваннямі пазнейшых часоў. Упершыню фрагменты сярэднявечнага жывапісу пачалі праступаць скрозь напластаванні на схіле XIX ст. Адна з фрэсак была выяўлена ў кляштарным калідоры каля 1930 г. падчас работ па прыстасаванню бернардынскіх муроў пад патрэбы факультэта мастацтва Універсітэта Стэфана Баторыя[4]. У 1970-х гг. у сярэдзіне касцёла літоўскія рэстаўратары

---

[1] Карыстаючыся нагодай, выказваю шчырую падзяку кіраўніку рэстаўрацыі віленскіх бернардынскіх муроў сп-ру Пятрасу Канявічусу, бязмежная эрудыцыя якога ў справе бернардынскай гісторыі натхніла аўтара напісаць гэты тэкст.
[2] Algė Jankevičienė. Architektura gotycka zespołów bernardyńskich Wilna i Kowna. // Stuka około 1500. Warszawa,1997. S.111.
[3] Klasztory bernardyńskie w Polsce w jej granicach historycznych. Kalwaria Zebzydowska, 1985. S. 434.
[4] M. Morelowski. Odkrycia wileńskie.// Alma Mater Vilnensis. №10, 1932.

раскрылі першыя фрагменты паліхроміі паўночнай сцяны, але асноўныя кансервацыйныя працы пачаліся пазней і доўжыліся да сярэдзіны 1990-х гг. Цяпер гэтыя надзвычай цікавыя фрэскі адкрытыя для агляду. Рэстаўрацыя паліхроміі кляштарнага калідора працягваецца.

Першыя згадкі пра малярскія працы з’яўляюцца ў кроніцы бернардынскага закона пасля 1579 г. у сувязі з тагачасным аднаўленнем разбуранай пажарамі святыні[5]. Але ў сучаснай літоўскай гістарыяграфіі фрэскі датуюцца 1564 г. і нават 20-мі гг. XVI ст.[6] Пры гэтым звесткі кронікі неабгрунтавана звязваюцца не з насценнымі размалёўкамі, а з нейкімі іншымі аздабленчымі работамі[7]. Прынятае літоўскімі калегамі датаванне мае гіпатэтычны характар і не пацверджана дакументальна, таму яго належыць удакладніць. На нашу думку, у кроніцы акурат адлюстраваны факт стварэння фрэсак паўночнай сцяны. Паспрабуем абгрунтаваць сваю думку. Па-першае, пасля пажараў 1560 і 1564 гг. бернардынская святыня доўга бытавала ў руінах і не магла быць аздоблена насценным жывапісам. Адбудова касцёла пачалася толькі ў 1577 г. Разбураныя скляпенні бакавых нефаў былі адноўлены ў 1579 г. Да 1580 г. адбудова была збольшага завершана і толькі пасля гэтага ў сярэдзіне касцёла маглі пачацца аздабленчыя работы. Па-другое, тое, што фрэскі не маглі быць створаны раней 1580-га году, пацвярджае выява самога віленскага бернардынскага касцёла, размешчаная на адной з раскрытых фрэсак паўночнай сцяны. На фрэсцы касцёл выяўлены ўжо з мураваным бабінцам, які быў прыбудаваны да галоўнага фасада святыні толькі каля 1581 г.[8] Адсюль вынікае, што ў бернардынскай кроніцы аднатаваны

[5] Klasztory bernardyńskie w Polsce w jej granicach historycznych. Kalwaria Zebzydowska, 1985. S. 434-435.

[6] Lietuvos architektűros istorija. T. I. Vilnius, 1987. S. 142., Rūta Janonienė. Nowe odkrycia malarstwa ściennego w wileńskim kościele Św. Św. Franciszka i Bernardyna.// Sztuka około 1500. Warszawa,1997. S. 123.

[7] Rūta Janonienė. Nowe odkrycia malarstwa ściennego w wileńskim kościele Św. Św. Franciszka i Bernardyna.// Stuka około 1500. Warszawa, 1997. S. 123.

[8] Дзякую сп-ру Пятрасу Канявічусу, які звярнуў маю ўвагу на гэты факт.

малярскія працы па аздабленню менавіта паўночнай сцяны і фрэскі належыць датаваць 80-мі гг. XVI ст.

Аўтар віленскіх фрэсак невядомы. У кроніцы адзначаецца, што паліхромія выканана паводле тагачасных італьянскіх узораў. На нашу думку, запіс у кроніцы сведчыць не пра італьянскае паходжанне майстра, а пра скіраванасць малярскай працы на лепшыя ўзоры тагачаснага каталіцкага мастацтва. Бо стылістычныя асаблівасці фрэсак дазваляюць выказаць гіпотэзу аб паходжанні майстра з абшараў імперыі Габсбургаў. Мажліва, вытокі віленскіх размалёвак належыць шукаць у паўднёва-нямецкіх або багемскіх мастацкіх асяродках, дзе ў другой палове XVI ст. адбывалася асвойванне італьянскай манеры пісьма нямецкімі майстрамі.

Адна з фрэсак прысвечана змаганню Св. Георгія з цмокам, выяўленаму на фоне сцен пакутніцкай смерці айцоўбернардынаў у Полацку ў 1563 г. Незвычайнае аб'яднанне міфалагічнага і гістарычнага сюжэтаў патрабуе вытлумачэння ў кантэксце сярэднявечнай іканаграфіі з улікам рэальных падзей полацкай гісторыі часоў Інфлянцкай вайны. У 1498 г. адначасова з наданнем Полацку магдэбургскага права вялікі князь Аляксандр запрасіў у горад, населены пераважна праваслаўнымі мяшчанамі, каталіцкіх місіянераў. Наладзіць першую каталіцкую місію ў адным з найбуйнейшых гарадоў Вялікага княства Літоўскага Аляксандр даручыў айцамбернардынам, якія на схіле XV ст. паспяхова праводзілі місіянерскую і пастырскую дзейнасць сярод насельніцтва сталічнай Вільні. У Полацак бернардыны прыйшлі ў 1498 г. Вялікі князь фундаваў кляштар і касцёл «ad honorem Dei Salvatoris nostri sueque Virginis et Matris Gloriosissime Marie ac ad veneracionem SS. Francisci et Bernardini (у гонар Бога, Збавіцеля нашага, і яго Маці, Найслаўнейшай Дзевы Марыі, і ў імя Святых Францішка і Бернардына)»[9]. Драўляныя будынкі

[9] Kodeks dyplomatyczny katedry i dieocezji Wileńskiej / Wyd. J. Fijałek i Wł. Semkowicz. T. 1: 1387-1507. Kraków, 1948. Nr 460. S. 538. Паводле іншых звестак полацкі касцёл быў прысвечаны Божай Маці Нябеснай Брамы.

бернардынаў неўзабаве паўсталі на Запалоцці, або, як тады казалі, – «въ месте Полоцком на посаде за Полотою». Фундатар багата аздобіў касцёл і забяспечыў кляштар належным утрыманнем[10]. У 1504 г. вялікі князь выдаў віленскім бернардынам прывілей, у якім адзначалася, што ў Полацку жыве народ «хоць нам і верны, але ў веры схізматык» і выказвалася жаданне, каб палачане былі «свядома і з неабходнымі павучаннямі вернуты да адзінства веры і Рымскай Царквы». Вялікі князь падкрэсліваў, што манахам дазваляецца пасяліцца ў горадзе не толькі са згоды віленскіх каталіцкіх уладаў, але «асабліва са згоды на тое ўсіх русінаў, нашых падданых, шляхты і простых людзей Полацкай вобласці»[11].

Полацкая місія дала плён – неўзабаве ў горадзе паўстала значная каталіцкая суполка. Поспеху спрыялі і казанні айцоў-бернардынаў, і першая полацкая школка, створаная пры касцёле для дзяцей мяшчанаў, самым знакамітым вучнем якой быў будучы першадрукар Францішак Скарына[12]. Для поспеху місіі вельмі важным было тое, што бернардыны не перахрышчвалі праваслаўных, ахвотных далучыцца да лацінскай Царквы[13]. Пасутнасці, гаворка ішла пра прыняцце вуніі, на што дастаткова было адно вуснай згоды. Супраць такой практыкі выступалі віленскія каталіцкія ўлады і кракаўскія акадэмічныя тэолагі, але бернардыны, якія былі лепей абазнаныя ў мясцовай рэлігійнай сітуацыі, дамагліся падтрымкі сваёй пазіцыі ад Апостальскай сталіцы. У 1501 г. папа выдаў дэкрэт, з якога вынікае, што «некаторыя русіны Вялікага княства Літоўскага... жадалі б адмовіцца ад сваіх грэцкіх памылковых поглядаў і прыняць каталіцтва, але не хочуць нанова хрысціцца, папа на

[10] Klasztory bernardyńskie w Polsce w jej granicach historycznych. Kalwaria Zebzydowska, 1985. S. 264.
[11] Kodeks dyplomatyczny katedry i dieocezji Wileńskiej./ Wyd. J. Fijałek i Wł. Semkowicz. T. 1: 1387-1507. Kraków, 1948. Nr 460. S. 538 (пераклад з лаціны Васіля Вароніна).
[12] Скарына названы ў імя Св. Францішка Асізкага – заснавальніка францішканскага закону, рэфармаванае адгалінаванне якога, г. зв. браты меншыя, на абшарах ВКЛ адвеку называліся бернардынамі.
[13] Klasztory bernardyńskie w Polsce w jej granicach historycznych. Kalwaria Zebzydowska, 1985. S. 264-265.

падставе Фларэнтыйскага сабора абвяшчае: не перахрышчваць нікога з хрышчаных па грэцкаму абраду... і не забараняць ім прытрымліватца сваёй царкоўнай абраднасці». Асаблівасцю полацкай каталіцкай суполкі было тое, што бернардыны не змянілі звыклую для палачанаў ўсходнюю царкоўную абраднасць, захавалі літургічную кніжнасць і царкоўна-славянскую мову набажэнстваў[14].

Місіянерская дзейнасць бернардынаў выклікала азлабленне ўладароў суседняй дзяржавы. Вялікі князь маскоўскі Іван III Васільевіч заявіў, што Аляксандр «ныне учинил еще новое насилие Руси, какого прежде при его отце и предках не бывало: сколько повелел он поставить божниц римского закона в русских городах – Полоцке и других!»[15]. Поспехі віленскіх місіянераў былі выкарыстаны сярод іншых аргументаў, якія апраўдвалі тэрытарыяльныя прэтэнзіі Маскоўскай дзяржавы на ўсходнеславянскія землі Вялікага княства Літоўскага. На схіле XV ст. пачынаюцца амаль няспынныя напады маскоўскіх войскаў на Полаччыну. Самы трагічны эпізод гэтай перманентнай збройнай агрэсіі адбыўся падчас Інфлянцкай вайны (1558-82).

Напярэдадні вайны Полацак быў адным з самых багатых гарадоў Вялікага княства Літоўскага. Станіслаў Пахаловіч, які ў 1579 г. браў удзел у вызваленні Полацка, пісаў, што «да часу захопа горада масквіцінамі ён па багацці пераўзыходзіў самую Вільню». У лютым 1563 г. горад аблажылі войскі Івана Жахлівага. Полацкі ваявода Станіслаў Давойна, зрабіўшы шэраг тактычных памылак і сваечасова не атрымаўшы знешняй дапамогі, праз два тыдні абароны мусіў здаць горад захопнікам. Пераможцы ўчынілі нечуваны дагэтуль гвалт над мірнымі жыхарамі, абсалютная большасць з якіх былі праваслаўнымі. Але самыя страшныя выпрабаванні чакалі полацкіх іўдзеяў і каталікоў, якім было наканавана зазнаць адносіны маскоўскага

---

[14] Юры Лабынцаў. Першая каталіцкая місія ў Полацку.// Культура. № 21 ад 17 жніввеня 1992 г.

[15] Макарий, архиеп. История русской церкви . Т. IX. Кн. IV. История западно-русской или литовской митрополии. Спб., 1879. С. 98-99.

цара да іншаверцаў. Расейская «Степенная книга» так апісвае гэтыя падзеі: «...великий князь... шед взять... град Полтеск, и тамо живущих богоубийственных жидов конечной пагубе предаде, и богомерских же латин... расплени и расточи». Уся яўрэйская абшчына была патоплена ў Дзьвіне, аб чым Пскоўскі летапіс паведаміў: «...а которыя были в городе жили люди жидове, и князь великий велел их и с семьями в воду в речную вметати, и утопили их». Памяць аб гібелі полацкіх іўдзеяў яшчэ на пачатку XX ст. жыла ў тутэйшым яўрэйскім фальклоры[16].

Трагічны лёс горада падзялілі і полацкія айцы-бернардыны. Іх драўляны касцёл, верагодна, быў спалены падчас рабункаў, якія пачаліся пасля захопу горада. Некалькіх манахаў забілі маскоўскія татары, якія бралі ўдзел у паходзе на Полацак на чале з казанскімі царамі Аляксандрам і Сімяонам, царэвічам Ібакам, Тахтамышам, Бекбулатам і Кайбулой. У «Праўдзівым апісанні, як быў заваяваны і забраны Маскавітам вялікі купецкі горад Полацк, што ў Літве», выдадзеным Мікалаем Кнорам у Нюрнбергу у 1563 г., паведамляецца, што маскоўскі цар «загадаў абезгаловіць некаторых заспетых там манахаў, а іўдзеяў усіх утапіць»[17]. Удзельнік Інфлянцкай вайны Мацей Стрыйкоўскі ў сваёй «Хроніцы польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсяе Русі» паведамляе, што ў Полацку менавіта «татары манахаў Бернардынаў пасеклі»[18]. Ад шабляў царскіх татараў загінулі гвардыян Павел, айцы Адам, Дамінік, Марцін і Вацлаў. Паводле некаторых звестак частка манахаў здолела ўратавацца ўцёкамі. Бернардыны і каталікі Вялікага княства Літоўскага ўважалі манахаў, якія загінулі ад маскоўскіх шабляў, за мучанікаў. Так у Полацку з’явіліся першыя мясцовыя каталіцкія пакутнікі, пачаткова нават шырыўся іх культ, які пазней заняпаў[19].

---

[16] И. Берлин. Сказание об Иоанне Грозном и о разгроме еврейской общины в Полоцке. // Еврейская старина, 1915 г.
[17] Г. Сагановіч. Захоп Полацка Іванам IV паводле нямецкіх «лятучых ліcткоў» 1563 г. // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі. Полацк, 1998. С. 265-267.
[18] Zbior dzieiopisow polskich. Tom 2. Warszawa, 1766. S.759.
[19] Klasztory bernardyńskie w Polsce w jej granicach historycznych. Kalwaria Zebzydowska, 1985. S.265.

Фрэска віленскага бернардынскага касцёла з'яўляецца мастацкім сведчаннем нараджэння культа полацкіх пакутнікаў. Нажаль, некаторыя фрагменты фрэскі незваротна страчаны. Яе ніжняя частка знішчана падчас прыбудовы познебарокавага хора. Страты фарбавага слою пакуль што не дазваляюць прачытаць тэкст, які знаходзіцца ў верхняй частцы размалёўкі, але яе кампазіцыйная схема аднаўляецца досыць пэўна. Кампазіцыя фрэскі складаецца з двух планаў – легендарнага і гістарычнага, якія сюжэтна звязаны ў нетрадыцыйны для сярэднявечнай іканаграфіі спосаб. На першым плане размешчана сцэна змагання Св. Георгія з цмокам за вызваленне князёўны. На другім – выявы мучаніцкай смерці полацкіх айцоў-бернардынаў. Злучанасць міфалагічнага сюжэта і рэальных гістарычных падзей узвышае гібель манахаў да ўзроўню подзвіга, уводзіць забітых у кола хрысціянскіх пакутнікаў.

Паводле легенды аб Св. Георгіі блізка паганскага горада, размешчанага недзе на Блізкім Усходзе, у балоце пасяліўся людажэрны цмок, якому гараджане мусілі выдаваць на згубу юнакоў і дзяўчын. Калі надышла чарга дачкі ўладара горада, заплаканую ў чаканні пагібелі князёўну сустрэў Георгі. Распытаўшы дзяўчыну, рыцар застаўся чакаць цмока. Пасля малітвы Георгія знясілены і ўтаймаваны цмок сам прыпаў да ног святога і князёўна адвяла яго ў горад на повадзе. Здзіўленыя гараджане пагадзіліся выслухаць казань Георгія і прыняць хрост, пасля чаго Георгі забіў цмока мечам і вярнуў дачку ўладару горада[20].

Арыстакратычнае паходжанне Св. Георгія з часоў крыжовых паходаў зрабіла яго аб'ектам шанавання сярод еўрапейскага рыцарства. Адгэтуль у заходне-еўрапейскім мастацтве пашыраецца культ святога-ваяра. Прыкладна з XV ст. набываюць папулярнасць кампазіцыі на тэму Змаганне Св. Георгія з цмокам за вызваленне князёўны, якія звычайна размяшчаюцца ў разлеглым краявідзе або на фоне замкавых муроў (алтар Крывеллі з 1490 г., скульптура Бэрнта Нотке

[20] Мифы народов мира. Том 1. Москва, 1991. С.273-375. Hannelore Sachs, Ernst Badstübner, Helga Neumann. Christlicher Ikonografie in Stichworten. Berlin, Leipzig: Koehler&Amelang, 1991. S. 147-148.

ў Мікольскім касцёле ў Стакгольме з 1489 г., размалёўка Рафаэля з 1504 г., графіка Дзюрэра з 1505 г., у рэгіянальным мастацтве – цокаль алебастравай фігуркі з 1400-1420 гг. з касцёла дамініканаў у Львове, фрэска з 1436-1455 гг. у калідоры францысканскага кляштара ў Кракаве, размалёўка капліцы Св. Тройцы ў катэдры на Вавелю і г.д.). Віленская фрэска палягае ў рэчышчы менавіта гэтай іканаграфічнай традыцыі. Св. Георгі выяўлены з аголеным мечам у рыцарскім даспеху на белым кані. Яго шлем аздоблены выявай адоленага цмока. Святы выступае тут не толькі як волат-асілак і прапаведнік сапраўднай веры, але і як шляхетны рыцар – заступнік цнатлівых ахвяр. Сімволіка хрысціянскай ахвярнасці падкрэслена – плачучая дзяўчына выяўлена побач з ягнём[21]. Варта нагадаць, што фрэска стваралася неўзабаве пасля вызвалення Полацка войскамі Стэфана Баторыя (1579 г.), і што на пачатку 1580-х гг. кароль-пераможца разам з Мікалаем Крыстапам Радзівілам і віленскімі мяшчанамі фундаваў аздабленчыя работы ў віленскім бернардынскім касцёле. Не выключана, што выява Св. Георгія Пераможцы ўспрымалася сучаснікамі праз вобраз самога Стэфана Баторыя. Можа стацца, што сюжэт размалёўкі напрасткі звязаны і з каралеўскай перамогай, і з каралеўскай фундацыяй.

Калі пярэдні план фрэскі выяўлены ў межах традыцыйнай іканаграфіі, дык перанос легендарных падзеяў з-пад сцен паганскага горада пад сцены праваслаўнага Полацка з’яўляецца незвычайным. Наўрад ці такое знітаванне легендарнага і гістарычнага сюжэтаў ёсць свядомай маніфестацыяй афіцыйнай пазіцыі віленскіх каталіцкіх уладаў, паводле якой праваслаўныя не ўважаліся за хрышчаных, а значыць прыраўноўваліся да паганцаў. Бернардыны не прымалі такі пункт гледжання і не маглі яго адлюстраваць на сценах свайго касцёла. Хутчэй перанос легендарных падзей пад сцены По-

[21] Выява «агнца» таксама можа быць водгуллем народнага шанавання Св. Георгія, бо ў славянскіх народаў свята Юр’я адзначалася 23 красавіка як веснавая мяжа быдлаводчага календара. На Юр’ю першага разу пасля зімы выводзілі жывёлу на пашу, калолі першае веснавое ягняці, спявалі юраўскія песні.

лацка – намёк на місійнае заданне полацкіх бернардынаў, а іканаграфія подзвіга Св. Георгія з'яўляецца ключом да разумення містычнага сэнсу іх пакутніцкай смерці.

На заднім плане фрэскі адлюстраваны сцэны расправы над полацкімі манахамі ў 1563 г. З гарадскіх сцен за трагічнымі падзеямі назіраюць жыхары горада, сярод якіх легендарныя кароль з каралевай – бацькі ахвяраванай цмоку дзяўчыны. Злева ўверсе татарын цягне з гарадской брамы бернардына, прывязанага за ногі да каня. Наверсе справа той самы татарын адсякае манаху галаву. Гэтыя сцэны відавочна перагукаюцца з біяграфіяй Св. Георгія ў трактоўцы артадаксальнай агіяграфічнай літаратуры – падчас ганенняў на хрысціян ў часы рымскага імператара Дыяклетыяна (284-305) Св. Георгія катавалі, каб змусіць адмовіцца ад веры і, урэшце, таксама адсеклі галаву. Менавіта гэты біяграфічны факт паставіў Св. Георгія ў шэраг хрысціянскіх пакутнікаў з ваярскага стану (Дзмітры Салунскі, Фёдар Страцілат, Маўрыкі, Фёдар Цірон і інш.), якія пазней сталі ўважацца за нябесных заступнікаў «хрысталюбнага ваярства» і ідэальных ваяроў. Подзвіг Св. Георгія быў здзейснены не ў часе бітвы, але пад мечам ката – яшчэ адна паралель з сюжэтнай лініяй віленскай фрэскі, дзякуючы якой гібель полацкіх манахаў ад татарскіх шабляў узвышаецца да ўзроўня хрысціянскага подзвіга.

Сцэны расправы над манахамі выяўлены на фоне трох архітэктурных відарысаў, паміж якіх размешчаны манаграмы Ісуса Хрыста. Гэтыя відарысы вартыя асаблівай увагі. Паколькі гістарычныя падзеі другога плана адбываюцца ў Полацку, лагічна меркаваць, што архітэктурныя фоны могуць адлюстроўваць тагачасны выгляд горада. Пры гэтым належыць памятаць, што сярэднявечная іканаграфія мае выразна сімвалічны характар і таму простага падабенства паміж рэальным і выяўленым горадам можа не быць. Галоўны сюжэт фрэскі мае легендарны грунт і задача аўтара палягала зусім не ў рэалістычнай перадачы дэталяў другога плана. Тым не менш, на суседняй фрэсцы, па якую мы звярталіся спрабуючы прадатаваць паліхромію, віленскі касцёл Св.Св. Францішка і Бернардына выяўлены досыць дакладна і гэта абавязвае нас праверыць верагоднасць полацкіх архітэктурных фонаў як

інфармацыйных крыніц. Тым больш, што яны храналагічна належаць да самых ранніх выяў Полацка. Абапіраючыся на іканаграфію часоў Інфлянцкай вайны і на гістарычныя звесткі, паспрабуем параўнаць архітэктурныя выявы на фрэсцы з рэальным аблічам тагачаснага горада.

Левая выява сюжэтна звязана з сцэнаю выцягнення бернардына татарынам з гарадской брамы, таму яе лагічна атаясаміць з Запалоццем – полацкім пасадам, на якім знаходзіўся бернардынскі кляштар. Сапраўды, выява мае характэрныя прыкметы гарадскога пасада, абнесенага абарончымі сценамі з вежамі і брамамі, за якімі жылая забудова і хрысціянскія святыні. Але ўсе вядомыя сёння гістарычныя крыніцы даводзяць, што забудова рэальнага Запалоцця выглядала іначай. Выява больш нагадвае Вільню – гарадскі абарончы мур з вежамі (злева направа – Бернардынская, Спасаўская брама, ад якой пачынаўся старадаўні полацкі гасцінец, безназоўная вежа і брама Субач), сілуэты праваслаўнага мітрапалітаўскага Прачысценскага сабора і бернардынскага комплексу. Нават калі на фрэсцы выяўлена не Вільня, усё адно паўстае пытанне – чаму для адлюстравання полацкага пасада выкарыстаны вобраз іншага месца? Адказаць на гэта пытанне не цяжка. На час стварэння фрэскі Запалоцця папросту не існавала – пасад быў спалены маскоўскім гарнізонам у 1579 г. падчас аблогі горада войскамі Стэфана Баторыя. Таму для адлюстравання неіснуючага полацкага пасада аўтар мусіў выкарыстаць вобраз іншага места – або рэальнага, да прыкладу – віленскага, або ўяўнага[22].

А вось відарыс, размешчаны ў цэнтры фрэскі над галавой каня Св. Георгія, азначаецца зусім іншай ступенню падабенства з рэальным Полацкам. Нягледзячы на ўмоўнасць і сімвалічнасць, ён бясспрэчна павінен быць атаясамлены з полацкім Вышнім замкам. Выява архікафедральнага Сафійскага сабора не пакідае ў гэтым ані каліва сумневу. Супастаўленне відарыса з іншымі выявамі тагачаснага Полацка і аналіз сучаснай тапаграфіі дазваляе сцвердзіць, што

[22] Для адлюстравання вобразаў гарадоў у мастацтве XVI стагоддзя часта выкарыстоўваліся архетыпавыя гарадскія выявы, запазычаныя з тагачасных заходнееўрапейскіх гравюраў.

ў адрозненні ад умоўна выяўленага Запалоцця, Вышні замак адлюстраваны акурат такім, якім ён выглядаў з берага Дзвіны пры пад'ездзе да горада з боку Вільні. Толькі з віленскай дарогі можна было бачыць Вышні замак у такім ракурсе: злева – замкавая брама, што «у вежы Устейской» (праз яе ішоў спалены ў 1579 г. шырокі мост у Запалоцце), над ёй – Другая і Асвейская вежы, справа – двух'ярусная Сафійская вежа, панад якой – пяцікупальны Сафійскі сабор. Належыць зазначыць, што на фрэсцы адлюстраваны выгляд даваеннага Полацка, бо на выяве Вышняга замка паміж Усцейскай і Сафійскай вежамі адсутнічае вежа, зрубленая маскоўцамі адразу пасля акупацыі горада ў 1563 г.[23] Апроч таго, падчас вызвалення Полацка ў 1579 г. Сафійскі сабор быў рабураны і яшчэ доўга стаяў у руінах. Гэтыя факты прымушаюць выказаць меркаванне аб тым, што аўтар фрэскі на свае вочы паваенны Полацак не бачыў і, верагодна, карыстаўся апісаннямі тых, хто быў у горадзе да Інфлянцкай вайны. Тут варта нагадаць, што па вайне бернардыны не вярнуліся ў Полацак. Пасля вызвалення горада Стэфан Баторы даручыў місіянерскую дзейнасць езуітам – маладому закону, які заснаваў тут калегіум[24].

У выяве Вышняга замка здзіўляе цыбулістае завяршэнне Сафійскага сабора, неадпаведнае нашым сённяшнім уяўленням аб яго сілуэце. Нельга адмаўляць, што такое завяршэнне можа быць сімвалічным і палягаць ў рэчышчы заходне-еўрапейскай традыцыі графічнага выяўлення ўсходне-хрысціянскіх святынь, да прыкладу – Іерусалімскага храма. Але можа стацца, што віленскі відарыс адлюстроўвае невядомы сёння факт перабудовы Сафіі падчас 16-гадовай акупацыі горада. Мажлівае прывядзенне сілуэта пашкоджанай падчас аблогі 1563 г. святыні ў адпаведнасць з тагачасным маскоўскім архітэктурным густам было б лагічным у кантэксце ідэалагічнай канцэпцыі Івана

[23] С.В. Тарасаў. Полацк XI-XVII стст. Гісторыя і тапаграфія. Мінск, 1998. С.42.

[24] Існыя сёння ў полацкім Задзвінні познебарокавыя будынкі другога бернардынскага кляштара паўсталі праз 133 гады пасля гібелі першай каталіцкай місіі.

Жахлівага, паводле якой захоп Полацка разглядаўся як вяртанне «вотчыны» маскоўскага цара[25].

Пакуль што цяжка атаясаміць трэцюю архітэктурную выяву, на фоне якой выяўлена сцэна адсячэння татарынам галавы манаха. Гэта можа быць вобраз абарончых збудаванняў Запалоцця і/або страчанага бернардынскага касцёла з вежай-званіцай. Большасць бернардынскіх касцёлаў, збудаваных у XV-XVI стст. у Польшчы, Літве і Беларусі, размяшчаліся ў прадмесцях і звычайна ўключаліся ў сістэму гарадскіх фартыфікацый. Таму першыя бернардынскія касцёлы будаваліся, як правіла, з улікам абарончых патрэб. Да прыкладу, у віленскім касцёле дасюль захаваліся фрагменты байніц. Невядомае збудаванне на фрэсцы таксама мае выразны ўзровень верхняга бою. На нашу думку, выяву гіпатэтычна можна атаясаміць з бернардынскім касцёлам на Запалоцці, які быў улучаны ў пасадскія аборончыя збудаванні.

Такім чынам, сюжэт даследаванай фрэскі прысвечаны Змаганню Св. Георгія з цмокам за вызваленне князёўны, выяўленаму на фоне катаванняў полацкіх айцоў-бернардынаў маскоўскімі татарамі ў 1563 г. Створаная ў 1580-х гг. размалёўка з’яўляецца храналагічна першым з вядомых сёння мастацкіх увасабленняў культа першых полацкіх каталіцкіх пакутнікаў. Зважаючы на тое, што паліхромія паўночнай сцяны віленскага бернардынскага касцёла паўстала неўзабаве пасля вызвалення Полацка ў 1579 г., а таксама беручы да ўвагі ўдзел караля ў фінансаванні аздабленчых работ, фрэску належыць трактаваць у кантэксце перамогі Стэфана Баторыя ў Полацкай вайне. З гэтай прычыны, выяўленыя на другім плане сцэны катаванняў неабходна лакалізаваць у Полацку, а не ў месцах размяшчэння іншых каталіцкіх місій (Боснія, Святая Зямля і г.д.), дзе

---

[25] Пасля вяртання з полацкага паходу Іван Жахлівы загадаў перабудаваць Благавешчанскі сабор у маскоўскім крамлі. У 1563-1564 гг. на чатырох вуглах былі зроблены аднаглавыя прыдзелы, а сам сабор перароблены на «пятиглавие» (на кшталт полацкай Сафіі?). Некаторыя даследчыкі звязваюць гэту перабудову з жаданнем цара ўвекапомніць буйную ваенную перамогу – узяцце Полацка.

бернардынскія манахі таксама гінулі ад мусульманскіх шабляў. Адпаведна, фрэскавыя архітэктурныя фоны належыць разглядаць праз вобразы менавіта полацкай архітэктуры. Аднак, памятаючы пра ўмоўную і сімвалічную прыроду познегатычнага жывапісу, не варта шукаць у выявах дакладнай перадачы дэталяў тагачаснай архітэктуры, бо перад аўтарам віленскай фрэскі стаялі іншыя мастацкія задачы.

Аналіз падабенства выяўленага і рэальнага Полацка дазваляе выказаць гіпотэзу аб тым, што аўтар віленскай фрэскі не бачыў паваенны горад і адлюстраваў яго мастацкі вобраз, абапіраючыся на свае ўяўленні і нечыя даваенныя ўспаміны. Для лакалізацыі падзей 1563 г. у сілуэце Вышняга замка аўтар адлюстраваў самае сімвалічнае гарадское збудаванне – пяцiверхі архікафедральны Сафійскі сабор, які ў XVI ст. з'яўляўся агульнапрызнаным сакральным сімвалам Полацка. Цікава, што падобны прыём сімвалізацыі дэталі выкарыстаны на фрэсцы для адлюстравання вобраза маскоўскага татарына. Ваяр намаляваны не ў татарскай, а ў еўрапейскай вопратцы з прамым мечам, а не з шабляй. А для пазначэння татарскага паходжання ваярскі строй завершаны дэталлю-сімвалам – усходнім цюрбанам. Выкарыстанне цюрбана ў якасці знака этнічнай прыналежнасці даводзіць - аўтар віленскай фрэскі на свае вочы не бачыў маскоўскіх татараў, якія не насілі цюрбанаў, але быў добра абазнаны ў традыцыйнай вопратцы туркаў-асманаў. Гэта ўскосна пацвярджае гіпотэзу аб паходжанні мастака з абшараў імперыі Габсбургаў – галоўнага еўрапейскага праціўніка тагачаснай Асманскай імперыі.



**Мал. 1.** Вільня. Касцёл Св.Св. Францішка і Бернардына. Выгляд галоўнага фасада.



**Мал. 2.** Вільня. Касцёл Св.Св. Францішка і Бернардына. Фрэска «Змаганне Св. Георгія з цмокам за вызваленне князёўны» (1580-я гг.).



**Мал. 3.** Вільня. Касцёл Св.Св. Францішка і Бернардына. Фрэска «Змаганне Св. Георгія з цмокам за вызваленне князёўны», фрагмент з выявай полацкага Запалоцця.



**Мал. 4.** Вільня. Касцёл Св.Св. Францішка і Бернардына. Фрэска «Змаганне Св. Георгія з цмокам за вызваленне князёўны», фрагмент з выявай полацкага Вышняга замка.



**Мал. 5.** Вільня. Касцёл Св.Св. Францішка і Бернардына. Фрэска «Змаганне Св. Георгія з цмокам за вызваленне князёўны», фрагмент з выявай полацкага бернардынскага касцёла (?).

# Змест

**Ад складальніка** ........................................................... 3

**Дамаскіна В.Ф.** Народнае адзенне ў звычаях і абрадах беларусаў (сямейная абрадавасць) ........................................ 6

**Козел О.В.** Развитие фтизиатрической помощи на Полотчине в 1920-е годы ........................................ 15

**Краско В.Д.** Станаўленне і развіццё адкрытай свецкай жаночай адукацыі ў Полацку (ад пансіёнаў да гімназіі) ........................................ 20

**Лобач У.А.** Лён і вырабы з лёну ў знахарскіх практыках беларусаў Падзвіння ........................................ 31

**Орлова Т.А.** Изменение планировочной структуры г. Полоцка с к. XVIII по XX вв. ........................................ 39

**Поляков С.И.** олочане – участники Берлинской операции ........................................ 47

**Смирнова Т.Р.** Особенности восприятия экспозиции Детского музея детьми (дошкольного и младшего школьного возраста и учащимися с психофизическими особенностями развития) ........................................ 55

**Соловьёв А.А.** Археологическое исследование дома № 15 по ул. Толстого в г. Полоцке при проведении ремонтных работ ........................................ 62

**Сяргеенка Н.А.** Установы культуры ў Полацку на пачатку 20-х гадоў XX стагоддзя ........................................ 77

**Філатава Н.В.** Асаблівасці развіцця жаночага касцюма на Паазер'і ў канцы XIX – пачатку XX ст. (канструктыўна-тэхналагічныя асаблівасці жаночага адзення Расонска-Верхнядзвінскага крою) ........................................ 92

**Явіч Т.У.** Канцэпцыя экспазіцыі, прысвечынай гісторыі Полацкага езуіцкага калегіума ........................................ 96

**Агляд калекцый, каталогі прадметаў з фондаў НПГКМЗ**

**Воднева І.П.** Газеты ў фондах НПГКМЗ ............................**101**

**Зуева Г.П.** Каталог польскамоўных часопісаў «Вэндровец», «Край» і «Земя» ў фондах НПГКМЗ ..............................**113**

**Шумовіч А.У.** Кірылічныя выданні друкарняў старавераў к. XVIII – пач. XIX стст. у фондах НПГКМЗ.................**130**

**Дадаткі**

**Гліннік В.В.** Невядомая познегатычная выява полацкай трагедыі 1563 г. ...............................................................**143**

**Змест** .........................................................................**161**

**Матэрыялы**
**навукова-практычнай канферэнцыі**
(па выніках навукова-даследчай работы ў 2004 г.)

Падпісана да друку 01.12.2005 г.
Фармат 60x84 1/16. Папера афсетная. Гарнітура Times.
Тырыж 50.

Надрукавана на выдавецкім комплексе НПГКМЗ.